ISSN 0234—1387

крыніца

7 ЛІПЕНЬ 1990

перад сабою і я.

— Ці супрацоўнічаеце Вы з тэатрам?

— Не даводзілася. Тлумачыцца гэта досыць проста: для такога супрацоўніцтва неабходна валодаць больш канструктыўным мысленнем, у мяне ж дамінуе — колеравае.

— Ці звязаны Вы з групаю 20-ці маскоўскіх мастакоў?

— Не звязаны ні з кім з іх. На Малой Грузінскай выстаўляюцца мастакі, схільныя да літаратуршчыны. Гельман, Праваторав — я не знаходжу сярод іх аднадумцаў. Кожнае мастацтва павінна карыстацца перш за ўсё ўласнымі перавагамі.

— «У жывапісе павінен быць жывапіс»?

— Не зусім так. Гэтае сцвярджэнне трохі кансерватыўнае. Проста ідэю ўвасабляюць сродкамі дадзенага мастацтва.

— Хто з маладых паэтаў найбольш блізкі Вам?

— Я даўно з вялікай цікавасцю сачу за творчасцю канцэптуалістаў. Сярод іх мне найбольш блізкі Л. Рубінштэйн, я адчуваю ў ягоных вершах метафізічны пачатак. Адчуваю таксама піетэт да метафарыстаў: Паршчыкава, Жданава, Яроменкі. Жывапіс увесь складаецца з метафар (натуральна, калі ён не натуралістычнага характару). Але яго складана перакласці на мову паэзіі... Ну, скажам, хоць бы фармальна: дрэва ў натуры ператвараецца ў незразумелы аб'ём. Паэт Іван Жданаў назваў гэта «адсутнасцю дрэва».

Жэня дэманструе мне работы кактэбельскага перыяду. На карціне «Трывожная прастора» з серыі «Знакі зямлі» дрэвы пранікаюць у нябёсы. На палатне «Уварванне» невялікі гай ператварыўся ў складаную канструкцыю, якая разбурае форму неба.

— Я малюю раму на самім палатне,— кажа Жэня.— Гэта таксама частка прасторы. Калі ранняя канцэпцыя карціны — «акно ў свет», дык у мяне — «прадаўжэнне свету». Частка карціны вядзе за сабою цэлае. І толькі зрэдку ў рабоце прысутнічае валявы момант заканчэння.

На многіх палотнах Яўгена Дыбскага мы бачым своеасаблівы «выхад за раму»: дэталь пейзажу ці сюррэалістычны элемент, які мае зазвычай падсвядомыя вытокі, вырываецца за межы, акрэсленыя прамавугольным перыметрам. Відавочна, сам сюжэт работ такі просты, што не вытрымлівае плоскасці. Гэта датычыць серыі «Трывожная прастора», пасля напісання якой «выхад за раму» стаў задужа распаўсюджаным прыёмам. Часам ён выяўляецца ў форме асобных прадметаў, часцей — у выглядзе невытлумачальных, містычных адчуванняў, але амаль заўсёды — у выглядзе ўчынкаў самога мастака.

Дыялог наш закончыўся трохі незвычайна. Праз некалькі дзён пасля нашай сустрэчы я патэлефанаваў яму і спытаўся:

— Жэня, хочаце паслухаць вершы пра сябе? — і, нібыта імпульсіўна адчуўшы згоду на другім канцы проваду, прачытаў наступнае:

В леопардовых родимых пятнах
Яблоки пылятся на столе...
Виртуоз, из плоскостей превратных
Решку прозревающий в орле,
В чернолесье — стоны городские,
В заводи — мистический оскал,—
Этот человек на тонком кие
Многократно шар земной вращал;
Длинной кистью в биллиард играя,
Цветовые блики рассыпал
В лузы восхищения и лая,
Заполнявших выставочный зал;
Лицевую сторону с изнанкой
Росчерком единым совместив,
Из пустот, навязанных молчанкой,
Выводил обильности мотив,—
И хибару, где его шаманство
Сыростью и мраком обросло,
Насыщало вещное пространство —
Кривизною воссоздав крыло.

Міхаіл РАСОЛЬКА,
радыёжурналіст,
народны дэпутат
Мінскага гарсавета

ДЭПУТАЦКІЯ ГУЛЬНІ «ВЯСНА-90»

ЗАЦІКАЎЛЕНЫЯ НАТАТКІ АПАЗІЦЫЯНЕРА

І была вясна... Пачалася яна ў гэтым годзе першым этапам выбарчай кампаніі — вылучэннем кандыдатаў у народныя дэпутаты ўсіх узроўняў, лістовачнай паводкай кандыдацкіх абяцанняў і нясціплых «дацзыбао» груп падтрымкі прэтэндэнтаў на мандат...

Не хацелася б абцяжарваць чытача ўспамінамі ўсіх перыпетый перадвыбарчай барацьбы, якая ўжо засталася ў мінуўшчыне, але і ў гісторыі дзейнічае закон, падобны фізічнаму закону захавання масы, і «ўсё наступнае пачынаецца з папярэдняга».

Расказ мой — пра першыя крокі дэпутацкай апазіцыі, станаўленне якой амаль не асвятлялася ў рэспубліканскай прэсе.

Апазіцыя... Слова гэтае ўжо можна прамаўляць уголас, але багата каму яно рэжа яшчэ вуха! Здаецца, з-пад аўтарытарнасці мы пачынаем выкарасквацца. А каб працэс гэты абязболіць трохі для тых, хто ўсё ніяк не можа «паступіцца прынцыпамі», адшукалі пераходнае вызначэнне апазіцыі, з якой можна мець справу і самым зацятым «прынцыпіялам» — канструктыўная. Гэта накшталт плюралізму, абавязкова сацыялістычнага...

Днём нараджэння дэпутацкай апазіцыі можна лічыць 24 сакавіка, калі ў канферэнц-зале мінскага Палаца мастацтваў адбылося другое пасяджэнне Беларускага дэмакратычнага форуму, які аб'яднаў у перадвыбарчай барацьбе Беларускі народны фронт, Беларускі экалагічны саюз, Таварыства беларускай мовы і Саюз кааператараў.

Пасля двух тураў рады Беларускага дэмакратычнага форуму трохі парадзелі, затое прысутнічалі на ім ужо выбраннікі народа.

З магнітафоннага запісу.

Народны дэпутат БССР А. Трусаў: «Сёння мы павінны паставіць пытанне аб стварэнні дэмакратычных фракцый у нашым парламенце і Мінскім гарсавеце. Мэта гэтых фракцый — стварэнне канструктыўнай апазіцыі... Мы павінны прыйсці на першую сесію з канкрэтнымі прапановамі, якія перададуць нам нашыя выбаршчыкі і якія мы самі вызначым у якасці першачарговых».

Народны дэпутат БССР В. Грыбанаў: «Таварышы! Я папрасіў слова, каб падтрымаць думку аб неабходнасці мець у будучым парламенце парламенцкую фракцыю, інакш кажучы, людзей, настроеных на глыбокія палітычныя і эканамічныя пераўтварэнні ў рэспубліцы. Мы гэта зрабіць павінны да першай сесіі, улічваючы сумны вопыт работы Вярхоўнага Савета і з'ездаў народных дэпутатаў СССР.

Якія мае канкрэтныя прапановы? Я лічу, што сітуацыя цяпер такая, што ёсць аб'ектыўная магчымасць Беларусі стаць тым, кім яна намінальна ў Канстытуцыях БССР і СССР з'яўляецца — дзяржаваю. Суверэннай дзяржаваю. Што я маю на ўвазе? Мы павінны дэкларацыю на першай сесіі Вярхоўнага Савета стварэнне свабоднай парламенцкай рэспублікі. Палітычную і эканамічную незалежнасць БССР. Калі нехта сумняваецца ці бачыць двайны сэнс у слове незалежнасць, то паводле тлумачальнага слоўніка — гэта самастойнасць.

Што я маю на ўвазе пад палітычнай незалежнасцю? Гэта стварэнне шматпартыйнай сістэмы на тэрыторыі Беларусі. Таварышы! Шматпартыйная сістэма патрэбна не нам, патрэбна не палітычным лідэрам — яна патрэбная народу. Шматпартыйная сістэма — гэта якраз і ёсць сувязь народа з уладаю. Мы цяпер маем непрафесійную ўладу. Мы цяпер маем прафесійных токараў, ваенных, добрых людзей па прафесіі. У парламенце павінны быць прафесійныя палітыкі. Іх не будзе выпускаць ніводны інстытут, ніводны універсітэт — іх будзе рабіць жыццё ва ўмовах шматпартыйнай сістэмы.

Я лічу, што наш цяперашні Вярхоўны Савет будзе кансерватыўны ў большасці. Ён не прыме кардынальных рашэнняў. Таму мы павінны кансалідавацца і сабраць вакол сябе людзей, якія мысляць палітычна і эканамічна дэмакратычна, сучасна. Мы гэта можам зрабіць...»

Былі, аднак, ва ўдзельнікаў Беларускага дэмакратычнага форуму і іншыя пункты погляду. Напрыклад, у Станіслава Станіслававіча Шушкевіча, народнага дэпутата СССР і БССР.

З магнітафоннага запісу: «Мне здаецца, што мы пачынаем ісці не ў той бок. У кожнага дэпутата ёсць свая праграма, і наўрад ці галасаваў выбаршчык за дрэннага кандыдата ў дэпутаты. Значыцца, былі абраныя тыя партыйныя і іншыя кіраўнікі, якія выставілі добрую праграму. І таму мы павінны пачынаць не са стварэння фракцый, не з барацьбы з кімсьці, а з таго, што мы павінны шукаць агульную платформу: якія пытанні мы можам вырашаць разам з тымі, хто будзе большасцю. Калі мы хочам адразу быць меншасцю, то ніякіх пытанняў не вырашым. Гэта нам добра вядома ўжо па з'ездзе народных дэпутатаў СССР.

Я паўтараю: калі мы адразу пойдзем па шляху такога аддзялення, то мы нічога, апрача мітынгаў, лозунгаў, гучных прапаноў і папулістыкі такой таннай,— нічога не зробім. Мы павінны перацягнуць на свой бок тых, на каго не спадзяёмся. Менавіта тых 120 чалавек, якіх лічаць апаратчыкамі, і з якімі вы сёння не хочаце мець справу. Мы павінны выявіць ініцыятыву. Я за такі падыход...»

Хоць пункты погляду на ідэю

стварэння перадпарламенцкай апазіцыі і раздзяліліся, у рэзалюцыю Беларускага дэмакратычнага форуму (а сярод удзельнікаў былі 23 народныя дэпутаты БССР і 21 народны дэпутат сталічнага гарсавета) быў уключаны пункт аб стварэнні «Дэмакратычнай плыні» ў рэспубліканскім парламенце і Мінскім гарадскім Савеце народных дэпутатаў.

Фракцыя праклямавана.

Але ці патрэбная яна камунебудзь яшчэ, апрача саміх фракцыянераў?

Мы правялі прамую тэлефонную лінію (вось ужо сапраўды «гарачы» быў тэлефон) пасля паведамлення аб стварэнні «Дэмакратычнай плыні».

З «прамой лініі».

— Вы прасілі пазваніць з нагоды апазіцыі... Я пенсіянерка, Ціхіна Рыма Іосіфаўна. Я хачу сказаць, што апазіцыя, вядома, у парламенце патрэбная. Абавязкова... Прачытаўшы спіс нашых дэпутатаў Вярхоўнага Савета, я збянтэжылася: там жа большая частка сакратароў райкомаў, абкомаў, старшыні калгасаў. Таму, калі не будзе апазіцыі, справы на Беларусі не паправяцца. Наш парламент павінен працаваць на пастаяннай аснове, і я сабе задаю пытанне: як жа сакратары і старшыні калгасаў будуць працаваць у Вярхоўным Савеце рэспублікі?..

— Можа, у іх ёсць пераемнікі ў наменклатурнай абойме?

— Можа, не ведаю... Але хіба яны ўсе кінуць свае пасады і будуць пастаянна працаваць у парламенце?

— Напэўна, будуць «як правіла».

— Вось я таму і лічу, што наш парламент, які быў, такі і застанецца, калі гэта будзе «як правіла». Такая мая думка...

— Добра, дзякуй вам за яе.

Яшчэ тэлефонны званок.

— Скажыце, а вось гэтая ваша апазіцыя... Вас меншасць будзе ў Саветах?

— Пакуль, адчуваю, меншасць...

— Дык што вы можаце вырашыць, калі вас меншасць? Нічога... Трэба быць рэалістамі. Я лічу, што і для вас будзе лепей, і для ўсіх астатніх, калі не будзе гэтай апазіцыі. У Маскве гэтая рэгіянальная група нічога не можа вырашыць. Так і вы...

— Так, але можна прывесці вам два прыклады?.. Міжрэгіянальная група першая загаварыла аб адмене 6-га артыкула — і што здарылася?

Упершыню яны пачалі размову аб прэзідэнцтве ў СССР — што цяпер у нас?..

— Было б лепш, калі б яны нічога пра гэта не гаварылі... (кароткія гудкі).

— Добры дзень!

— Дзень добры...

— Вас Сціпчанка Наталля Пятроўна турбуе. Вы ведаеце, я думаю, што апазіцыя, хочам мы гэтага ці не, усё роўна складзецца...

— Быў бы гэта адзін чалавек ці было б іх 30...

— Так, яна існуе ў любым грамадстве. Нават у нашым застойна-запойным яна была. Яна была тайная, яна была скрытая. Няхай цяпер яна будзе яўная, адкрытая, свабодная. Апазіцыя — гэта форма існавання любога дэмакратычнага грамадства. Я не ведаю, што яшчэ можна сказаць з гэтай нагоды...

Каля трыццаці тэлефонных размоў за гадзіну «прамой лініі» не могуць, вядома, прэтэндаваць на ролю сацыялагічных даследаванняў. Але тое, што прыхільнікаў стварэння дэпутацкай апазіцыі была большасць, паверце мне... на слова. (А што, уласна, вам застаецца рабіць, калі апытанні грамадскай думкі і ўсялякія там рэйтынгі у нас не ў пашане?)

Арганізацыйныя пасяджэнні дэпутацкіх груповак, створаных Беларускім дэмакратычным форумам, адбыліся ў Вярхоўным Савеце БССР і Мінскім гарсавеце. Як дэпутат апошняга, спынюся на першых крокach «Дэмакратычнай плыні» ў сталічным Савеце. Пасля рашэння аргпытання (ох ужо гэтыя апаратныя фармуліроўкі!) быў аднадушна прыняты Зварот — ён караценькі і я прывяду яго цалкам: «Мы, што ніжэй падпісаліся, дэпутаты Мінскага гарадскога Савета, заяўляем аб стварэнні дэпутацкай групы — «Дэмакратычная плынь» на платформе Усебеларускага Дэмакратычнага Блоку, мэта якой — усталяванне рэальнай улады Савета, забеспячэнне дэмакратычных пераўтварэнняў ва ўсіх сферах жыцця горада і прыярытэту інтарэсаў грамадзян над ведамаснымі.

Заклікаем усіх народных дэпутатаў Мінскага гарадскога Савета далучыцца сваёй дзейнасцю да «Дэмакратычнай плыні»!

Зварот гэты падпісалі 22 прадстаўнікі сталічнай улады. Аднак выявілася, што ўлада гэтая пакуль што эфемерная. Бо нават апублікаваць Зварот у гарадской газеце «Вячэрні Мінск» не атрымалася: не было візы старшыні гарвыканкома ці першага сакратара гаркома партыі.

Не мела падтрымкі і яшчэ адна наша ініцыятыва. Даведаўшыся з прэсы, што дэмакратычна настроеныя дэпутаты Ленсавета не сталі чакаць, пакуль выканком падрыхтуе і правядзе першую сесію народных дэпутатаў Ленінграда новага склікання, а стварылі свой аргкамітэт і паскорылі пачатак работы сесіі. «Дэмакратычная плынь» вырашыла накіраваць па вопыт свайго прадстаўніка. Аднак, каб камандзіраваць на першую сесію Ленсавета мінскага народнага дэпутата, у Мінгарвыканкома не знайшлося 60 рублёў. Такія расходы, маўляў, не прадугледжаны.

У Ленінград, калыску рэвалюцыю, на сесію Ленсавета новага, перабудовачнага склікання я ўсё-такі паехаў. Праўда, па камандзіроўцы Дзяржтэлерадыё БССР.

«Каб не прапасці ў адзіноце...»

ТАВАРЫСТВА «КАНКОРДА» ШУКАЕ СЯБРОЎ

Адкрыта загаварылі пра жахлівае становішча інвалідаў у нашай краіне. Мізэрная пенсія, дрэннае медыцынскае абслугоўванне, нялёгкія жыллёвыя ўмовы, адзінота — усё гэта робіць жыццё інвалідаў, і без таго абдзеленых лёсам, удвая і ўтрая цяжэйшым. Будзем спадзявацца, што хоць частку гэтых праблем вырашыць нядаўна створанае Таварыства інвалідаў.

Матэрыяльны бок жыцця вельмі важны, але не менш важны і духоўны бок. Чым заняцца хвораму чалавеку, вязню чатырох сцен, якой карыснай справе прысвяціць свой вольны час, як знайсці сяброў? Усё гэта дае інвалідам дый здаровым людзям нашае завочнае таварыства, якое называецца «Канкорда» («Згода»).

Самая актуальная задача сучаснасці — аб'яднаць чалавецтва, каб разам рашаць глабальныя праблемы. Але ці можна аб'яднацца, не разумеючы адно аднаго? Патрэбна агульная мова, якая была б другою для кожнага чалавека і якая магла б стаць сродкам зносін людзей розных краін і нацыянальнасцей. Такая мова створана больш як сто гадоў таму назад, гэта — эсперанта.

Вартасці гэтай мовы шырока вядомыя: лёгкасць вывучэння, прыгажосць гучання, лагічнае словаўтварэнне. Алфавіт лацінскі, лексіка грунтуецца пераважна на еўрапейскіх мовах. На эсперанта ўжо створаны вялікі фонд перакладной і арыгінальнай літаратуры, выдаюцца сотні часопісаў і газет. Практычна ва ўсіх краінах актыўна дзейнічаюць асацыяцыі эсперантыстаў (у тым ліку і ў СССР), а агульная колькасць адэптаў міжнароднай мовы перавышае, відаць, некалькі мільёнаў.

Узнікае пытанне: чаму ж за сто гадоў эсперанта недастаткова распаўсюдзілася? На жаль, усе вялікія ідэі ўваходзяць у жыццё чалавецтва не адразу, а на працягу стагоддзяў. Але ўжо тое, што эсперанта перажыло перыяды самых жорсткіх рэпрэсій, сведчыць аб жыццяздольнасці гэтай мовы.

Распаўсюджванню эсперанта часам замінае думка, нібыта гэтай моваю імкнуцца замяніць усе жывыя нацыянальныя мовы. Такіх вар'яцкіх мэтаў эсперантысты ніколі не ставілі. Эсперанта — не толькі не праціўнік, але і неабходны саюзнік нацыянальных моў, асабліва невялікіх, бо яно можа спрыяць іхняму захаванню і абароне ад экспансіі так званых «сусветных» моў — англійскай, рускай і іншых.

Любы чалавек, нават не вельмі адукаваны, можа вывучыць міжнародную мову за лічаныя тыдні. Ён набудзе шмат цікавых сяброў-аднадумцаў. Ён можа чытаць кнігі, выпісваць часопісы на эсперанта з розных краін свету, слухаць радыёперадачы, весці міжнародную перапіску. Ён можа ўдзельнічаць у злётах эсперантыстаў, заняцца творчасцю і выявіць свае здольнасці з дапамогаю міжнароднай мовы. Эсперанта — незаменны памочнік для калекцыянераў, радыёаматараў, шахматыстаў-завочнікаў і для многіх людзей з іншымі захапленнямі.

Зразумела, што ўдзел у эсперанта-руху можа радыкальна палепшыць жыццё любога інваліда. І гэта сваёй дзейнасцю даказвае нашае Усесаюзнае таварыства інвалідаў-эсперантыстаў «Канкорда». За пяць гадоў існавання Таварыства (спачатку яно было невялікім гуртком, потым клубам і толькі нядаўна набыло афіцыйны статус) міжнародную мову вывучылі і сталі актыўнымі эсперантыстамі сотні чалавек, якія цяпер не мысляць свайго жыцця без эсперанта. І яны не толькі запоўнілі свой вольны час сустрэчамі, цікавымі справамі, але і адначасова спрыяюць распаўсюджванню эсперанта, інакш кажучы, усталяванню новых адносін паміж людзьмі.

Нашае таварыства наладзіла выданне інфармацыйных лісткоў, цікавых усім, хто жадае бліжэй пазнаёміцца з эсперанта. У гэтых лістках публікуюцца ўрокі мовы, анкеты новых канкордаўцаў, нататкі на актуальныя тэмы, вершы, гумар і г. д. Запрашаем і просім усіх, хто зацікавіўся, стаць падпісчыкамі нашай газеты. Для гэтага трэба зусім няшмат — напісаць на адрас: 229910, Латв. ССР, г. Вентспілс, вул. Я. Рудзутака, 27, 11, «Канкорда». У нашым Таварыстве дзейнічаюць і завочныя курсы эсперанта, звяртацца на адрас: 229910, г. Вентспілс, вул. Страдыня, 19, 25, Прысяжніку І. І. Просьба дакладаць канверты з Вашым адрасам.

Мы просім дапамогі ў прадпрыемстваў, устаноў, культурных таварыстваў, кааператываў і асобных грамадзян. Спадзяёмся, што знойдуцца «мецэнаты», якія пералічаць пэўную суму на адрас: 229910, г. Вентспілс, Жылсацбанк, філіял па МФА 76137, разліковы рахунак № 700744. Таварыства «Канкорда». Выданне газеты абыходзіцца дорага, таму неабходная падтрымка.

Вось адрасы некаторых мясцовых секцый «Канкорда»:

Маскоўская вобл.— Мікалай Церахаў (141120, Фразіна, прасп. Дэсантнікаў, 3—150).

Паўночны захад РСФСР — Улад. Раманаў (185003, Петразаводск, вул. Кузьміна, 39—3).

Беларусь — Зінаіда Грышчанка (220138, Мінск, Сцяпянка-1, вул. Усходняя, 4).

Украіна — Валерый Бяркоў (324071, Крывы Рог, вул. Дзідро, 49).

Казахстан і Сярэдняя Азія — Валянціна Тропман (485620, Каз. ССР, Джамбульская вобл., Курдайскі р-н, Ргайты, вул. Набярэжная, 14).

Горкаўская вобл.— Яўг. Калмакоў (603139, Горкі, вул. Герояў Космасу, 34—19).

Прыморскі край — Алена Ігнаценка (890075, Уладзівасток, Амурская, 10—6).

Эстонія — Рэйн Крууса (202040, Ківі-ылі, Выса, 18).

Латвія — Аніта Элфертэ (229910, Вентспілс, вул. Страдыня, 19—25).

Поўнач і цэнтр УССР — С. Заіка (310142, Харкаў, а/с 1908).

Краснадарскі край — П. Г. Дземачак (350020, Краснадар, вул. Гаражная, 30).

Азербайджан — Е. Б. Хатунцава (370006, Баку, прасп. Нарыманава, 4а/3, кв. 38).

Варонежская вобл.— В. Лытасаў (394008, Варонеж, Кастрамская, 26а, кв. 8).

Цюменская вобл.— Аксана Кузаваткіна (626440, Ніжневартаўск, вул. Дружбы Народаў, 22/2, кв. 87).

Іркуцкая вобл.— Л. Цестава (665492, Цельма, вул. Гагарына, 9).

Бурацыя — О. Барбаеў (670046, Улан-Удэ, вул. Жэрдзева, 40—6).

Кіраўніком мясцовай секцыі можа стаць кожны, хто распаўсюджвае матэрыялы Таварыства, дапамагае іншым у вучобе — адным словам, актыўна працуе. Чакаем лістоў!

Мікалай ГРЫШЫН,
старшыня «Канкорда»,
інвалід I групы

ВАСІЛЬ НЕСЦЯРЭНКА,
член-карэспандэнт АН БССР

ХРОНІКА ЧАРНОБЫЛЬСКІХ ПАДЗЕЙ

Восенню 1989 года ў Доме палітасветы г. Мінска старшыня камісіі Савета Міністраў БССР па ліквідацыі вынікаў аварыі Чарнобыльскай АЭС У. Г. Еўтух упершыню публічна абвінаваціў беларускіх вучоных у замоўчванні маштабаў радыяцыйнай катастрофы. Ён растлумачыў, чаму так позна з'явілася Дзяржаўная праграма па ліквідацыі вынікаў Чарнобыльскай аварыі: маўляў, да красавіка 1989 года беларускія вучоныя нічога не прапаноўвалі, і ўрад не мог без аб'ектыўнай навуковай інфармацыі рабіць высновы, прымаць меры, размяркоўваць сродкі.

Да абвінавачанняў нам не прывыкаць. У студзені 1990 года пасля тэлепраграмы «Ліра», у якой удзельнічалі член-карэспандэнт АН БССР І. М. Нікітчанка, прафесар Я. П. Петраеў і я, першы сакратар Гомельскага абкома КПБ А. А. Грахоўскі звярнуўся з лістом да першага сакратара ЦК КПБ Я. Я. Сакалова і назваў нас віноўнікамі забастоўкі жыхароў Нароўлі, запатрабаваў звярнуцца ў Вышэйшую атэстацыйную камісію і Акадэмію навук, каб пазбавіць нас усіх вучоных ступеняў і званняў.

У сакавіку 1990 года на III з'ездзе народных дэпутатаў СССР М. І. Дземянцей заявіў: «... вось ужо чатыры гады паміж вучонымі ідуць дэбаты па канцэпцыі небяспечнага пражывання насельніцтва ў раёнах, якія падвергліся радыеактыўнаму забруджванню. У такой сітуацыі выяўляецца, што няма каму выказаць неабходныя прэтэнзіі за бясплённыя дыскусіі і непрыняцце радыкальных дзеянняў, накіраваных на захаванне здароўя людзей, якія трапілі ў бяду». Няўжо і праўда няма каму? Няўжо толькі афіцыйнай ацэнкаю аб «бясплённасці» навуковых дыскусій можна растлумачыць, што Дзяржаўная праграма ліквідацыі вынікаў Чарнобыльскай аварыі, прынятая ў нас у 1989 годзе, засноўваецца на сумна вядомай 35-бэрнай канцэпцыі пражывання — канцэпцыі, аформленай у цішыні маскоўскіх кабінетаў галоўным санітарным урачом А. І. Кондрусевым 22 лістапада 1988 года (за № 129—6/715—6)?

А ці ж былі спробы абгрунтаваць Дзяржаўную праграму на больш надзейнай платформе? Да ацэнкі радыяцыйнай сітуацыі на Беларусі пасля Чарнобыльскай аварыі супрацоўнікі Інстытута ядзернай энергетыкі АН БССР прыступілі ўранку 28 красавіка 1986 года, як толькі служба радыяцыйнай бяспекі Інстытута зафіксавала рэзкае павелічэнне магутнасці дозы да 2500—2800 мкР/гадзіну. У канцы мая была створана ізатопная карта па цэзіі-137 Гомельскай вобласці, а ў канцы чэрвеня — Магілёўскай вобласці. І адразу ж была накіравана інфармацыя кіраўніцтву рэспублікі з прапановамі па мерах аховы здароўя людзей у забруджаных раёнах. (У мінулым нумары «Крыніцы» былі апублікаваны дакументы лета 1986 года.)

Вось яшчэ факты.

Лістом № 863 ад 20.06.86 г. у Міністэрства аховы здароўя БССР была накіравана схема актыўнасці грунту па цэзіі-137 некаторых раёнаў Магілёўскай і Гомельскай вобласці. Пры гэтым звернута ўвага, што «зона з узроўнямі радыяцыі па цэзіі-137 7 і больш Кі/км^2 паўднёвых раёнаў Гомельскай вобласці не супадае з зонаю адсялення насельніцтва, асабліва ў паўночнай і паўночна-усходняй яе частцы...». Як вядома, па выніках гэтых вымярэнняў 5—6 чэрвеня 1986 г. у Гомельскай вобласці было праведзена дадатковае адсяленне жыхароў некалькіх дзесяткаў вёсак.

Па нашых ацэнках па цэзіі-137, а пазней і па стронцыі-90 і плутоніі-239 насельніцтва раённага цэнтра Брагіна, зыходзячы з перавышэння дапушчальных аварыйных узроўняў [7 (15); 3; 0,1 Кі/км^2], таксама падлягала высяленню, аднак нашы прапановы не былі прынятыя. У гэтым горадзе, што не ўкладваецца ў прафесійныя паняцці ніводнага з нас, спецыялістаў па радыяцыйнай бяспецы, пачаліся работы па дэзактывацыі ў прысутнасці жыхароў, у тым ліку і дзяцей. А было ж, наколькі нам вядома, рашэнне Урадавай камісіі СССР аб адсяленні г. Брагіна, але па просьбе кіраўніцтва рэспублікі эвакуацыю адклалі і пачаліся шматлікія дэзактывацыі.

У сярэдзіне мая 1986 г. мы даведаліся пра забруджанне Магілёўшчыны. Лістамі № 886 ад 21.06.86 г. у Прэзідыум АН БССР і № 918 ад 23.06.86 г. старшыні Магілёўскага аблвыканкома былі таксама накіраваны ізатопныя карты Магілёўскай і Гомельскай абласцей і табліцы (16 стар.) з вынікамі спектраметрычных вымярэнняў. У час Пагоушскай канферэнцыі ў Грузіі ўлетку 1988 года старшыня Дзяржкамгідрамета СССР Ю. А. Ізраэль паведаміў, што нічога не ведаў аб радыяцыйнай забруджанасці Магілёўскай вобласці. Няўжо такая далёкая Магілёўшчына ад Масквы? Ці супрацоўнікі Дзяржкамгідрамета не палічылі патрэбным азнаёміць Ю. А. Ізраэля з лістом № 900 ад 21.06.86 г. з ІЯЭ АН БССР з ізатопнай картаю і табліцамі?

На падставе нашых дадзеных рэспубліканская камісія па ліквідацыі вынікаў аварыі на ЧАЭС пад кіраўніцтвам У. Г. Еўтуха ў пратаколе № 17/7 ад 15.06.86 г. адзначыла: «...Тым часам у Магілёўскай вобласці выяўлены чатыры сельскія населеныя пункты (Чудзяны і Малінаўка Чэрыкаўскага раёна, Гацкавічы і Новая Ельня Краснапольскага раёна), дзе наяўнасць цэзія-137 у грунце па **сярэдняй пробе** перавышае 100 Кі/км^2, а ў дзевяці населеных пунктах (Гарадок, Гатавец, Заводак, Дуброўка Краснапольскага, Асавец, Нова-Малінаўка, Каменка Чэрыкаўскага, Аляксандраўка Клімавіцкага і пас. Ленінскі Касцюковіцкага раёнаў) **асобныя** пробы перавышаюць гэты ўзровень. Апрача таго, у зону звыш 15 Кі/км^2 увайшлі раённыя цэнтры Чачэрск і Карма Гомельскай вобласці, якія раней лічыліся малазабруджанымі».

У канцы чэрвеня 1986 г. без правядзення неабходнай радыяцыйнай разведкі на Гомельшчыне было тэрмінова пачата будаўніцтва 53 новых пасёлкаў для жыхароў з зоны адсялення. Панавала ўстаноўка: працоўныя рэсурсы са свайго раёна і вобласці не выпускаць. Ужо калі былі закончаны падмуркі дамоў, ІЯЭ АН БССР, Міністэрства аховы здароўя, Белгідрамет правялі абследаванне пляцовак будаўніцтва новага жылля.

Лістом № 1099 ад 14.07.86 г. у Савет Міністраў Пятрову А. А. была накіравана даведка аб радыяцыйнай сітуацыі. У ёй указана, што абследаваны 53 населеныя пункты запланаванага будаўніцтва жылля. У 20 пунктах не было рэкамендавана будаўніцтва новых пасёлкаў, бо «...узровень актыўнасці па цэзіі-137 у шэрагу пунктаў перавышае часовую дапушчальную норму 15 Кі/км^2 (да 1986 г.— 7 Кі/км^2)».

У сярэдзіне ліпеня 1986 г. былі падрыхтаваныя другія рэдакцыі ізатопных карт па цэзіі-137 Магілёўскай і Гомельскай абласцей, і яны былі накіраваны лістом № 1101 ад 12.07.86 г. старшыні Дзяржкамгідрамета БССР Ізраэлю, № 1102 ад 15.07.86 г.— сакратару ЦК КПБ Г. Г. Барташэвічу і № 1103 ад 15.07.86 г.— у Савет Міністраў БССР М. В. Кавалёву.

У пратаколе нарады ў намесніка Старшыні Савета Міністраў БССР А. А. Пятрова ад 15.09.86 г. запісана ў п. 6: «Прыняць да ведама інфармацыю Штаба грамадзянскай абароны БССР, што на 1 верасня 1986 г. выяўлены ў Магілёўскай вобласці 52 населеныя пункты і Гомельскай — 47 з узроўнямі забруджвання па цэзіі-137 — 40 Кі/км^2 і вышэй. Беларускаму рэспубліканскаму ўпраўленню па гідраметэаралогіі і кантро-

лі прыроднага асяроддзя і Міністэрству аховы здароўя БССР правесці ўдакладненне ў адпаведнасці з інфармацыяй і ўнесці прапанову ў Савет Міністраў БССР».

Такім чынам, інфармацыю па Магілёўскай вобласці ў сярэдзіне лета і восенню 1986 г. мелі як кіраўніцтва вобласці, так і Ўрад рэспублікі. Мелі, мяркую, не толькі з Інстытута ядзернай энергетыкі АН БССР: працавалі вучоныя Дзяржкамгідрамета СССР, Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна, інстытутаў Дзяржаграпрома БССР, іншыя інстытуты АН БССР. Але меры для эвакуацыі людзей не былі прынятыя, людзі працягвалі жыць у забруджаных раёнах. І ўсе гэтыя гады ў «зоне» памнажаліся намаганні на правядзенне мерапрыемстваў, бессэнсоўнасць якіх была відавочная яшчэ ў першы паслячарнобыльскі год.

З групаю спецыялістаў АН БССР, Міністэрства аховы здароўя, Дзяржаграпрома, Белгідрамета мне прыйшлося абследаваць радыяцыйную сітуацыю ў в. Чудзяны, Малінаўка і пас. Майскі на пачатку снежня 1989 г. Які ж быў наш жах, калі мы выявілі, што ў школе, якую абследавалі ў верасні 1986 г., дзе каля будынка быў тады гама-фон 0,24—1,5 мР/гадз. і шчыльнасць патоку бета-часцінак 600—1300 часцінак/см^{2}хв., цяпер, у студзені 1989 г. у класах не толькі павышаны гама-фон (**>0,3 мР**/гадз.), але і маюцца забруджванні па бета-часцінках да 200 часцінак/см^{2}хв. (а нормы радыяцыйнай бяспекі такога не дапускаюць; для дарослых — не больш за 20 часц./см^{2}хв.).

У 1988 г. у Чэрыкаўскім раёне непадалёк ад вёсак Чудзяны і Малінаўка быў пабудаваны новы пасёлак Майскі на 285 кватэр у выглядзе адна-трохпавярховых дамоў з электракацельнай і гарачым водазабеспячэннем. У пасёлку шчыльнасць забруджвання па цэзіі-137 складае ў паўночнай частцы 0,5 Кі/км^2, у паўднёвай частцы — 8 Кі/км^2. Унутры кватэр радыяцыйны фон адпавядае санітарным нормам Мінздрава. Вакол пасёлка — сельгасугоддзі (1190 га) са шчыльнасцю забруджвання па цэзіі 5—15 Кі/км^2, аднак за 5—7 км ад пасёлка ёсць палі з высокай шчыльнасцю забруджвання, дзе немагчыма атрымаць чыстую сельгаспрадукцыю.

На пачатку 1987 г. члены навукова-тэхнічнага Савета па ліквідацыі вынікаў аварыі на ЧАЭС акадэмік АН БССР Дзмітрыеў А. С., члены-карэспандэнты АН БССР Канапля Я. Ф., Несцярэнка В. Б., Нікітчанка І. М. прадставілі новаму Прэзідэнту АН БССР акадэміку Платонаву У. П. дакладную запіску на імя новага першага сакратара ЦК КПБ Сакалова Я. Я. з прапановаю яшчэ раз разгледзець пытанне мэтазгоднасці пражывання людзей на землях, дзе шчыльнасць забруджвання па цэзіі-137 перавышае 30—40 Кі/км^2 і дзе немагчыма атрымаць «чыстую» прадукцыю раслінаводства і жывёлагадоўлі. На шматгадзіннай сустрэчы ў сакавіку 1987 г. новага Прэзідыума АН БССР з членамі Бюро ЦК КПБ Платонаў У. П. паведаміў, што ў бліжэйшы час у ЦК КПБ будзе прадстаўлена наша запіска, аднак, на жаль, да пачатку 1990 г. людзей не адсялялі. Гэтая марудлівасць невытлумачальная.

У канцы 1989 г. па просьбе кіраўніцтва Чэрыкаўскага раёна мы абследавалі радыяцыйную сітуацыю ў вёсках Вепрын і Бакуновічы. Вымярэнні паказалі, што там адсутнічаюць умовы небяспечнага пражывання насельніцтва, асабліва дзяцей. Урад прыняў нашую прапанову аб уключэнні жыхароў гэтых вёсак на адсяленне ў 1990 г., бо нават зыходзячы з антынавуковай і бесчалавечнай канцэпцыі 35 бэр, разліковая мяжа дозы за жыццё ў Вепрыне чакаецца большая за гэтую велічыню, а ў Бакуновічах больш за 57 бэр.

У пачатку лютага 1990 г. былі абследаваны вёскі Нараўлянскага раёна і Нароўля. Разам з цэзіем у шэрагу мясцін небяспеку для здароўя насельніцтва ўяўляюць стронцый і плутоній. У шасці вёсках (Хільчыха, Заракітнае, Смалегаўская Рудня, Лубень, Канатоп і Хямянкі) адсутнічаюць умовы бяспечнага пражывання насельніцтва па разліковай мяжы дозы за жыццё (>35 бэр, разлікі Інстытута біяфізікі Міністэрства аховы здароўя СССР), а ў вёсках Гута, Кірава і паўночнай частцы Нароўлі, дзе шчыльнасць забруджвання навакольных палёў і лясоў перавышае 40 Кі/км^2, патрабуецца высяленне жыхароў у 1990 г. у адпаведнасці з пастановаю Саўміна БССР ад 7.12.89 г. На жаль, па Нараўлянскім раёне рашэнні пакуль не прынятыя, але Міністэрствам аховы здароўя БССР праведзены аналіз разлікаў верагодных межаў дозы па астатніх раёнах і выяўлены больш як 60 небяспечных вёсак. Відавочна, што неабходна папраўляць Дзяржаўную праграму БССР па ліквідацыі вынікаў аварыі і павялічваць колькасць адсяленцаў у 1990—1991 гг. Па праграме ў бліжэйшыя два гады павінны быць адселены жыхары з земляў, дзе шчыльнасць забруджвання па ізатопу цэзія-137 вышэйшая за 40 Кі/км^2, затым — ад 40 да 15 Кі/км^2. Але адразу ж трэба рыхтаваць праграму адсялення жыхароў з земляў, дзе шчыльнасць забруджвання ніжэйшая за 15 Кі/км^2 і не меншая за 5—7 Кі/км^2. Гэта складае, верагодна, звыш за 120 тыс. чалавек.

Нават некампетэнтнаму чалавеку відаць: сродкі патрабуюцца велізарныя. Але задачу трэба вырашаць абавязкова, у інтарэсах бяспекі ўсіх жыхароў рэспублікі. Таму што па міжнародных нормах радыяцыйнай бяспекі пры доўгім уздзеянні апраменьвання і наяўнасці адкрытых радыеізатопаў (як гэта мае месца ў нас на Беларусі) за жыццё людзі не павінны атрымліваць дозу большую за 7 бэр. А большасць жыхароў у зоне звыш 40 Кі/км^2 гэтую норму ўжо перабралі за 4 гады (больш за 8 бэр). І дзяржава, як гэта прынята ў цывілізаваных краінах, павінна выплаціць ім кампенсацыю за нанесеную здароўю шкоду.

Зрэшты, перш за ўсё трэба звузіць маштабы гэтай шкоды, ліквідаваць пастаянную пагрозу нашаму здароўю ўвогуле.

У 12-ым нумары газеты «Аргументы и факты» за 1990 г. А. Паваляеў, вядучы супрацоўнік УНДІ радыялогіі сельскай гаспадаркі, запэўніў нас, што мясапрадукты мы атрымліваем чыстыя і яны пад надзейным кантролем. Чаго ў гэтых словах болей: палітыкі ці кашчуннасці? Бо ж часовыя дапушчальныя ўзроўні (ЧДУ-88) дапускаюць колькасць радыенуклідаў у 10—100 разоў большую за дааварыйныя ўзроўні. У кожнага жыхара нашай рэспублікі ад такіх прадуктаў маецца магчымасць атрымаць дозу апраменьвання 0,7—0,8 бэр/год, што за 70 гадоў бліжэйшага жыцця можа скласці больш за 35 бэр.

Цяпер галоўную небяспеку для жыхароў рэспублікі ўяўляюць радыенукліды, якія паступаюць у арганізм чалавека разам з прадуктамі харчавання, і трэба тэрмінова рэзка знізіць дапушчальныя ўзроўні ўжо ў 1990 г. да 10^{-9} Кі/л, кг, а ў бліжэйшыя 2—3 гады — да 10^{-10} Кі/л, кг.

Нормы радыяцыйнай бяспекі (НРБ-76/87) даюць пералік 34 хвароб, якія проціпаказаны чалавеку для працы з апраменьваннем (язвенная хвароба страўніка і дванаццаціперснай кішкі, перадракавыя захворванні, гіпертанія, катаракты і інш.). Па дадзеных галоўных санітарных урачоў Чэрыкаўскага і Нараўлянскага раёнаў, менавіта па гэтых хваробах за апошнія 3—4 гады ў 2—3 разы узрасла колькасць захворванняў і ў дзяцей, і ў дарослых.

У гэтых умовах кожная сям'я павінна атрымаць ад дзяржавы дазіметр-радыеметр для кантролю пры гатаванні і ўжыванні прадуктаў харчавання.

Насельніцтва павінна атрымаць нарэшце элементарныя веды аб радыяцыі.

Аварыя на Чарнобыльскай АЭС — гэта нацыянальная катастрофа і трагедыя Беларусі. Нам з гэтай бядою жыць прыйдзецца доўга, трэба аб'явіць паўднёвыя раёны Беларусі зонаю нацыянальнага бедства, прыняць тэрмінова Вярхоўным Саветам СССР Дзяржаўную праграму дапамогі ахвярам аварыі на ЧАЭС.

Упушчаны час множыць бяду.

СЛУЖБОВЫЯ АКЛАДЫ (тарыфныя стаўкі) НЕКАТОРЫХ КАТЭГОРЫЙ ПРАЦОЎНЫХ

	на 25.IX.1989	на 25.XII.1989
Акцёр (Рускі тэатр імя Горкага)	130—200	130—200
Бібліятэкар з вышэйшай адукацыяй (бібліятэка імя У. І. Леніна г. Мінска)	100—115	100—115
Бібліятэкар з сярэдняй адукацыяй (бібліятэка імя У. І. Леніна г. Мінска)	80	80
Бортправадніца (Мінскі авіятрад)	110—115	110—115
Вадзіцель машыны хуткай дапамогі I класа (аўтабаза Мінскага гарадскога аддзела аховы здароўя)	162	162
Вадзіцель трамвая I класа (трамвайнае дэпо г. Мінска)	185	185
Выхавацель дзіцячага сада з вышэйшай адукацыяй (дзіцячы сад № 2 г. Мінска)	130—150	130—150
Выхавацель дзіцячага сада з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй (дзіцячы сад № 2 г. Мінска)	110—130	110—130
Выхавацель папраўча-працоўнай калоніі, лейтэнант (МУС БССР)	200	200
Вядучы спецыяліст Савета Міністраў БССР (старшы рэферэнт)	250	405
Галоўны бухгалтар калгаса (к-с «Іскра» Чэрвеньскага раёна)	270	270
Галоўны бухгалтар гарвыканкома (Мінскі гарвыканком)	200	320
Дворнік (ЖЭС-62 г. Мінска)	142—164	142—164
Дырэктар лазні (лазня № 7 г. Мінска)	145	205
Дырэктар Музея народнай славы (г. Мядзель)	140	140
Дырэктар райхарчгандлю (Савецкі райхарчгандаль г. Мінска)	240	330
Загадчык інтэрната (інтэрнат № 1 Мінскага швейнага аб'яднання імя Крупскай)	110	110
Загадчык парткабінета парткома прадпрыемства (НВА «Інтэграл»)	190	260
Інспектар ДАІ, лейтэнант (МУС БССР)	210—220	210—220
Інспектар крымінальнага вышуку, лейтэнант (МУС БССР)	220—230	220—230
Інструктар аргаддзела гарвыканкома (Мінскі гарвыканком)	190—200	320—370
Інструктар Белсаўпрофа	210—230	270—310
Інструктар РК КПБ (Пухавіцкі РК КПБ)	200	305
Інструктар ЦК КПБ	270	380—415
Камандзір паветранага судна I класа (Мінскі авіятрад)	238	238
Карэспандэнт газеты «Звязда»	150—180	150—180
Мастак (кінатэатр «Дружба» г. Мінска)	90—100	90—100
Машыністка-тэхсакратар райкома КПБ (Кастрычніцкі РК КПБ г. Мінска)	120	170
Медсястра (4-я клінічная бальніца г. Мінска)	80—115	80—115
Міліцыянер патрульна-паставой службы, радавы (МУС БССР)	155—195	155—195
Міністр (меліярацыі і воднай гаспадаркі БССР)	430	650
Настаўнік малодшых класаў з вышэйшай адукацыяй (СШ № 2 г. Мінска)	130—170	130—170
Настаўнік малодшых класаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй (СШ № 2 г. Мінска)	110—145	110—145
Начальнік медвыцвярэзніка, ст. лейтэнант (МУС БССР)	190—200	190—200
Начальнік пасажырскага цягніка (Мінскі вагонны ўчастак)	190—230	190—230
Начальнік упраўлення міністэрства (Мінмеліяводгас БССР)	375	480—500
Пажарнік, радавы (МУС БССР)	135—170	135—170
Паштальён (паштовае аддзяленне № 4 г. Мінска)	110—130	110—130
Першы намеснік старшыні гарвыканкома (Мінскі гарвыканком)	340	600
Першы сакратар РК КПБ (Капыльскі РК КПБ)	340	550
Кухар 5-га разраду (сталовая № 27 г. Мінска)	135	135
Праваднік цягніка дальняга следавання (Беларуская чыгунка)	110—140	110—140
Прараб будтрэста (будтрэст № 7 г. Мінска)	180—215	180—215
Прэзідэнт Саюза кааператараў БССР	700	700
Рэдактар райгазеты (Вілейская райгазета «Шлях перамогі»)	230	230
Рэдактар аддзела фельетонаў часопіса «Вожык»	180	180
Сакратар-машыністка старшыні калгаса (к-с «Іскра» Чэрвеньскага раёна)	90	90
Сакратар-машыністка міністра (Мінмеліяводгас БССР)	145	200
Сакратар РК КПБ (Пухавіцкі РК КПБ)	270	440
Сакратар парткома прадпрыемства (НВА «Інтэграл»)	300	469
Свяшчэннік (праваслаўная царква в. Латыгаль Вілейскага раёна)	120	120
Следчы, лейтэнант (МУС БССР)	230—240	230—240
Слесар-зборшчык нестандартнага абсталявання 6-га разрада прадпрыемства (ВА «Мінскі гадзіннікавы завод»)	157	157
Старшыня БРК прафсаюза	290—320	420—480
Старшыня калгаса (к-с «Іскра» Чэрвеньскага раёна)	330	330
Старшыня народнага суда (народны суд Ленінскага раёна г. Мінска)	260	260
Старшыня Савета Міністраў БССР	700	950
Старшыня прафкома прадпрыемства (НВА «Інтэграл»)	290	440
Участковы інспектар, лейтэнант (МУС БССР)	200—210	200—210
Эканаміст міністэрства (Мінмеліяводгас БССР)	235	300—330
Эксперт-крыміналіст, лейтэнант (МУС БССР)	210—220	210—220
Хірург (4-я клінічная бальніца г. Мінска)	180	180
Хірург вышэйшай катэгорыі, які аперыруе (4-я клінічная бальніца г. Мінска)	250	250

Мікалай
СЕРДЗЮКОЎ

НАРМАЛЬНАЯ БОЯЗЬ ЦЕМРЫ

Апавяданне

I

Жонка плакала.

Даўно ахутала горад падсінена-шэрая цемень, паўсюдна як здратаваная, парваная плямамі электрычнага святла. Калі дзе ў доме насупраць успыхвала новая лямпачка, Рыгору яе імгненны праблісk здаваўся стрэлам у цемень. Праўда, далёкім, без гуку і водгулля.

Але вонкава Рыгор быў спакойны. Ён стаяў ля акна перад расчыненай форткай, нібыта заступаючы дарогу халаднаватаму веснавому ветрыку, што павяваў з двара. Ветрык халадзіў лоб і круглыя шчокі, варушыў рэдкія бялявыя валасы на галаве, скрозь якія прасвечвала гладкая ружовая скура — блізкая лысіна.

«Стралялі» вокны, бездапаможна падвывала жонка, а яшчэ раздражняла Рыгора музыка з тэлевізара, раздражняў шум, які даносіўся ў фортку.

Двор за вакном быў адметны ад многіх гарадскіх двароў. Між двума бетоннымі гмахамі ўтварыўся луг, улетку зялёны, з густымі купкамі вязаў. Цяпер ён быў падобны на пустку. Маладая трава яшчэ не прабілася, тырчэлі чорным голлем угару і ўбакі змрочна-пустыя кроны, кідалі на зямлю трывожныя хісткія цені.

Колькі часу таму гойсалі з галёканнем па двары дзеці, пад вязамі стаялі кампаніяй мужчыны, зладзеявата азіраліся па баках і смакталі з бутэлек віно. Потым маці пазаганялі дзяцей у кватэры, мужчыны, асмялеўшы і крыху пакрычаўшы пад канец, мірна разышліся. Цяпер на краі рудога, скамечанага, што тая прамакатка, луга, збіліся ў гурт патлатыя юнакі, ляпалі абы-што языкамі.

— Кінь ты,— буркнуў Рыгор жонцы,— ачмурэць можна. На заводзе цэлы дзень у вушах гудзе...

Жонка галасіла ад таго часу, калі па тэлевізары перадалі, што нашы салдаты пакінуць Афганістан. Рыгор спачатку адчуў раптоўную радасць, потым даўмеў-

ся, што на службу сына мірнае пагадненне ніяк не паўплывае.

— Нельга так, Марына! Ты сябе не шкадуеш.

Ён вышмаргнуў з разеткі вілку ад тэлевізара, пачаў хадзіць па пакоі. Яшчэ не стары мужчына, Рыгор быў невысокага росту, крыху таўставаты. Твар яго нагадваў ці не правільны круг, карыя лупаватыя вочы таксама выглядалі круглымі. За ўсё гэта на заводзе яго ўпотай дражнілі Калабком.

Больш не маючы слёз, жонка цяпер толькі бязгучна ўздрыгвала. Але не падымалася, ніцма ляжала на тахце.

— Марына! Толіку не паможаш, а сябе ў дамавіну пакладзеш! Каб жа памагчы... Ты хочаш, а я не хачу? Прыйдзе Толік, павер... Што пагадненне падпісана, то добра: менш баёў.

— Добра? — спытала сарваным голасам Марына.— Табе добра?

Тонкае, як у дзяўчыны, цела знерухомела, а праз хвіліну яна ўсхапілася, села на тахце. Залацістыя, мокрыя ад слёз валасы пасмамі прыліплі да сківіц, твар быў бледны — яго ад плачу як паменела.

— Табе ў кватэры ў пантоплях добра? Ты мне скажы, разумнік, чаму не падпісалі пагадненне раней? Ваякі!.. Вас бы туды... у вас палітыка? То хапайце аўтаматы і — трушком, паўзком... Рабіце сваю палітыку, чаму вам нельга?

Рыгор сцяўся, быццам адзін быў ва ўсім вінаваты, і, каб не глядзець у гняўлівыя шэрыя вочы, зноў падышоў да акна. З падслепаватых ліхтароў у двары сеялася жоўтае святло, патлатыя юнакі курылі, цыркалі скрозь зубы сліной. Добра, што сёння яны бавілі час без сябровак, хоць рогату ды віску не чулася. Адно крычалі: «Ён мне... А я яму... Адруб... Што можа бокс супраць каратэ...»

«Во, падгадаваліся і — у бойку,— падумаў Рыгор.— Самі. Толькі ж падгадаваліся не самі, мы іх усяму вучылі... Свайго жыцця, напэўна, кожнаму шкада, але каб іншых жыццяў...»

Два гады таму Толік, такі самы патлаты і распераза-ны, дурэў у двары са сваімі сябрамі. І ніхто з яго сяброў не трапіў у Афганістан, а ён — трапіў.

На заводзе пра Афганістан хто як гаварыў. Адны, што нельга людзей без дапамогі пакінуць, іншыя — што нашых хлопцаў нельга ў зямлю класці. Рыгор маўчаў.

— Чаго ты стаіш? — абазвалася Марына.— Ідзі кладзіся ў спальні, я тут адна буду.

— Чаму?

— Таму. Табе, даражэнькі, у войску нават аўтамат не даверылі.

— Дык што?

— Ідзі,— паўтарыла яна і старанна, нібыта перад чужым, абцягнула на каленьках халат.

Зборка, дзе Рыгор Лукашэвіч рабіў майстрам, прастойвала. Рыгор з самага ранку круціўся ў суседзяў: і пагражаў, і ледзь не ўкленчваў. Калі суседзі паабяцалі даць дэталі, ён вярнуўся да сябе, у кантору майстра, прычыніў дзверы, сеў за чорны ад мазуты стол і заплюшчыў вочы. Успомнілася яму жончына: «Табе, даражэнькі, у войску нават аўтамат не даверылі...». Учора міма вушэй праляцела, а цяпер стала Рыгору крыўдна.

Нават не таму, што жонка сказала, а таму, што так яно і было. Спачатку ён служыў, як усе ў палку, але ў каравуле пачаў страляць...

Ноч. Лес. Шархаціць, трапеча ў цемені кожнае дрэва, нейкімі пачварамі здаюцца кусты, гадзюкай слізгае галінка па назе... Льецца прывіднае святло ад месяца, нацякае ў чалавека, кружыць яму галаву і наганяе слабасць у ногі.

Ваенныя склады стаялі ў лесе, па-над імі плаваў уначы сярод дымоў-аблокаў бледна-жоўты ражок. І з дурной асцярожнасцю ступала нага, і тахкала сэрца ад крыку начной птушкі, і ўгіналася галава, каб не бачылі вочы нябесных зданяў.

Першы раз у каравуле Рыгор крыкнуў на шолах, не дачакаўся адказу, не дачакаўся, каб трывожны шолах аддаліўся, і даў чаргу з аўтамата. Полк выплаціў грошы за карову, што прыблудзіла да калючага дроту з вёскі... Другі раз Рыгор пабаяўся стрэліць, але падняў на ногі ўвесь каравул. Камандзір з доктарам адправілі яго ў будаўнічы батальён, дзе даюць замест аўтамата рыдлёўку.

...Раптам да яго данеслася злое:

— Дзе гэты Лукашэвіч?!!

Крычаў начальнік цэха Сцяпук. Рыгор хуценька выскачыў з канторкі; позна — начальнік ужо раз'юшыўся.

Сцяпука прызначылі ў цэх нядаўна, і Рыгора ён адразу незалюбіў. Ён, напэўна, не ведаў, што Рыгор рабіў тут рабочым, сам у майстры не прасіўся — яго папрасілі.

Зборшчыкі тоўпіліся вакол начальніка, па ўсім было відаць, што яны паўпікалі яму за прастой, можа, і мацюка не пашкадавалі. Сцепуку цяпер трэба было на некага перавесці папрокі.

— Вось дык майстар! Участак стаіць, а ён у будцы храпака дае!

— Я быў у механічным.

— Пагуляць туды схадзіў? Не, ты бяры тачку і — наперад! Каб дэталі хуценька прывёз.

Круталобы, з курчавым саламяным чубам, Сцяпук думаў, што толькі ён хітры. Рыгор добра ведаў, што так здымалі віну з сябе многія начальнікі, і добра ведаў, што няблага б было яму змаўчаць. Але не змаўчаў. Можа, думкі пра сына, пра даўнюю сваю салдацкую няўдачу вывелі яго з раўнавагі, сказаў раздражнёна:

— Тачкі мне не трэба, у нас аўтакары ёсць. Будуць дэталі — аўтакары прывязуць.

Твар у Сцепука зрабіўся як з белага мармуру — бледны і ганарлівы. Напэўна, начальнік цэха і не думаў пасылаць майстра ў механічны цэх з тачкай, дабіваўся толькі, каб ён сумеўся ды хоць сам, без тачкі, пайшоў туды. Але пад пільнымі ўсмешлівымі позіркамі рабочых Сцяпук не мог дараваць падначаленаму рэзкіх слоў.

— Вось як загаварыў... А навошта мне майстар, які спіць у шапку? Мы на наступны месяц планавалі перавыбары, а правядзём сёння ж! Ясна?

— Ясна. І не крычыце на мяне, я ў халуі не наймаўся. У мяне сын у Афганістане...— раптам дадаў Рыгор, не ведаючы, навошта.

— Ну дык што, калі сын? — не зразумеў Сцяпук і глянуў на Рыгора крыху ашаломлена.

— Нічога, так сказаў.

Ён крутануўся, і, не зважаючы больш на начальніка, пайшоў назад у канторку.

Пасля абеду туды бокам праціснуўся Хведар Малюк, зборшчык, якому было блізу сарака, высокі і даўганосы.

— Чуў,— крануў ён Рыгора за плячо, мнучыся ля стала,— начальнік пад канец змены сход збірае. Пытаўся, што ў цябе з сынам... Ну, ці можна цябе, значыцца, таго, ці няма якой бяды...

— Чаго ты чэпішся, Хведар? — спытаў Рыгор, хоць бачыў на вузкім насатым твары Малюка спагаду.— Хай здымае, я сам не хачу болей. Быў конь, ды з'ездзіўся.

— Глядзі... Маладзейшыя хлопцы згаворваюцца. Кажуць: «Хай Калабок з намі паўкалвае, пахудзее...»

— І гэта трэба пераказваць?

— А што?.. Начальнік прапануе Халімонава выбраць.

— Правільна. У яго тэхнікум.

— Шустры ён вельмі... І рукі ў яго не пад тое заточаны...

Калі ў канцы змены рабочыя натаўкліся ў начальніцкі кабінет, Рыгор зациснуўся за чужыя спіны і ся-

дзеў у кутку абыякавы да ўсяго. Нават на словы Сцепука, што майстар Лукашэвіч прыкрывае сваю кепскую работу службай сына ў Афганістане, ён не азваўся. Але, як ні злаваў Сцяпук, большасць зборшчыкаў прагаласавала за Лукашэвіча.

За прахадной нагнаў Рыгора зноў жа Хведар Малюк, падміргнуў:

— За тваё шчасце не грэх было б і па кроплі ўзяць!

— Шчасце знайшоў...— адмахнуўся Рыгор.

— Не кажы... Ты ж некаторых хлопцаў прыціскаў? Прыціскаў. А хлопцы ўсё роўна за цябе прагаласавалі. Шчасце ці не, а прычына ёсць.

— Каб Толік прыйшоў, мне іншага шчасця і не трэба б... Табе добра — у цябе дачка.

— Ага, добра! Прынясе ў прыполе...

— Хоць і прынясе — чалавек будзе. А тут можа чалавека не стаць.

І Рыгор прыспешыў хаду.

2

— Лукашэвіч!

— Я!

— Як ты тут?

— Усё нармальна, таварыш капітан.

— Падмацаванне прыйдзе раніцай. Ноччу не знойдуць ды і напароцца могуць у цемені. Не заснеш?

— Не першы дзень ваюем.

— Каб жа дзень быў...

Капітан Багданчук, здаецца, усё сказаў, што хацеў, але не адпаўзаў, прытуліўся плячмі да валуна, за якім ляжаў Лукашэвіч.

— А-а, успомніў... Твая маці да нампаліта ліст прыслала. Ты рэдка пішаш сваім?

— Не, яна скардзіцца, што фота не прысылаю.

— Фота? Быў жа момант сфатаграфавацца...

— Гэта во ляпка не дае,— дакрануўся Лукашэвіч рукой да ілба.— На першым годзе зарабіў, вас тады тут не было, таварыш капітан.

Багданчук не столькі ўбачыў, колькі ўспомніў глыбокі прамы рубец на ілбе салдата, кіўнуў.

— Ад нажа?

— Ад яго. Якраз ноччу падкраўся адзін хітрун.

— Глядзі не засні, Толя! — папярэдзіў Багданчук і пераваліўся з боку на жывот, зашаргацеў каменьчыкамі. Ён адпоўз усяго метраў на сем, шырокія плечы Багданчука ледзь угадваліся ў тым месцы, дзе ляжаў сяржант Матылёў. «Бу-бу-бу...» — зашапталіся там, але Лукашэвіч не стаў прыслухоўвацца.

У гарах цямнее адразу, як чорны полаг на іх хто накідвае. У такую вось ноч, калі неба заслана хмарамі і зрэдку дзе прамігне сіняя зорачка, зусім нічога не відаць, хоць вочы выкалі. Адно — абрыс дувала наперадзе, за якім прыхавана ў чужой зброі, можа, і твая куля.

Ствол аўтамата пасля стральбы паспеў астыць, і Лукашэвіч, правёўшы па ім далоняй, падумаў пра тое, што і цёплыя каменьчыкі, на якіх ён ляжаў, хутка аддадуць назапашанае за дзень цяпло. Тады давядзецца пакалаціцца.

Недзе па правую руку, даволі далёка, была віхлястая горная дарога. Па ёй удзень прагрымела калона танкаў. Да мяжы, дамоў! Душманы выпусцілі па калоне ракету, але, на шчасце, не пацэлілі, а яны па камандзе Багданчука кінулся ў горы ўслед за душманамі. Загналі іх у пакінуты жыхарамі кішлак і не выпусцілі з кальца, пакуль на горы не ўпала ноч. Каму гэтая ноч даруе жыццё?.. У душманаў два выйсці: здацца або вырвацца з кальца.

Часам ён ненавідзеў іх за тое, што яны забівалі сваіх жа людзей, забівалі яго таварышаў. Калі страляў — ненавідзеў, а калі глядзеў, як яны ляжалі нежывыя... Яго не нудзіла, калені ў яго не дрыжэлі, але было прыкра, агідна на душы. Першы чалавек, якога ён забіў, наўрад ці пажыў на свеце болей за яго самога, можа, толькі ад смугласці сваёй здаваўся старэйшым. Лукашэвіч навек запомніў шкляныя цёмна-карыя вочы, а на свае рукі мо з тыдзень стараўся не глядзець.

І з тае пары ён не любіў думаць пра душманаў. Вайна — і ўсё тут.

А вось пра хлопцаў-танкістаў, якія гналі машыны да мяжы... Яны знарок хавалі радасць перад тымі, хто яшчэ заставаўся ў чужых гарах, але твары з-пад пылу самі сабой свяціліся.

Лукашэвіч пешшу пашыбаваў бы за танкамі. Калі ўжо? Праз дзень, праз два? Як хвароба якая выкручвала апошнім часам рукі і ногі — ад нецярпення, стомы, няўмення зразумець, чаго ты тут у рэшце рэшт дабіўся.

Ён убачыў сваю худзенькую, раней заўсёды вясёлую маці, круглы, часцяком насуплены твар бацькі... І нібы ў страшным сне падняўся смуглы чалавек са шклянымі цёмна-карымі вачыма, зноў схапіў свой кін-

жал, скочыў з гары. Душман занёс кінжал, і Лукашэвіч нібыта ірвануўся да яго... Палец таргануў спускавы кручок, стрэлы, разарваўшы начную цішыню, адбіліся слабым водгуллем недзе за дувалам.

— Чаго шуміш? — нягучна спытаў злева сяржант Матылёў.

— Нічога...

Праклятая ноч!

3

Неяк у суботу назначылі сесію райсавета, і Марына пабегла туды. Дэпутатка. Калі яе першы раз выбралі, Рыгор быў занудзіўся, бо трудна ж і на сесіях мужчыны каля баб. Раней ён жыў спакайней: на камбінаце, дзе Марына рабіла ткачыхай, не надта многа мужчын набіралася... Так, быў занудзіўся, ды хутка махнуў рукой: ці ты ўгледзіш, калі баба скруцілася?

У суботу яго гняла адзінота. Да абеду, чакаючы, пакуль паштарка прынясе пошту, Рыгор яшчэ неяк трываў, а пабачыўшы, што ліста ад Толіка зноў няма, зусім раскіс. Знайшоў у судніку бутэльку гарэлкі, якую Марына прыхавала на ўсялякі выпадак, выпіў...

«Усё-такі,— падумалася яму,— бог не роўна дзеле. У гэту самую хвіліну хлопцы ў Афганістане гінуць, а я вось шыкую...»

Ён быў вясковы чалавек, які не вярнуўся ў вёску пасля войска выпадкова, проста таму, што пазнаёміўся з гарадской дзяўчынай. Бацькі яго памерлі, адзіная сястра выйшла замуж і жыла далёка на поўначы. Так што блізкай тут была толькі Марына. Да запрошлага году жыла яшчэ цешча, але і яе пахавалі ў калядныя маразы.

А сын на вайне...

Хацелася Рыгору нават заплакаць па сыну, ён пасправаваў уявіць яго ў баі, але нічога не атрымалася, як засціла што вочы. Чамусьці ён бачыў і шкадаваў зараз толькі самога сябе. Бачыў невялічкага круглага чалавека і шаптаў злосна: «Калабок, Калабок!»

Найбольш смылела на душы ад таго, што ўсё яго жыццё было выпадковым. Ён успомніў сябе нязграбным, забітым хлопцам, успомніў спачувальны позірк камандзіра палка і яго словы, сказаныя доктару: «Адпраўляй, а то дастраляецца неўдалюга да вялікай бяды...». Успомніў, як у будаўнічым батальёне выслужыў сабе звальненне ў горад — бяздумна шураваў рыдлёўкай дзень пры дні. Хлопцы ў звальненні пачалі заляцацца да дзяўчат, паспрыялі і яму, пазнаёміўшы з Марынай. Яна была тады таксама нязграбная, гэта пазней, калі нарадзіла сына, пастрайнела.

Хлопцы са сваімі дзяўчатамі гулялі, пакуль служба ішла, а ён да Марыны надзейна прыкляпаўся. Не сам — яна так захацела. І паслухмяна пайшоў з ёй запісвацца, і пагадзіўся ўладкавацца на той завод, які яна яму выбрала.

Участак зборкі станкоў яго палохаў, але начальства туды паслала... Праз колькі год пачалі збіраць аўтаматычныя лініі — зноў Рыгор страціў упэўненасць і зноў паслухаў Марыну. Яна проста крыкнула на яго: «Не рыпайся!».

Усё рабіў за Рыгора выпадак. Ці ж тое, што сын не застаўся служыць на роднай зямлі, не выпадкова? Як мог Рыгор перамяніць яго лёс, чым мог памагчы Толіку? Аніяк, анічым.

Ён піў гарэлку і думаў, што свет заўсёды быў чужы і безуважны да яго...

Калі Марына адамкнула дзверы сваім ключом і зайшла ў кухню, Рыгор сядзеў пры стале, тупа гледзячы перад сабой. Жонка пакрывілася, стала нешта гаварыць, а ён не слухаў, не чуў.

Яна, праўда, была стройная, нішто сабе, асабліва

на сваёй сесіі — прычапурылася з такой нагоды. Залацістыя валасы прыгожа аблягалі твар, шэрыя вочы блішчэлі. Толькі губы крывіліся злосна... «Ці ж можна жанчыне верыць? — думаў Рыгор.— Не, з жанчынай праўды ніколі не знойдзеш. Нават калі ў яе ёсць хто, то бі-забівай не скажа. І нельга даведацца, пра што яна думае. Век пражывём, а не прызнаецца. Як сцяна паміж людзьмі — таемныя думкі».

— Ды чаго ты маўчыш, чорт, чорт! — нарэшце дакрычалася да яго Марына.

— Га?

— Што здарылася? З Толікам?!!

— Нічога...

— Нічога з Толікам?

— Не...

— А божухна! Во шчасце мне... Сядзіць п'яны, змярцвелы... Ой, чорт, ажно сэрца з месца сарваў...

— Ты б у сваім Савеце сказала, што думаеш, а не тут.

— Ой...— абняла яго за плечы Марына, прытулілася галавой да галавы.— Хто ж мяне паслухае, божухна... За што нам горачка такое, чым мы людзей угнявілі?

4

— Чаго шуміш? — нягучна спытаў злева сяржант Матылёў.

— Нічога...

Але капітан Багданчук, напэўна, не даў веры, што Лукашэвіч устрывожыўся выпадкова. На вайне, вядома, шмат што выпадкова робіцца, ды, здараецца,

салдат чуе больш, чым яго вушы. Багданчук узняў ракетніцу, стрэліў...

Зялёнае святло шуганула па гарах, вырвала з цемені частку прасторы, і Лукашэвіч наткнуўся позіркам на цёмна-карыя вочы. Душман, прыпаўшы да камяністай сцежкі, ляжаў зусім блізка перад ім.

Сціскаючы што было сілы аўтамат, Лукашэвіч даў чаргу. І адразу ўдарылі дзесяткі аўтаматаў. Частыя вогненныя кропкі лучыліся ў смяротныя палосы, рэзалі, скрываўлівалі прастору. Угару паляцелі новыя ракеты, асвятляючы і кішлак з яго белымі дуваламі, і душманаў, якія курчыліся ці паспешліва адпаўзалі за камяні.

Па валуне перед Лукашэвічам таксама зацокалі кулі, але ненадоўга, бо рота, заняўшы выйгрышную пазіцыю, лёгка «перамолвала» душманаў. Іх успароў сярод ночы адчай...

Патыхала паленым, ляцелі асколкі, адбітыя кулямі ад камянёў, і страшныя крыкі рваліся да неба з гэтага начнога пекла.

Лукашэвіч ачуўся, калі ў ражку скончыліся патроны. Ён пацягнуўся рукой да падсумка, але так і не намацаў яго — зразумеў, што выпусціў амаль увесь ражок у тыя цёмна-карыя вочы, якія даўно даймалі яго і зноў з'явіліся перад ім у начы. Іх ужо не было, ён расстраляў іх і думаў, што больш не прытрызняцца яны нават у сне.

Рота яшчэ зрэдку пастрэльвала, яшчэ шыпелі ў небе ракеты. Лукашэвіч ляжаў ніцма, адкінуўшы аўтамат убок. «Усё,— прамільгнула ў думках.— Ты — апошні».

— Матылёва забілі! — крыкнуў нехта побач.

«І нашы не ўсе...»

5

Скрозь звялае леташняе покрыва даўно прабілася маладзенькая трава, на вязах пад вокнамі разгарнулася з пупышак клейкае лісцейка. Але надвор'е стаяла крутлівае: то цяпло, то холад. Ранкам часцяком дзьмуў вецер, што прымушаў згадваць ці не зіму, а вечарам, здаралася, ляцела з неба халоднае сяйво — ні дождж, ні снег, або такі дождж, якому хочацца стаць снегам. На газонах зажаўцелі дзьмухаўцы, нібыта скрозь па горадзе прадзяўбліся на свет белыя пушыстыя кураняткі, а Рыгор і не згледзеў, калі надышоў і закрасаваў май. Вядома, удзень расцвітаў, гэта адчувалася па гарачыні ў цэху, але тады Рыгору некалі было разважаць аб надвор'і і вясне. Калі кідаў вокам на шыбіны, пакрытыя густым пылам і копаццю, дык і тады не бачыў сонца. А цаляў позіркам туды, дзе шыбіны былі павыбіты,— усё роўна не тое. Пад сонцам ільснілася чорная, нежывая заводская зямля. На ёй не раслі ні трава, ні дрэвы, зямля была прыкатаная машынамі, цвёрдая, як чыгунная патэльня, адно што накрыўкі не хапала.

Ён успамінаў вясну ў вёсцы... Памятаў Рыгор звонкасць неба, у якім віселі жаўрукі, прылёт шпакоў і першыя краскі, памятаў, як жвава праразалі нябесную бездань ластаўкі, нават бэз у палісадніку пры хаце ўспамінаўся яму.

Цяпер жа, падалося Рыгору, жыў ён у вялікай бетоннай скрыні, застаўленай варштатамі, станкамі, заваленай розным прычындаллем, а калі выбіраўся з яе, тады нейкі зламыснік знарок псаваў вясну, далучаў да яе што ад восені, а што і ад перадзімніх дзён. Нібы замінала б таму невядомаму зламысніку, каб і Рыгор адчуў вясну.

Нарэшце скончылася гэтая бязглуздая гульня... Рыгор здагадаўся пра тое яшчэ ўначы. Марына неспакойна круцілася ў сне, здзірала і з сябе, і з яго коўдру. Ён бурчэў, адсоўваўся ад жонкі, потым зусім прачнуўся. Было горача, і Рыгор устаў, расчыніў фортку. У задушлівую спальню палілося з двара свежае і цёплае, што сырадой, паветра. То быў сапраўдны подых вясны.

Па дарозе на завод Рыгор некалькі разоў налятаў на прахожых, бо задзіраў галаву, глядзеў і не мог наглядзецца на чыстую светласць неба. Працавалася яму ў той дзень лёгка і весела, хоць быў дзень няпросты. Якраз заканчвалася зборка аўтаматычнай лініі, ставіліся на яе апошнія вузлы і вузельчыкі, Рыгор мусіў бегаць па цэхах, здабываць тое, чаго не хапала. Ды ён любіў такія дні, бо нарэшце ў халодны, нежывы метал прыходзіла жыццё. Гэта былі крыху ўрачыстыя і незвычайныя дні. Вось і сёння... Лінію сабралі, калі ўжо скончылася змена. Але ніхто з рабочых не спяшаўся дамоў, усім хацелася паглядзець, што з яе будзе. Уключылі... Папаўзла ад станка да станка па транспарцёру першая нарыхтоўка, трапляючы пад вострыя грані разцоў, свярдзёлкаў і фрэзаў. Сыпанулі іскры, замігалі сігнальныя лямпачкі... Працуе лінія!

Але яна пакуль як малое дзіця, якое толькі вучыцца хадзіць, яе трэба наладзіць. Не зразумеў яшчэ новы начальнік цэха Сцяпук... Не, не таго не зразумеў, што лінію трэба наладзіць, а які майстар Рыгор Лукашэвіч. Гэтая наладка ў іншых людзей займае і дні, і тыдні, а ў Рыгора...

— Не, хлопцы, сёння зробім! — прапанаваў ён.

У лініі ёсць свой голас, ён апавядае, дзе што не так, толькі навучыся слухаць. І Рыгор слухаў голас лініі. Рабочыя спынялі яе, рабілі тое, што ён казаў, зноў уключалі, і Рыгор зноў слухаў. Так праляцела гадзіна, другая... Згусцелі за вокнамі прыцемкі, потым зусім пацямнела. І паступова знікалі дурныя гукі, знікаў натужны гул і непатрэбны стук, голас лініі рабіўся роўным і чыстым.

Рыгор разам з рабочымі пайшоў у душ ажно а палове дзесятай гадзіны. Вечар прапаў, але ж справу зладзілі, прыемна было стаяць пад гарачым душам і хваліць самога сябе.

Нехта яшчэ забавіўся каля лініі, улез у душавую пазней і крыкнуў са смехам:

— Рыгор! Цябе Сцяпук выклікае!

Рыгор вылаяўся.

— Схадзі! — параіў Хведар Малюк.— Сёння, можа, не адбярэ тваёй партфелі.

— Трэба мне партфеля... А чаго ён тут сядзіць? Яшчэ і ноччу хадзі...

Але ж не абмінуў ён начальніцкага кабінета. Сцяпук пісаў нешта, падпіраючы левай рукой свой круты лоб — пальцы тырчэлі з яго саламянага чуба як карона.

— А-а, Лукашэвіч,— зірнуў Сцяпук стомлена.— Жонка твая званіла. Сын ліст прыслаў: ён ужо не ў Афганістане, а тут, у Саюзе. Жывы, здаровы, не хвалюйся!

— Дзякуй вам, Максім Міхайлавіч...

Рыгор хуценька крутнуўся, каб не паказаць начальніку свайго твару, трушком пабег па цэху, потым па чорнай, цвёрдай зямлі. Спыніўся за прахадной, прытуліўся плячыма да сцяны. У вачах шчыпала, губы дрыжэлі.

«Ну, чаго ты? Цяпер жа ўсё добра...» — угаворваў сам сябе. І не мог адпіхнуць ад сябе сцяну, не хацеў ісці ў горад на шумныя вуліцы. Тады павярнуў ён налева, паціху пасунуўся ўздоўж сцяны туды, дзе на гарадской ускраіне рос невялічкі лясок.

«Усё добра,— круцілася ў яго думках.— Цяпер мы будзем добра жыць... Што нам цяпер розныя дробныя непрыемнасці... Цяпер усё, Калабок...»

Ноч. Лес. Шархаціць, трапеча ў цемені кожнае дрэва, нейкімі пачварамі здаюцца кусты, гадзюкай слізгае галінка па назе... Льецца прывіднае святло ад месячыка, нацякае ў чалавека, кружыць яму галаву і наганяе слабасць у ногі.

З дурной асцярожлівасцю ступала нага, тахкала сэрца ад крыку начной птушкі, угіналася галава, каб не бачыць вачам сярод дымоў-аблокаў бледна-жоўты ражок і далёкія нябесныя здані.

Уладзімір ГРАЎЦОЎ

«ПАДМАРОЖАНАЕ» ПАКАЛЕННЕ

СУБ'ЕКТЫЎНЫЯ НАКІДЫ ДА НЕНАПІСАНАГА ПАРТРЭТА МАЙГО ПАКАЛЕННЯ Ў ТРОХ ЧАСТКАХ З ПРАЛОГАМ

«Печально я смотрю на наше поколенье,
Его грядущее иль пусто иль темно».
М. Лермантаў

«Вам повезло! Ваше поколение вступает в сознательную жизнь вместе с перестройкой...»
З выступлення на студэнцкім вечары

ПРАЛОГ

Бедныя «потомки! Роясь в сегодняшнем окаменевшем г.., наших дней изучая потемки», ім, мажліва, давядзецца згадаць і пра нас — пакаленне... Зрэшты, аднаму Богу вядома, што прачытаюць яны праз шмат гадоў у падручніках па гісторыі і літаратуры (савецкай? славянскай? беларускай? амерыканскай?..) пра нашае пакаленне, пра тых, каму цяпер 25—30 гадоў.

«Шасцідзесятнікі», «саракагадовыя»... Пад якім імем пакінем мы свой след? І ўвогуле— ці пакінем? Калі праўда, што «маці-гісторыя» адводзіць пакаленню адно дзесяцігоддзе, каб сябе выказаць, то якое з іх нашае?

А ці не паспрабаваць нам ужо зараз прыадкрыць «заслону часу»? Дальбог, у час павальнага захаплення хірамантыяй, астралогіяй у шэрагу глабальных прагнозаў аб лёсах сусвету, Зямлі, краіны спроба змадэліраваць лёс аднаго толькі пакалення — рэч нябачаная і... найцікавейшая! Але дзеля гэтага нам прыйдзецца ў думках вярнуцца ў мінулае, у нашае дзяцінства і юнацтва. Вярнуцца, каб усвядоміць: ХТО МЫ? НА ШТО ЗДАТНЫЯ? ЧАГО ХОЧАМ?..

Пакаленне — тэрмін адносны. Галоўнае — не ўзроставыя рамкі, а тое гістарычнае паветра, якім мы дыхалі, тая ежа, на якой мы ўзгадаваліся такімі, а не іншымі.

Калі ўкласці ў камп'ютэр дадзеныя пра маё пакаленне, ён, бадай, выдаў бы сярэднестатыстычнае:

Бацькі — «дзеці застою» з элементамі сталінскага страху, хрушчоўскіх надзей і брэжнеўскай апатыі.

Дзяцінства — 70-я гады, росквіт застою, «поўныя» крамы і сачыненні аб «Малой Зямлі».

Юнацтва (студэнцтва, войска, рабочыя «універсітэты») — пік застою, палацавыя «пераваротыы» (смерць Брэжнева, Андропава, Чарненкі), пачатак перабудовы.

Маладосць — «развітая перабудова» і ўсё, што з ёй звязана.

Камп'ютэр ёсць камп'ютэр. Ён не тлумачыць, а хутчэй дае спажыву для каментарыяў і роздуму. Суб'ектыўных, вядома...

Частка першая. КРУШЭННЕ ІЛЮЗІЙ.

Колькі людзей, столькі лёсаў. Кажуць так. Але ёсць, мне здаецца, у нашага пакалення і агульны лёс. Дзяцінства — гэта не толькі школа — з двойкамі, тайным курэннем і першым каханнем, але і знаёмства з тымі ісцінамі, якіх няма ў кнігах. Эвалюцыя...

Вось і ўявім сабе: 70-я гады, вёска (маленькі гарадок), уражлівы хлопчык, які сумленна стараецца прытрымлівацца «правільных» ісцін. (Не зусім тыпова, але паказальна.)

...Аднакласнікі на сценах і партах выдрапваюць нецэнзурныя словы, называюць піянерскі гальштук «селядцом». А тым часам «Пионерская правда» расказвае пра злёт піянераў краіны ў Артэку.

ВОСЬ БЫ ТРАПІЦЬ У ШКОЛУ, ДЗЕ САПРАЎДНЫЯ ПІЯНЕРЫ!

...Супрацоўнік раённай газеты паказвае юнкору-пачаткоўцу перадрукаваныя на машынцы вершы Еўтушэнкі, Ахматавай. **Хіба гэта можна сумясціць з працаю ў газеце?**

...Дачка сакратара райкома па сакрэту расказвае анекдот пра Брэжнева, пачуты ад бацькі. **Як шкада Леаніда Ільіча і што ў райкоме працуюць несапраўдныя камуністы!**

...Класны кіраўнік чытае на класнай гадзіне артыкул пра Растраповіча і Вішнеўскую. Ну чаго ім не хапала?! Грошы, слава!.. **«Калі грошай хапала, дык з-за чаго?..».** Класная зноў пра грошы. **Нелагічна...**

...Рэспубліканскі злёт піянераў у «Зубронку». Першая ноч — знаёмстваў. Анекдоты пра Пецьку і Васілія Іванавіча. Сын вядомага сталічнага артыста расказвае анекдот пра Леніна. Ніхто не абураецца. **А некаму ж з іх быць камуністам, быць гадоў праз 40—50 Генеральным сакратаром!.. Калі нават лепшыя піянеры рэспублікі..., дык што ўжо гаварыць. А можа, у Маскве?!.**

...У вёску на лета прыехала дзяўчынка з Масквы. Расказвае, што білеты на Джо Дасэна ў спекулянтаў каштавалі да 50-ці рублёў. У першы ж вечар «пайшла» з Пецькам Гаварковым. **А яшчэ масквічка!..**

...Увечары па тэлевізары зноў фільм пра Леніна. Як заўсёды, пасля такіх фільмаў часта б'ецца сэрца, няма ніякіх сумненняў у правільнасці ўсяго, што адбываецца. А назаўтра зноў сумненні, зноў пытанні і бясконцыя спрэчкі з бацькам, камуністам — «шасцідзесятнікам».

Ах, як хочацца верыць, што ўсе няўдачы толькі з-за несвядомасці асобных людзей!..

Нарэшце! Сярод усіх першакурснікаў ён вылучаўся і вонкава — нешматслоўны, з інтэлігентнымі манерамі. Прадстаўнік самай ідэйнай і свядомай сям'і ў рэспубліцы, калі меркаваць па пасадзе ягонага бацькі. Першая размова. І... у адказ на словы пра ідэйнасць — смех і тыя ж анекдоты. Пра Брэжнева і гомасексуалістаў.

...Дзяцінства скончылася. Гісторыя дзяцінства, тыповая для многіх маіх равеснікаў. Эвалюцыя ад дзіцячага фанатызму да першых расчараванняў. У адных

трохі раней, у іншых трохі пазней.

У юнацтва мы ўступалі з жаданнем альбо ўмацавацца ў веры бацькоў, альбо набыць новую.

Заўвага. У 16 гадоў словы «Я веру ў камунізм» — ужо былі анахранізмам, не выклікалі разумення і... спагады.

Частка другая.
«ПАКУТЫ ДУХУ».

А с нами ничего не происходит
И вряд ли что-нибудь произойдет.

Гэтыя словы з рэпертуару «Машыны часу» для нас, студэнтаў першай паловы 80-х, былі больш чым радкі. Гэта — лозунг, дэвіз, пароль, пад які рвалі на сабе кашулю і ішлі ў п'яным чадзе ў суседні пакой па карнізе — так проста, ад пакутаў духу і прагі дзеяння. Хоць якога.

...Брэжнеў, Чарненка, Андропаў. Гэта былі для нас не столькі прозвішчы, колькі — вехі, буеры, якія абазначалі не толькі ўсплёскі надзей, гультаяватай цікаўнасці, веры, але і цьмянага, хворага жадання, каб «хоць што-небудзь» здарылася — тут і неадкладна, за вокнамі інтэрната...

«Мы пойдзем з аўтаматамі, калі нічога не зменіцца!» — крычаў мой прыяцель на прыступках ЦК. Крычаў, каб... не пачулі. Крычаў для сябе.

«Я сам из тех, кто спрятался за дверь,
Кто мог идти, но только молча пел...» —

не спявалі, а, сціснуўшы зубы, выціскалі мы разам з рок-гуртам «Нядзеля».

Нашае ўнутранае жыццё нагадвала кацёл, у якім сутыкаліся, уступалі ў рэакцыю тысячы «чаму?», «калі?», «што рабіць?» з мільёнам «нельга!» — думаць, выступаць, пісаць, гаварыць, хацець, абурацца, спадзявацца...

Кацёл, на жаль, не ўзрываўся. Спрацоўваў інстынкт самазахавання. Пару выпускалі... Куды?

У вучобу. Згадваючы нашых выдатнікаў, цяжка сказаць, чаго было болей: прагі ведаў ці імкнення схавацца. У трагедыях Шэкспіра — ад драмы свайго жыцця, у мёртвай латыні — ад «праклятых» пытанняў, у антычнай гісторыі — знайсці страсці і ўчынкі, якіх не было ў нашай сапраўднасці?!.

У п'янку і бойкі. Дагэтуль стаіць перад вачыма Сяргей Б.— былы спартсмен, эмацыянальны, які перапрабаваў усё. Ен поўніўся сіламі і то кідаўся ў вучобу, то дзень пры дні хадзіў на элітарныя фільмы, наведваючы самыя занядбаныя кінатэатры і Дамы культуры, то ўпадаў у дэпрэсію і піў. І не проста піў, а пад бясстрашныя спрэчкі аб палітыцы, уцягваючы ў іх і «накачваючы» палову паверха. Спрэчкі гэтыя амаль заўсёды заканчваліся бойкаю, а дакладней — лупцаваннем усіх, хто ні трапіцца пад руку, пачынаючы з неграў, камсоргаў і канчаючы тымі, каго называў «хлопчыкамі-мажорамі»... То ён «пачынаў новае жыццё» — з вершамі пры свечках, абавязковай гімнастыкай, заклікам «кідаць курыць і піць». То... пачыналася ўсё зноў. Пакуль яго не выключылі з універсітэта.

У сям'ю. «Адзіны банк, куды варта ўкладваць сваё жыццё,— гэта сям'я!» — перафразаваўшы словы героя з рамана Я. Еўтушэнкі, пераконваў нас другі Сяргей — Ш. На трэцім курсе ён кінуў пісаць вершы і ўдзельнічаць у нашых начных дыскусіях — і ажаніўся. Увесь час ён стаў бавіць з жонкаю — у бібліятэцы, у крамах, у чэргах па каўбасу і «Кіеўскі торт». Часам ён падкармліваў нас дранікамі ці смажанай бульбаю з сямейнага стала, па-бацькоўску выгаворваючы нам за нездаровы лад жыцця.

А для тых, хто не хацеў ці не мог адгарадзіцца ад хлусні, пустэчы і ўсеагульнага двудушша прыстойнасцю жонак, тоўстымі сценамі з кніг і ўтульнымі вячэрнімі чаепіццямі, заставаліся — спорт, распуста, фар-

цоўка... Так, так, сумна вядомая фарцоўка. Хто са студэнтаў не быў сведкам ці ўдзельнікам дробнага перапродажу «шмотак», прывезеных замежнымі студэнтамі — усё прадавалася так, што практычна гэта быў не бізнес, а проста хобі — рызыкоўнае, яно па-свойму хвалявала і бадзёрыла кроў...

Цёмнаскуры студэнт, наш мілы Рауль, які прыехаў у Савецкі Саюз з-за любові да Дастаеўскага і які ўражваў нас спачатку пераўвасабленнем з бясстраснага інфарматара аб «тамтэйшым» жыцці ў страснага дыспутанта, захварэў на славянскі «гамлетызм», перастаў хадзіць на заняткі, здаваць экзамены і быў выключаны з універсітэта — рэдкі выпадак для іншаземца. У аэрапорце ён са слязьмі на вачах біў сябе ў грудзі: «Не, я ні аб чым не шкадую! Я напішу кнігу пра вас! Яе перададуць па «Голасе Амерыкі», слухайце! Я раскажу праўду пра вас!..»

Ён не шкадаваў. Мы не шкадавалі. Але былі сярод нас і тыя, хто, пасмейваючыся з нашай рэфлексіі, упарта ішоў да сваёй мэты. Не так згадваюцца тыя, хто праседжваў ночы напралёт у «Ленінцы» над якой-небудзь дыялекталогіяй, каб заслужыць сабе месца ў аспірантуры (часта — безвынікова), як тыя, каму для гэтага не хапала розуму і ўседлівасці, і яны ішлі іншым шляхам. Яны не чыталі Булгакава, але размяркоўвалі стыпендыі, яны маўчалі на семінарах па Дастаеўскім, але ўпэўнена хамілі пры дзяльбе месцаў у інтэрнаце, яны скончылі універсітэт на «тройкі», але сядзелі цяпер на кафедрах ці ў гаркомаўскіх кабінетах. Сакратар камітэта камсамола — аспірант — супрацоўнік кафедры. Для нашага факультэта гэта быў адпрацаваны маршрут (думаю, і дагэтуль). Памятаю адну такую студэнтку: ветлівую, знешне непрыкметную, з ціхім голасам. Яна ўмудрылася арганізаваць пратакол пасяджэння камітэта камсамола з адабрэннем выключэння студэнта К. з універсітэта ... да таго, як паперы яшчэ трапілі да рэктара. Калі рэктар прызнаў абгрунтаванні для выключэння недастатковымі, яна адразу ж арганізавала пратакол... правільна, самі здагадаліся. Можна было б назваць яе прозвішча, але навошта?.. Яна выкладае. Там жа, на кафедры. Асуджае сталінізм. І застой, вядома. Словам, добра жыве. З думкаю, што аддала маладосць карыснай справе. Уся яе вясковая радня ганарыцца, што з'эканоміла на прапісцы і кааператыве. Таксама ж нашае пакаленне. Таксама «прадукт і вытворнае», а цяпер яшчэ і «вытвараючае»...

Але ўсё гэта будзе потым. А тады, на пачатку 80-х, мы прагнулі аднаго — **ПЕРАМЕН!**

Частка трэцяя.
МАЛАДОСЦЬ І...
СЁННЯ, ПРАЗ ПЯЦЬ ГАДОЎ.

«Блажен, кто посетил сей мир
В его минуты роковые...»

І вось — прыйшло, грымнула, асляпіла! Перабудова, дэмакратызацыя, галоснасць — пе-ра-ме-ны...

Як мы лаялі нашіх «пісьменнікаў», чые кнігі пакрываліся пылам на кніжных прылаўках. «Акапаліся ў цёплых кабінетах і гоняць кан'юнктуру»,— бурчэлі мы, абышоўшы з першымі апавяданнямі сталічныя рэдакцыі.

І вось ужо многія з нас сядзяць у тых самых цёплых кабінетах і іхнія кнігі з'яўляюцца на тых самых прылаўках, таксама, за малым выняткам, пакрываючыся пылам. Толькі новым.

Пе-ра-ме-ны!..

«Дайце нам сказаць сваё слова ў мастацтве, навуцы, палітыцы!»

Далі. І свет не перакуліўся. Хоць не...

Пяць гадоў назад, паклаўшы адно аднаму на плечы рукі, мы спявалі: «Возьмемся за рукі, сябры, каб не прапасці ў адзіноце!..»

Не прапалі. Выжылі. Але той, хто абдымаў мяне справа,— стаў хвацкім журналістам урадавай газеты, а той, хто абдымаў злева,— персонаю нон-грата ва ўласнай рэспубліцы, вядзе жыццё амаль што прафесійнага падпольшчыка. Мы ўжо не абдымаемся. Адзначаем святы ў розных кампаніях і спяваем розныя песні. Здаём узносы ў розныя арганізацыі. Гаворым на розных мовах. Літаральна...

Пе-ра-ме-ны!..

«Блажен, кто посетил сей мир в его минуты роковые...» Блажен? Інакш кажучы, шчаслівы?.. Чым не «ракавыя» цяпер хвіліны, дні, месяцы? Але чаму мяне не пакідае адчуванне, што нашыя крыкі, абяцанні, прага барацьбы так і засталіся ў нашым юнацтве — як успамін, не болей?! Што ў большасці з нас няма ні сіл, ні жадання выкарыстаць свой шанц?!

Памыляюся? Рады быў бы! І нашае пакаленне дасць сваіх лаўрэатаў Нобелеўскіх прэмій, сваіх прарокаў, правадыроў, сваіх — закон часу — Генеральных сакратароў.

І ўсё ж, усё ж, усё ж...

Бо многія з нас ужо дырэктары школ, а вучні паранейшаму задыхаюцца ў іх ад шкалярства і двудушнасці.

Калі мы ўжо кіруем камсамолам і нефармальнымі рухамі, лёс большасці — апатыя і алкаголь.

Калі мы ўжо стварылі першыя сімфоніі, карціны, кнігі, побач з намі вар'яцеюць ад бездухоўнасці і цемрадзі ў душы!..

Максімалізм? На жаль, яго якраз і не хапае.

Знаёмы інжынер у калгасе, мой равеснік, які «рассмяшыў» увесь калгас сваім жаданнем стаць фермерам і завесці «ўласную справу», скардзіцца:

— Ты думаеш, маё жаданне шакіруе толькі старых калгаснікаў? Нядаўна была сустрэча аднакурснікаў нашага сельгасінстытута, дык усе сто чалавек (!) мяне на смех паднялі. А пяць гадоў назад галасілі ўсе: «Ах, каб можна было!.. Ах, свая справа!..». І калі яны паспелі пастарэць?..

Дык што ж у нас за пакаленне? Можа, яно — падмарожанае ў дзяцінстве і юнацтве — няздольнае на якісьці плён? Зломленае тым, што ў дзяцінстве суровыя ісціны непапраўна «прыгнулі» нашыя душы і ім ужо не выпрастацца?! А можа, рабскае? І нам да канца жыцця не выціснуць з сябе тое, што ўвайшло ў нас амаль з нараджэння — бессэнсоўнасць пратэсту, халодны разлік і вечны скепсіс?..

Берагі

У раманах Івана Чыгрынава мы спатыкаем вобраз Масея Зазыбы. Хто стаў яго правобразам, падказаў радок: «Адна дарога ў Белы Камень, а другая на Іркуцк». Гэты радок ведае, бадай, кожны, хто дасведчаны ў гісторыі беларускае літаратуры. Гэты радок належыць Масею Сяднёву.

Сын селяніна з Касцюковіцкага раёна (менавіта там ёсць вёска Белы Камень), ён стаў студэнтам, а потым... А потым разам з Янкам Нёманскім, Янкам Туміловічам і Васілём Хомчанкам апынуўся ў турме НКУС БССР. Потым былі этапы. Калыма. Потым зноў прывезлі ў Мінск (ужо не Менск). Потым іх, зняволеных, хацелі эвакуаваць, бо пачалася вайна. Але не ўдалося. Раздалася каманда: «Бытавікі — налева, 58 артыкул — направа». Крымінальнікаў пусцілі на волю, а «палітыкам» была наканавана смерць. Загінуў яўрэйскі паэт Зэлік Аксельрод. Цудам ацалеў выдатны крытык Рыгор Бярозкін. Застаўся жыць Масей Сяднёў. Усю вайну імкнуўся ён пазбегнуць удзелу ў злачынствах. Усю вайну думаў: а што далей? І мусіў ісці на Захад...

Пісьменнік жыве ў Злучаных Штатах. Надрукаваў шэсць кніг вершаў, два раманы. Яго вершы з'явіліся ў друку БССР.

Гэтую падборку склалі творы са зборніка «А часу больш, чым вечнасць» (Нью-Йорк, 1988).

Публікацыяй вершаў Масея Сяднёва мы пачынаем рубрыку «Берагі».

Ёсць два берагі ў нашай культуры: творчасць тых, хто жыве на Бацькаўшчыне (у БССР і на Беласточчыне), і тых, хто жыве на эміграцыі. І тыя і другія пішуць вершы і прозу ў беларускай мове, складаюць песні на вершы беларускіх паэтаў, пачуваюцца беларусамі ў жывапісе... Думаецца, настала пара будаваць масты паміж берагамі.

Масей СЯДНЁЎ

ЗАМАЛА ЧАСУ

Быў малады і думаў, што ў мяне
наперадзе ёсьць часу больш, чым
вечнасьць,
што час ня скончыцца, не праміне —
бяздумна жыў я і бясьпечна.

Маёю школаю былі загон, папас
і розум мой ня біўся над загадкаю
сьляпою.
Я верыў — прыйдзе мой жаданы час
і станецца, што мае быць, самім
сабою.

Ня ведаю, ці сталася яно, ці не,
а толькі я пайшоў дарогаю сваёю,
а толькі ісьці нялёгка было мне
дарогаю сваёю тою.

Усё адкладваў я на потым, на
пазьней
і не сьпяшаўся зьдзейсьніцца
радкамі.
Яны губляліся, адвольныя, у сьне,
ды зноў прасіліся ў мяне начамі.

Іх запісаць не давялося мне
у той, што жыў я, паняверцы.
Я думаў — гора праміне,
І зьберагу я іх у маім сэрцы.

Ды час прайшоў — я не заўважыў
як...
Відно цяпер мне бяз прыкрасаў:
таго, што я хацеў, я не зраблю
ніяк —
страшэнна мала засталося ў мяне
часу.

1988

ПАЗНАНЬНЕ БОГА

Як зачыніліся за мною дзьверы
турмы, душой як занямог,
усёй сардэчнай сілай верыць
я стаў, што ёсць на сьвеце Бог.

Агонь сьвяты, агонь таемны
мне веру ўліў, пазнаць мне дапамог,
што ўсім зямным і ўсім надземным
валодае адвеку толькі Бог.

Няхай прабачыць мне магутны,
што верыць я раней ня мог.
О так. Я грэшнік, раб пакутны,
я прад Табою на каленях, Бог.

Карай мяне за ўсе мае хімеры
і дай глядзець на Твой сьвяты парог.
Пазбаў жыцьця, а толькі веру
Табе, усемагутны Бог.

Менск, турма, 1937

ДА ЧЫТАЧА

Я добрага яшчэ ў жыцьці ня знаў,
аб добрым у жыцьці я толькі яшчэ
мару —
як кволы цьвет паўдзённых пышных
траў,
на поўначы я мёрз ад сьцюж
бязьлітаснага ўдару.

Мне Бацькаўшчына мроілася ў снах,
прыглушаная гвалтам, зьдзекам
і бядою.
Я песьнямі адзначыў свой пакутны
шлях,
я сумам напаіў свой верш, нібы
дзіця вадою.

Пакутаў зменьшыць я ня мог
нічым —
стаяла сьмерць кастлявая перад
вачыма...
Я і цяпер балючасьць ран не
залячыў,
мая душа, парваўшы ланцугі, яшчэ
не адпачыла.

Я накіп сэрца песьнямі лячу,
яны бальзамам для яго, няйначай.
Сярод імклівай радасьці, мой
чытачу,
няўцешны плач душы і смутак
можна мне прабачыць.

Орля, 1943

* * *

Цябе я ўспомніў і душою
здрыгнуўся ў радасьці нямой:
васкрэсла ты перада мною
ва ўсёй прыгожасьці сваёй.

Цябе я сэрцам адчуваю,
ты ў ім — адвечнаю вясной.
Табой тамлюся і сьпяваю
сягоньня я табе адной.

Я сэрцам вырас у каханьні,
пазнаў я шчасьце і жыцьцё.
Мае глухія уздыханьні,
як сон, мінулі ў нябыцьцё.

І рад, што ў шчасьці я знываю,
што сэрца мне хвалюе жар.
І як магу, так бласлаўляю
пасланы мне каханьня дар.

1936

ЛІСТАПАД

...І хоць болем палымнеюць грудзі,
і хоць хутка я іду да спаду —
радасьць, успаміны ў сэрцы будзяць
жоўтыя завеі лістападу.

Мірсьціцца, як вецер на ўзьлесьсі
золата ганяў віхрамі.
Поўнілася сэрца маё песьняй
і ня ведаў, дзе я —
на зямлі ці
ў храме.

Паскідалі лісьце сваё клёны,
сыпнулі бярозы поўнай жменяй.
Ў золата васеньняе ўлюблёны,
ў золаце стаяў я па калені.

Грае у душы вячыстасьць клёнаў,
лістапада восеньская замяць.
О, мая васеньняя ўлюблёнасьць!
О, мая нязгасная ты памяць!

1988

ВОСЕНЬ-ГАСПАДЫНЯ

У нашым агародзе восень ссекла
капусту.
Засталіся толькі адны пні-
качарыжкі.
Выкапала бульбу, буракі, моркаўку.
Марозам уначы прыхапіла цыбулю,
часнок, рэдзьку,
што маці яшчэ не пасьпела выбраць.
Дагледзела, упарадкавала ўсё, як
добрая гаспадыня.
І непрыкметна пакінула наш
агарод.
Перабралася ў недалёкую пушчу,
каб пераседзець там зіму.
За ўсю ейную работу ёй ніхто,
аднак, не падзякаваў.

1988

Адам ГЛОБУС

УЛЁТ!

АД «МРОІ» ДА «ХОЯ», НА ФЕСТЫВАЛІ «ТРЫ КОЛЕРЫ-90»

1.
ФІНІШ, АБО ІНФАРМАЦЫЯ.

Сфармавалася беларуская рок-тусоўка. Нарэшце. Акрэслілася кола лідэраў — «Мроя», «Уліс» і «Бонда». Беларуская мова стала дзяржаўнай моваю тутэйшых рокераў. І не толькі іх, дарэчы. З дванаццаці лепшых гуртоў па-беларуску спяваюць сем. Другой па значнасці на фестывалі была англійская мова. Так і належыць у такой справе, бо абрыдла ныццё пра расейскую перыферыйнасць. Нарэшце прыемнае, лёгкае і спрэчнае. Самыя-самыя: гітарыст — Вячаслаў Корань, бас-гітарыст — Сяржук Краўчанка, клавішнік — Лявон Вольскі, бубнар — Кірыла Шэвандо, вакаліст — Уладзімір Зялінскі, паэзія гурта «Мроя», гукааператар гурта «Уліс». (Свайго аператара хлопцы не маюць, але прагучалі лепш за ўсіх астатніх. Парадокс? Заканамернасць! І не трэба ля-ля, што іх цягнуць нацмены і мафія). Лепшае шоу ладзіў гурт «Хой», а самы самабытны быў гурт «Ы-Ы-Ы» на чале з Базылём Шугалеем.

Вось такім быў фініш на рок-марафоне «Тры колеры-90», дзе бралі ўдзел 43 каманды.

2.
ТЭКСТЫ, БО НАПАЧАТКУ БЫЛО СЛОВА, І СЛОВА БЫЛО...

З тэкстамі блага, бо з-за якасці гуку іх амаль не чуваць. Але калі трэба, калі абавязак, калі паклікалі ў журы, каб разабраў... Дык разбяру.

«Мама, нашто радзіла ты балвана?» — разоў з дзесяць спытаў саліст «Бесцырымоннага ўмяшання». Мама не з'явілася і не адказала. Пытанне застаецца. Нашто?

«Бліжэй да восені — бліжэй да холаду»,— выспяваў гурт «Пан Бользан», але гэта вядома і без «Бользана». Е-маё.

«Мама, не магу цябе забыць!» — пранікнёна запэўніў гурт «Каменны дождж», хлопцы ў чырвоных ботах, пэўна, пазычаных у ансамбля «Харошкі». Маму забываць не трэба. Хто спрачаецца? Толькі такі сказ — Мама, не магу цябе забыць! — трэба не выконваць, а выколваць тушшу на плячы. Тэхніка завецца масцюха, або татуіроўка.

«Дайце мне манетку!» — клянчыў гурт «Магія». Ніхто не даў. Рок-тусоўка бедная. Факт. «Магіі» магу параіць выступаць перад тымі, каму ўжо накінулі зарплату на 40—50 процэнтаў як супрацоўнікам апарату.

Тое, што сёмая шклянка лепшая за першую, казаў саліст з «Жоўтага прысмаку». Тут можна паспрачацца, але хай будзе так, як спяваў басаногі дзядзька. А вось потым папёрлі таннасць і безгустоўнасць: «І я здымаю зоры для вас, сябры мае». Дзякуй, не трэба. Зрэшты, што турбавацца? Не дацягнецца «Жоўты прысмак» да зор. Ну хіба хто падсадзіць.

«Маць, тваю маць!» — сказануў хлопчык камбайнёрскага выгляду з гурта «Ляпіс Трубяцкі». Такое не дарую! Гурт «Ляпіс Трубяцкі» — бяздарны плагіятар піцерскага «Нуля». Ясна? Так што давай, хлопчык камбайнёрскага выгляду, забывайся на назоў «Ляпіс Трубяцкі», забывайся на тэксты, музыку і імідж «Нуля», а пачынай рабіць сваё.

Пра веру ў дабро і прагу жыцця спяваў гурт «Кінап», а я са слязою на вейцы (гэта дзеля прыгажосці) успамінаў былыя часы анабіёзу.

Рок-гурт «Хой»! Выступаюць і такія на мясцовых сцэнах. Кіраўнік «Хоя» чытаў Уладзіміра Уладзіміравіча Маякоўскага: «Калі зоры запальваюць, значыць...». І раптам, зусім нечакана, урэзаў: «Я люблю

глядзець, як паміраюць дзеці!». А далей ізноў пра запальванне зорак. Першая рэакцыя... Не пабег біцца, бо скеміў, што кіраўнік «Хоя» сам такі сказ не прыдумае. Выразна, па-вар'яцку рэзка і па-дзікунску футурыстычна... Рэакцыя — я запісаў у нататнік цытату, як пазней высветліў, з Маякоўскага. Але маім запісам не абмежавалася рэакцыя. На сцэну паляцела парожняя пляшка з-пад піва. Яна трапіла ў сцягно аднае з танцорак з так званай пластычнай групы. Нейкі тэмпераментны мараліст не вытрымаў дзікунства і не адчуў, што за танным эпатажам стаіць не кіраўнік Аляксандр Юрчанка, а У. У. Маякоўскі з усім расейска-італьянскім футурызмам, які пазней, незаўважна для У. У., пераплавіўся ў імперскі таталітарызм ад мастацтва. Калі Маякоўскі спахапіўся, было запозна. Драматычна! Карацей, Юрчанка хацеў узрушыць і эпатаваць залу, і ў яго, на жаль, атрымалася. І бутэлька ўзляцела. Разумею, наш час пазначаны квеценню чорнага гумару, але не варта кідаць у залу цытаты, вырваныя з кантэксту, бо зала кіне не толькі парожнюю пляшку. Не трэба множыць правакацыі. Іх і так хапае, без «Хоя».

Лепшыя тэксты, а ўжо казаў, былі ў гурта «Мроя». Вось адзін з іх:

Ён мне сказаў: «Зашмат пагарды
У свеце ні на што не вартым,
Дзе ў паветры гіне слова,
І ад імкненняў — толькі стома».
Ён мне сказаў: «З мяне даволі!»
Сказаў — не вернецца ніколі —
І не спыніць яго хады.
Ды я спакойны, як заўжды.
Ён яшчэ вернецца.
Ён мне сказаў: «Нашто світанак,
Калі штодня адны туманы,
Калі штодня дажджы бясконца.
І ўсё адно не бачна сонца.
Нашто Купала і Скарына,
Калі ўсё роўна ўсё загіне?»
Ды я лічу ўсё гэта жартам,
Бо ведаю яго характар —
Ён яшчэ вернецца.

3.
МЕТАЛ. МЕТАЛ! МЕТАЛ!!!

Чаго-чаго, а «металу» хапала, з верхам было, па самую, як кажуць, плешку. Таму і прапанову ма́ю. Трэба арганізаваць на Беларусі, пажадана дзе-небудзь на ўскрайку — у Гомелі ці Мазыры — фестываль пад назовам «Металаманія» ці, каб не перадзіраць у палякаў, як выйшла ў Віцебску,— «Трэшфанія». Журы патрэбна адпаведнае — жалезнае. І плаціць сябрам журы давядзецца шмат, гэта не салодкагалосая «Юрмала», і малако наліваць... Адзін саліст «Эксгуматара» перараве ўсіх юрмальскіх лаўрэатаў, а яшчэ ж ёсць «Палтэргейст», «Рэй», «Інтарэс», «Радыяцыя», «Анархія», «Механіка»... Карацей, фестываль «па металу» наспеў.

4.
ПЕРСАНІФІКАЦЫЯ, АЛЕ НЕ ТВАРЫ КУМІРА...

Персаніфікацыя ў рок-тусоўцы — працэс аб'ектыўны. Блага гэта ці добра — пытанне рытарычнае. Гэта не мне закарцела зрабіць з Лявона Вольскага («Мроя»)

«Чыстае серабро»

асобу нумар адзін у беларускім року. Яно само так зрабілася. А вось што да антыпода, дык тут несумненна будзе прысутнічаць і суб'ектывізм, бо лічу Аляксандра Юрчанку («Хой») апошнім ці, скажу мякчэй, проціпеглым, ці, калі паэтычна, чорным геніем тутэйшай тусоўкі. Вольскі і Юрчанка проціпеглыя ледзь не па ўсіх параметрах. Калі Лявон спявае выключна па-беларуску, дык Аляксандр — па-беларуску, па-англійску, па-расейску, па-французску, па-шведску. Гэта сягоння ён спявае на гэтых мовах, а заўтра, я ўпэўнены, у спіс дададуцца: мова пячорнага чалавека, эсперанта і іўрыт, ну і, вядома, мова гуманоідаў. А Вольскі будзе спяваць па-беларуску. Далей, калі Лявон выконвае сваю музыку, маленькія калажныя ўстаўкі не ў лік, дык Аляксандр можа і Равэля забалаваць. Калі ў гурце «Мроя» танчыць толькі Вольскі, дык у гурта «Хой» — усе, акрамя Юрчанкі. Калі Лявон максімальна набліжаны да залы, дык Юрчанка хаваецца ў самы далёкі куток на сцэне. Зразумела, пляшку кінулі ўсё ж па ім, а не па танцорцы. Гэта сягоння пляшку, а заўтра могуць... Вось і атрымліваецца, што Лявон Вольскі і Аляксандр Юрчанка — дзве супрацьлеглыя велічыні, два бакі аднаго і таго ж медаля, які завецца беларускі рок. І колькі б Базыль Шугалей (ён, дарэчы, да свайго «Ы-Ы-Ы» працаваў у «Хоі») ні здымаў порткі і ні танчыў ламбаду ў чырвоных майтках, за межы гэтых палюсоў ён не выскачыць, хіба што ў іншы жанр, клаўнаду, напрыклад.

5.
НЕРВЫ. НЕРВЫ! НЕРВЫ!!!

Нервы ляцяць. Што зробіш? На тое і нервы, каб ляцець. Рок-марафоны, у прыватнасці такія, як «Тры колеры-90», вельмі спрыяюць такім улётам.

Першы нервовы эпізод адбыўся з гуртам «Зарціпо». Напярэдадні гурт змяніў склад. І калі хлопцы выйшлі на сцэну, дык ніяк не маглі наладзіць інструменты. А калі накрычалі адзін на аднаго і сыграліся дзве кампазіцыі, адключыўся ўвесь апарат цалкам. Цішыня і ні гу-гу. Я выбег на сцэну і пракрычаў, як змог гучна, што антракт, і можна ісці паліць. Тусоўка пацягнулася на вуліцу, а сябры журы сабраліся ў адміністрацыйным пакоі. І пачалося... «Не ўмеюць наладзіцца — іх праблемы. Хай дома трэніруюцца». «Шкада хлопцаў». «Андрэй Іваноў добры гітарыст, але калі кожнага шкадаваць...». «А я не магу паставіць адзнаку». Прагаласавалі. Гурт «Зарціпо» пасля перапынку сыграў яшчэ горш. Нервы.

Другі зрыў адбыўся з «Бондаю». Іван Маркаў напісаў толькі адну заяўку на ўдзел у фестывалі. А трэба было тры, бо «Бонда» з рок-гурта ператварылася ў студыю, і ў яе ўваходзілі тры каманды: «Бонда-1», «Бонда-2» і «Літл блюз». І большасць сяброў журы адмовілася судзіць «Бонду-2» і «Літл блюз». Крыўдна? Вядома, крыўдна. Але і журы можна зразумець, калі ў праграме 43 выступленні. «Бонда-2» і «Літл блюз» выступалі па-за конкурсам. Выступілі выдатна. «Літлз блюз» — гэта Іван Маркаў у капелюшы і майцы з надісам «Джымі Хендрыкс», гэта блюзы і рок-н-ролы, гэта выдатнае валоданне гітараю, гэта сапраўдны рок. Але па-за конкурсам. У выніку ўся «Бонда» заняла ў першым туры трэцяе месца і адмовілася выступаць, сышла з дыстанцыі. Нервы. Колькі іх трэба?

А якія трэба нервы, каб слухаць і бачыць «Радыяцыю» і «Эксгуматар»? Правільна! Металёвыя! «Радыяцыя» на сцэне, а ў зале мітусня мітусні. Адміністратаркі бегаюць, журы злуецца, фаны радуюцца і вішчаць, святло гарыць. Пажарнік спрабуе нешта крыкнуць, а «Радыяцыя» не можа спыніцца. Дзе-дзе, а ў нас на Беларусі ведаюць, што радыяцыю так вось, на трыпятнаццаць, не спыніш. Абрубілі, нарэшце, апарат. Большасць сяброў журы ўзняло дыктавыя «мухабойкі» з адзнакаю «0», а я паказаў максімальную «10». «Нашто 10»?». «Нашто падтрымліваць вар'яцтва?» Так, але мы не ў палацы «Пажарнік» ці «Адміністратар», мы ў палацы «Юнацтва». Нервы. Іх заўсёды не хапае.

Ну а ў апошні дзень напруга яўна перавысіла ўсе дапушчальныя межы. Каля сцэны сабраўся наэлектрызаваны натоўп, каля сотні чалавек. Хто танчыў, хто крычаў, хто піва піў, хто папіхаўся... Нават выступленне сціплай каманды «Флэт» тры разы перарывалі. Нехта закурыў — святло ў зале. Фан ускараскаўся на сцэну і пачаў поўзаць па-пластунску — у зале ўспыхнула святло. Загарэліся пялёсткі сярнічак — зноў святло і папярэджанні.

Пасля гурта «Флэт» выйшаў гурт «Чыстае срэбра». Фанаў у «Срэбра» хапае, але відавочна, што каманда мала выступае, і саліст Валодзя Зялінскі адпрацаваў толькі на палову сваіх магчымасцей. Склалася пачуццё, што хлопцы «перагарэлі» яшчэ да выхаду. Зала расчаравалася.

А калі пачаў адладжваць інструменты гурт «Ы-Ы-Ы», адбылася гнюсная бойка. Ці то панк наступіў на нагу металісту? Ці то металіст піхнуў панка? Высветліць не ўдалося. Раптам над натоўпам замільгалі кулакі. Іван Іванавіч Паланейчык, самы стары рокер у Мінску,

«Літл блюз»

Л. ВОЛЬСКІ.

А. ЮРЧАНКА.

Ы—Ы—Ы

закрычаў у мікрафон, што спыніць фестываль. Міхал, адміністратар «Мроі», самаахвярна кінуўся ў натоўп і стаў прарывацца да эпіцэнтра. Бойка згасла.

На сцэне з'явіўся Базыль Шугалей з узнятаю над галавой акустычнай гітарай. Базыль бразнуў гітару аб падлогу і завыў у мікрафон: «Ы-ы-ы». Ад гітары засталіся толькі трэскі. Базыль быў п'яны. Па маладосці і нявопытнасці Шугалей перабраў, і перабраў па ўсіх параметрах. Базыль выпіў, каб зняць страх перад выступам, а потым яшчэ дадаў, а гэта дарэмна. Базыль лаяўся па-расейску. Базыль танчыў, як сапраўдны лох, паўтараў адзін і той жа жарт па некалькі разоў, забываўся вершы... Перабраў. Нервы.

Пад час Базылёвага выступу бойка зноў ледзь не ўсчалася. Нейкі, прабачце, слухач выскачыў на сцэну, прабегся па ёй і хацеў ударыць нагою па галаве ворага, але не пацэліў і зляцеў са сцэны. Гэтым і скончылася.

У мяне ад гэтага відовішча прапаў кайф. Рок-фестываль ператварыўся ў калгасны клуб.

Але апошнім выступаў гурт «Мроя», і Вольскі вярнуў добры настрой. А нервы? Нервы не вернеш. Ды Бог з імі.

6.
АДКРЫЦЦІ, БЕЗ ІХ НЕЛЬГА.

Адкрыццё — заўсёдная, будзённая і абавязковая на рок-фестывалі справа. Трэба адкрыць і адкрыем. Гэтым разам адкрылі, знайшлі, убачылі, вылучылі:

а) Новы жанр — рок-блазен — Базыль Шугалей з гуртом «Ы-Ы-Ы», але пра гурт «Ы-Ы-Ы» занадта гучна, ёсць колькі музы́каў, што кепска падыгралі Базылю. А сам Шугалей — адкрыццё.

«Я бубу цябе ў губу.
Ты бубу мяне ў губу.
Я так болей не магу!
Я хачу бубу ў бубу!» —

чытае Базыль і яшчэ танчыць нацыянальныя скокі мінскіх «абарыгенаў» з вуліцы Янкі Маўра. Базыля трэба бачыць. Выбітны блазен, калі не перабірае.

б) Адно адкрыццё не вырашае праблемы. І адкрылі «Флэт», які цалкам класічны. Рок-н-ролы — класічна. Англійская мова — класічна. Піяніна — класічна. Замнога гітар, але тры гітары — класічна, чорт пабірай.

Я, калі слухаў «Флэт», прыдумаў тэрмін — карамельны рок-н-рол. Але Генадзь Рыбцаў і Юра Цыбін, што сядзелі побач, сказалі, нібыта такі тэрмін ёсць. Толькі ён крышку інакш перакладаецца з англійскай мовы — салодкая жавальная гумка. Я заспрачаўся, маўляў, мой тэрмін лепшы, тым больш, «Флэт» — мятная карамель, а не салодкая гумка.

в) Як пачнеш адкрываць, дык і спыніцца цяжка.

Чарговае адкрыццё — рок-гурт «Чыстае срэбра». Крута і ў кайф. Ну проста Амерыка. Бас-гітарыст выбітны, саліст выбітны... Але ёсць і недахоп. Няма ў хлопцаў іміджу, музычныя вобразы не супадаюць з паводзінамі на сцэне. Але гэта прыйдзе.

г) Ну і апошняе адкрыццё — студыя «Бонда».

Найцікавейшай, гэта маё асабістае меркаванне, на фестывалі была кампазіцыя «Як малпы на дрэве» ў выкананні «Бонды-2», дзе за лідэра Ігар Варашкевіч:

...Міліяратар мае моцныя нервы,
Ён пачынае дрэнаж.
А мы сядзім, як малпы на дрэве,
І пазіраем наўсцяж.

А самую кайфовую музыку сыграў «Літл блюз» Івана Маркава.

P. S.
Рокеры ўсіх краін, не біціся!

КРЫНІЦА

БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ КАЛЯНДАР 1990

Ліпень

2/19. П. Юды.
6/23. Пт. Купалле.
7/24. Сб. Іван Купала.
10/27. А. *Сем братоў*. Сямён.
12/29. Ч. Пятро і Павел.
13/30. Пт. Паўпятро.

ЛІПЕНЬ

14/1. Сб. Касьма і Даміян.
17/4. А. Андрэй.
18/5. С. Лампада.
21/8. Сб. Казанская. Пракоп. *Данат*.
23/10. П. Мацвей.
25/12. С. Прокл. *Якуб*.
26/13. Ч. Гаўрылей. Серпавіца. *Ганна*.

Жнівень

1/19. С. Макрыны.
2/20. Ч. Ілля. «Зажынкі».
4/22. Сб. Магдалена.
6/24. П. Барыс і Глеб. *Зельна*.
7/25. А. Ганна.
9/27. Ч. Палікоп. Панцеляймон.
10/28. Пт. *Лаўрын*.
11/29. Сб. Іван Калінавік.
12/30. Н. Іван, Сіла.
13/31. П. Спасаўскія Запускі.

ЖНІВЕНЬ

14/1. А. Макавей, Першы Спас, Медзяны Спас. Спасаўка, Спажын пост (да 28.08).
15/2. С. Базыль. *Прачыста*.
16/3. Ч. *Рох*.
19/6. Н. Яблычны Спас, Другі Спас.
24/11. Пт. *Баўтрамей*.
25/12. Сб. Спасаўскія Дзяды.
28/15. А. Успленне, Першая Прачыстая. Вялікая Спажа, Бабіна лета («маладое» — да 11.09).
29/16. С. Хлебны Спас, Трэці Спас. «Дажынкі». *Ян*.
31/18. Пт. Флор і Лаўр, Конскае свята. Арабінавы дзень.

Верасень

5/23. С. Лупа.
7/25. Пт. Варфаламей.
8/26. Сб. *Меншая Прачыста*.
10/28. П. Мацей.
11/29. А. Галавасек, Іван Крываўнік. Бабіна лета («старое»).

ВЕРАСЕНЬ

14/1. Пт. Сямён. «Жаніцьба коміна». *Узвіжанне*.
19/6. Міхайла. Цуды.
21/8. Пт. Багач, Гаспожка Багатая, Доўгая Прачыста, Другая Спажа.
27/14. Ч. Узвіжанне.
29/16. Сб. *Міхал*.

Кастрычнік

4/21. Ч. *Пранцішак*.
7/24. Н. Зялезная нядзеля.
9/26. А. Іван Шаптун, Багаслоў.
11/28. Ч. Пакроўны бацька.
13/30. Сб. Пакроўцы, Дзяды.

КАСТРЫЧНІК

14/1. Н. Пакрова, Трэцяя Прачыста.
18/5. Ч. Юліян.
20/7. Сб. Сяргей.
24/11. Сб. *Марцін*.
28/15. Н. *Параскева Пятніцкая*.
29/16. П. Логін.
30/17. А. Паклоны.
31/18. С. Лука.

Лістапад

1/19. Ч. *Усе святыя*.
2/20. Пт. *Задушны дзень*.
3/21. Сб. Асяніны, Змітравы Дзяды, Казанскія Дзяды.
8/26. Ч. Зміцер, Хітры дзень.
9/27. Пт. *Тадор*.
10/28. Сб. Параскі.
11/29. Н. Настуся. *Марцін*.
12/30. П. Артошка.

ЛІСТАПАД

14/1. С. Кузьма-Дзям'ян. *Піліпаўскія Запусты* (па 24.12).
17/4. Сб. Міхайлаўскія Дзяды.
21/8. С. Міхайла.
24/11. Сб. Піліпаўскія Дзяды.
25/12. Н. *Кацярыны*.
26/13. П. Іван Залатавус.
27/14. А. Піліп. Канец Мясаеда, Запустаў. Юсціян.
28/15. С. Піліпаўка, Раждественскі пост (да 6.01).
30/17. Пт. *Андрэй*.

Снежань

4/21. А. Увядзенне. *Барбара*.
5/22. С. *Савы*.
6/23. Ч. Матрыхваны.
7/24. Пт. Кацярыны.
9/26. Н. Юр'еў дзень.
13/30. Ч. Андросы, Андрэйкі.

СНЕЖАНЬ

14/1. Пт. Навум.
17/4. П. Варвары.
18/5. А. Савы, Міколін бацька.
19/6. С. Мікола зімовы. Міколь-шчына.
22/9. Сб. Ганны.
24/11. П. *Посная куцця. Каляды*.
25/12. А. *Ражство*.
31/18. П. Мадэст. *Сільвестр. Багатая, шчодрая куцця*.

У «Беларускі народны каляндар» (на I паўгоддзе гл. «Крыніцу« № 1) уключаны паганскія і фальклярызаваныя святы, прысвяткі, некаторыя абрады, што ўпамінаюцца ў народных песнях, прыказках, прыкметах, паданнях. Тут шрыфтам выдзелены даты і назвы месяцаў у новым стылі, а таксама асобныя святы і прысвяткі, якія бытуюць ці бытавалі сярод беларусаў-католікаў. Асноўная частка прадстаўленых каляндарных дзён замацавана за старым стылем.

Алесь ЛОЗКА

Аляксандр ГРАЦКІ

Пасля з'яўлення лонгплэя «Штармавы фронт» Білі Джоэль некалькі месяцаў не напамінаў аб сваім існаванні, бо перанёс цяжкую аперацыю на нырках. І вось нарэшце выйшаў новы сінгл спевака — «Мы не стралялі першыя». Па жанры новая песня Джоэля — рэп, які ўяўляе сабою просты пералік імёнаў, падабраных з газетных паведамленняў па прынцыпе рытмічнасці, ці, як справядліва заўважыла амерыканская прэса,— «кактэйль з імёнаў кіназорак і прэзідэнтаў». Па матывах сінгла плануюцца здымкі відэакліпа.

Амерыканская група «Зі зі топ» пачала працу над новым альбомам.

Пол Макартні, Джордж Харысан і Рынга Стар вырашылі часова зноў папрацаваць разам. Першае сумеснае выступленне адбудзецца сёлета ў Берліне.

У канцы мінулага года ў ЗША выйшла пласцінка «Лесвіца ў неба, дарога ў пекла», з'яўленне якой успрымаецца як лагічны працяг руху «Рок супраць наркотыкаў». На альбоме прадстаўлены кампазіцыі выканаўцаў, якія загінулі ад злоўжывання наркотыкамі і алкагольнымі напоямі. Сярод іх — Джымі Морысан, Джэніс Джоплін, Джымі Хендрыкс...

Уладзімір КУЗЬМІН



Фота Сяргея БАРЫСАВА

Апошняя пласцінка Бруса Спрынгсціна, запісаная па матывах фільмаў жахаў, называецца гэтаксама ж, як і знакамітая стужка гэтага жанру — «Кашмар на вуліцы Вязаў».

Французская пап-група «Ліфт» афіцыйна аб'явіла пра свой распад.

Група «Назарэт», якая нядаўна гастралявала ў СССР, пачала студыйную працу над новым альбомам.

Пасля працяглага канцэртнага турнэ па краінах Заходняй Еўропы ў ЗША вярнуўся Боб Дзілан. Цяпер ён заняты рэдагаваннем сваёй кнігі «Боб Дзілан. Аўтабіяграфія».

Папулярная ў 60-я гады арт-рокавая група «Прокл Харум» аб'явіла аб сваім адраджэнні. Канцэрты групы пачнуцца ўжо сёлета.

Ціна Цёрнар вырашыла закончыць сваю кар'еру рок-спявачкі.

МУЗЫЧНЫ ТЭЛЕТАЙП

Новы альбом запісаў Дэвід Боўі. Ён называецца «Цін Мэшын», таксама, як і гурт, што акампануе Боўі.

Пасля працяглага перапынку вырашыў нагадаць пра сябе і Чэслаў Немэн. Ягоная студыйная праца называецца «Цера Дэфларата».

Якая музыка найбольш папулярная

ў ЧСФР? Адказ на гэтае пытанне дае маладзёжная анкета, якую правяло выданне «Меладзі». Вынікі анкетавання наступныя: самы папулярны пап-выканаўца — Мадона і Майкл Джэксан, пап-гурт — «Піт Шоп Бойз». Згадзіцеся, што гэта вельмі нагадвае вынікі хіт-парадаў «Крыніцы».

Агульны крызіс рок-н-ролу на Захадзе азначыў цікавую тэндэнцыю — адраджэнне некалі папулярных «каманд» 60-х. Следам за «Джэферсан Эйраплэйн» і «Ху» абвясцілі аб сваім адраджэнні «Іст оф Інд» і «Прэці Сінгз».

Супергурт 70-х «Йес», які распаўся пасля 1983 года і зноў адрадзіўся ў 1989-ым, заблытаўся ў судовых працэсах. Частка музыкаў, якая згуртавалася вакол басіста Крыса Скваера, здолела захаваць стары назоў, а вось вакаліст і ідэйны натхняльнік ранейшых «Йес» Ян Андэрсан быў вымушаны назваць свой гурт «Андэрсан, Брэфард, Уайкмэн, Хаў». Хто з гэтых гуртоў «сапраўдныя» «Йес», вырашаецца ў судовых установах.

Ва ўзросце 44-х гадоў памёр гітарыст Джон Сцюарт, які ў свой час супрацоўнічаў з Элтанам Джонам.

Музычная імпрэза «Дапамога Румыніі» адбылася ў Лондане. У гэтым дабрачынным канцэрце бралі ўдзел майстры класічнай музыкі Вялікабрытаніі.

Над новым альбомам пачалі працаваць «Спрынгфілд Бойз». Нагадаю, што музычныя арыенціры «спрынгфілдскіх хлапцоў» (а менавіта так перакладаецца назва гурта) — старыя рок-н-ролы накшталт Чака Бэры і Хэйлі.

Забойца Джона Ленана — Марк Дэвід Чэпман, якога лекары не прызналі вар'ятам,— выйшаў на волю. Цяпер Чэпман займаецца рок-н-ролам і нават выпусціў сваю першую пласцінку.

Спорт і музычны бізнес часта ідуць зусім побач. Калі брытанскі футбольны клуб «Тотэнхэм» стаў чэмпіёнам, футбалісты вырашылі адзначыць гэтую падзею выпускам пласцінкі з запісамі сваіх песень. Дыск, зрэшты, не трапіў нават на апошнія месцы ў хіт-парадах, як і дыск другога спартоўца — «Сучасны мужчына» амерыканскага лёгкаатлета Карла Льюіса. Дарэчы, апошні цвёрда вырашыў пасля заканчэння спартыўнай кар'еры займацца спевамі. Такое ўжо здаралася — напрыклад, знакаміты грузінскі спявак Зураб Саткілава раней выступаў абаронцам у камандзе «Дынама» Тбілісі.

Падрыхтаваў
Уладзімір КВЯТКОВІЧ.

Гурт «Кіс»

Озі Осбарн

Майкл Джэксан

Фота Васіля ЦІТОВА
і Генадзя КАРЧЭЎСКАГА





Аляксей АНДРЭЕЎ

ПРА «НАРМАЛЬНЫХ ЛЮДЗЕЙ» І ЦЯГНІКІ, ЯКІЯ ІДУЦЬ НА ЧЫРВОНАЕ СВЯТЛО

У маленькім кабінеце, які так нялёгка знайсці ў лабірынтах «Беларусьфільма», я некалькі гадзін гаварыў з Ігарам Віктаравічам Волчакам — чалавекам, што, як і ўсе прафесіяналы, называе мультыплікацыю анімацыйным кіно і служыць яму самааддана, самаахвярна.

Мы гаварылі з ім пра тое, што савецкія майстры, такія, як Ю. Б. Нарштэйн і Ф. С. Хітрук, вядомыя далёка за межамі краіны, што мультыплікацыя сёння здольная вырашаць задачы не менш складаныя, чым іграваe кіно... Зрэшты, гаварыў Ігар Віктаравіч. А я спяшаўся запісваць за ім і думаў пра ягоны фільм, які некалькі гадзін таму назад глядзеў у адной з дэманстрацыйных залаў студыі.

Ён называецца «Капрычыо». Непрысвечаным у таямніцы вялікае музыкі прыходзіць даведку з энцыклапедычнага слоўніка, да якога (што ўтойваць) прыйшлося звярнуцца самому: «Капрычыо — віртуозная інструментальная п'еса імправізацыйнага складу з вычварнай зменаю эпізодаў і настрояў». Мы прызвычаіліся да таго, што мультыплікацыйнае кіно — гэта заўсёды дзіцячая казка ці забаўны комікс для дарослых. «Капрычыо» — філасофскі роздум мастака пра жыццё. Жыццё, якое, нібыта хуткі цягнік, нясецца ў невядомую далячынь. Нясецца часам на чырвонае святло. І ў кожным купэ гэтага цягніка, як у ячэйках памяці, жывуць успаміны пра дні мінулыя, якія ўжо ніколі не вернуцца да нас,— і таму яны здаюцца нам такімі цудоўнымі. Успаміны гэтыя, часам пакутлівыя, дапамагаюць нам у цяжкую хвіліну набыць надзею, што, як цудоўная яблыня, вырастае ў цёмным пакоі звычайнае будзённасці.

Фільм журботны і надзіва прыгожы. Прыгожы някідкай каляровай гамаю, створанай мастаком Аляксандрам Верашчагіным, музыкаю, што напаўняе карціну. На 5-м сусветным фестывалі анімацыйнага кіно ў Варне «Капрычыо» атрымаў першы прыз, на 36-ым Міжнародным фестывалі ў Мангейме — «Залаты Дукат». І яшчэ восем дыпломаў і прызоў рэспубліканскіх і саюзных конкурсаў. У 1989 годзе гэты фільм разам з работамі Ю. Б. Нарштэйна і Ф. С. Хітрука дэманстраваўся ў Музеі сучаснага мастацтва ў ЗША.

Сёння яго глядзяць больш чым у ста краінах свету. А што ж мы? Ці ведаюць нашыя гледачы пра творчасць рэжысёра, імя якога разам з імёнамі такіх прызнаных майстроў, як Джон Халас і Фрэдэрык Бак, уключана ў міжнародныя каталогі анімацыйнага кіно?..

Уявіце сабе, ведаюць. Сведчанне таму — лісты, атрыманыя Ігарам Віктаравічам пасля прэм'еры «Капрычыо»:

«Дзень добры, таленавіцейшыя стваральнікі мультфільма «Капрычыо». Яго, як на думку нашага калектыву з дзвюхсот чалавек, лепей за ўсё трэба было б назваць «Трызненне вар'ята», якраз адпавядае.

Што вы ствараеце? Які шызафрэнік яго зґатаваў? Вы што, людзей за дурняў лічыце? Дзе ў вас сумленне? Ці вы развучыліся разумець, што прыгожа, а што пэцканіна? За што вы грошы атрымліваеце? Калі ў вас няма мастацкага таленту, дык ідзіце працаваць туды, дзе ён не патрэбны.

*Але мы — **людзі нармальныя** (тут і далей вылучана мною — А. А.) і не хочам глядзець вынікі вашай шызафрэніі. Перастаньце здзеквацца з мастацтва! Калектыў медработнікаў, г. Ташкент».*

«Паважаныя Волчак і Верашчагін!

Вашыя мультфільмы глядзець без абурэння немагчыма. Ну каму патрэбна такое страхоцце? Ні прыгажосці, ні эстэтыкі, проста нейкія эксперыменты са з'яўленнем і знікненнем карцінкі. Гэта проста насмешкі з мастацтва і жывапісу.

*Чацвёра дарослых людзей, **досыць інтэлігентных**, прыйшлі да адзінае высновы: абсурд. Гэта бяздарна і нікому не трэба. Не марнуйце дзяржаўныя грошы і людскія нервы. Вытрымліваць такую лухту, страхоцце — немагчыма.*

Калі вы не перастанеце эксперыментаваць і выпускаць такія фільмы, мы будзем проста вымушаны скардзіцца на вас.

Мастак, лётчык, актрыса, інжынер, г. Грозны.

*P. S. Думаем, што з намі салідарныя ўсе **нармальныя** людзі».*

Вось так. Да болю знаёмыя фармуліроўкі і меркаванні, у якіх я наўмысна не змяніў аніводнага слова. Якія падобныя адно да аднаго аўтары гэтых лістоў — «нармальныя, досыць інтэлігентныя людзі...»

Калі неразуменне перарастае ў непрыняцце, яно робіцца агрэсіўным. Памножанае на дэфіцыт унутранае культуры — сацыяльна небяспечным. І вось ужо згадвае нехта пра дзяржаўныя грошы і, шчодра раскідваючыся абразамі, пагражае скаргамі ў адпаведныя інстанцыі. Але ж усё гэта ўжо было! Няўжо нічога не змянілася з тае пары? Не вакол, а ў нас саміх?

Бог з імі, з аўтарамі гэтых лістоў. Відаць, усе мы сёння, выхаваныя на шэдэўрах сацыялістычнага рэалізму,— «нармальныя і досыць інтэлігентныя людзі». Усіх нас прывучылі задавальняцца малым не толькі ў матэрыяльным, але і ў духоўным жыцці. І не жадаючы працаваць душою, мы ўсе часцей выбіраем не складанае, а простае, не вечнае, а часовае, дробнае. І ўсе мы пры выпадку дужа лёгка кусаем таго, хто не жадае весяліцца на свяце ўсеагульнае бездухоўнасці і пошласці. Не балюча ўкусіць (час не той), але так, каб памятаў, хто заказвае музыку.

Сёння сярод нас яшчэ жывуць людзі, у якіх хапае мужнасці адстойваць права на ўласнае бачанне свету. І калі ў іх не хапае сілы працаваць заўтра, дык якія ж каштоўнасці ўзводзім мы тады ў катэгорыю вечных? Няўжо агульнадаступныя, створаныя на патрэбу «досыць інтэлігентных людзей»?

Не пра гэта я хацей пісаць, ідучы з «Беларусьфільма». Я хацеў расказаць пра тое, што, стаўшы мастацкім кіраўніком студыі мультыплікацыйных фільмаў, Ігар Віктаравіч Волчак поўны новых задум і планаў. Што ягоная «Муха» атрымала Гран-пры на фестывалі «Міні-Макс» у Польшчы. Што апошні фільм, «Канчэрта гроса», адзначаны двума дыпломамі на Рэспубліканскім аглядзе-конкурсе, рыхтуецца да паказу на ўсесаюзных і міжнародных фестывалях. Што над новай карцінаю разам з ім працуюць цудоўныя маладыя хлопцы і дзяўчаты, вучні якіх таямніцам майстэрства прыязджаюць лепшыя аніматары з Масквы. Я хацеў расказаць пра тое, што ў сутарэнні свайго дома ён літаральна з нічога стварыў дзіцячую студыю мультыплікацыі, а сёння не можа працаваць з маленькімі мастакамі з-за адсутнасці здымачнае камеры. Але ці трэба пісаць пра гэта, калі ў праекце дакумента ЦК КПБ аб развіцці нацыянальнага кінематографа мультыплікацыйнае кіно нават не згадваецца? Дый не ў мультыплікацыі, урэшце, справа.

Напэўна, жыццё кожнага сапраўднага мастака — гэта цягнік, які ідзе на чырвонае святло нашага неразумення і абыякавасці, і калі сёння ў цёмных пакоях звычайнае будзённасці пакуль яшчэ вырастаюць яблыні надзеі, дык заўтра... Што будзе заўтра?

Максім ГІЛЕВІЧ

ВЫВАДНЫ

Цяжка грукаючы ботамі аб асфальт і бразгаючы зброяй, скакалі мы з кузава ЗІЛа ў двары ваеннай камендатуры. Мы — гэта тузін салдатаў і сяржантаў, прызначаных несці службу ў гарнізонным каравуле, інакш кажучы, суткі вартаваць — з аўтаматамі, зараджанымі баявымі патронамі — хлопцаў, што мелі няшчасце трапіць на «губу».

Гэта быў мой першы гэткі нарад, таму, зразумела, пазіраў я на ўсё зацікаўленымі вачамі, хоць служыў не першы месяц і меў на пагонах сяржанцкія лычкі.

Пастроіўшыся ў калону па двое, рушылі мы да маленькай жалезнай брамкі з прыварanай да яе чырвонай зорачкай. Брамка гэтая толькі і парушала цэласнасць, важкую маналітнасць трохмятровай сцяны, абнесенай зверху калючым дротам...

— Раўняйсь!.. Адставіць... Раўняйсь!.. Адставіць... Раўняйсь!.. Смірна!.. Напра-ва! Шагам... Адставіць... Бягом... марш!

Па камандзе начкара, маладога лейтэнанта, «губары» кінуліся ў сталоўку — камеру з доўгім сталом і лавамі ўздоўж яго. Пахапаўшы лыжкі, яны дружна замалацілі імі па талерках, бо тут не да жартаў, калі на вячэру — усяго тры хвіліны! Больш вопытныя, хуценька абсмактаўшы рыбіныя хрыбціны, цішком хавалі хлеб у кішэню, кідалі ў рот цэлую шайбачку масла, бо намазаць яго на лустачку і з'есці часу няма, прагна хлябталі халодны чай...

— Устаць!.. Адставіць... Устаць!.. Адставіць... Устаць!.. Адставіць... Устаць!.. На выхад бягом... марш!

Кінуўшы журботны позірк на нечапаную кашу, на цэлыя і сяк-так намазаныя на хлеб шайбаччкі масла, хлопцы пабеглі гулкім калідорам на выхад — на плац.

— Ты забяры пакуль посуд у адзіночак!

Гэта лейтэнант кінуў мне, вывадному.

— Кухар, да мяне з падносам! — чамусьці не кажу, а крычу я на ўвесь калідор.

Калі хлопец з падносам падбягае да мяне, я адмыкаю замок, адсоўваю засаўку і грукаю прыкладам аўтамата ў жалезныя дзверы камеры:

— Адчыняй!

Наваліўшыся ўсім целам, арыштаваны прыадчыняе тугія і цяжкія дзверы адзіночкі. Кухар забірае посуд. Я нагою зачыняю дзверы, нагою ж штурхаю засаўку, вешаю замок.

— Адчыняй!

Абышоўшы ўсіх, падаюся на плац. Сыплецца нудны, нейкі зусім не летні дождж-імжака. Начкар праводзіць на плацу абавязковую па распарадку дня вячэрнюю прагулку.

— Раз, раз, раз!.. Раз, два, тры!.. Вышэй нагу!.. Яшчэ вышэй!.. Вышэй... Вышэй... Стой! Селі!..

«Губары» прыселі на кукішкі.

— Пайшлі!

Валюхаючыся збоку набок, жывая змейка рушыла вакол плаца. Пасля аднаго круга сёй-той не вытрымаў, выпрастаўся.

— Сесці! Добрае практыкаванне для накачкі ног! Селі!..

— Не магу больш, таварыш лейтэнант! — узмаліўся хударлявы хлопец з блакітнымі пагонамі ВВС на плячах.

— Устаць! Лётчык, два крокі наперад! К бою!

Па гэтай камандзе трэба ўпасці долу, прыціснуцца да зямлі. Упасці там, дзе стаіш — у лужыну, на мокрую траву.

— Ты кепска зразумеў?! Дабавіць табе пару сутак? К бою!

Хлопец, як падкошаны, упаў долу.

— Наперад!

Калі «лётчык» прапоўз па пластунску метраў пяцьдзесят, лейтэнант дазволіў яму стаць у строй.

— Бягом марш!..— скамандаваў ён. А мне цераз плячо кінуў: — Схадзі, адамкні нары.

Нары днём прымкнёны да сцяны, каб нікому не ўздумалася прыдрамнуць на іх. Мера, мне падалося, лішняя, бо ўдзень, ад пад'ёму да адбою, у памяшканні гаўптвахты, акрамя адзіночак, нікога не бывае — усе ці на работах, ці на плацу.

Адмыкаю нары, выдаю шынялі — замест матраца, коўдры і падушкі. Замыкаю камеры. Усё. Палова адзінаццатай. Да пяці нуль-нуль хлопцы могуць паспаць...

— Азізаў вешаецца! — ажыў у дзве гадзіны ночы селектар у каравулцы. Разам з каравульным вольнай змены куляй імчуся на «губу». Разумею, што гэта хутчэй за ўсё «ўводная», але дзейнічаць па ёй трэба так, быццам і сапраўды «вешаецца» ў другой камеры «адзіночка» Азізаў.

Зазірнуўшы ў «вочка» ярка асветленай і ўначы камеры, бачу, што Азізаў салодка спіць, скруціўшыся пад шынялём на сваім ложку — фанерным шчыце. Бразгнуў замок, грымнулі дзверы. Заходзім з каравульным у камеру. Двум тут ледзь павярнуцца. Шурпатыя бетон-

ныя сцены, такая ж бетонная падлога, прывінчаная да яе табурэтка, увінчаны ў сцяну столік, высока пад столлю — малюсенькае, як у шпакоўні, вакенца.

— Азізаў, пад'ём! Пад'ём, трывога! Ты чаго, недавярак, вешаешся? — накінуліся мы на соннага штрафніка, які, прахапіўшыся, неўразумела лыпае на нас вачамі.— Глядзі ў нас! Вешацца яму закарцела!.. Ладна, адбой! Спаць!..

— Усё ў парадку, Азізава ўратавалі,— дакладваю дзяжурнаму па каравулах...

Раніцай на агляд завітаў камендант гарнізона, падпалкоўнік. Угледзеў у час ранішняга агляду, што ў аднаго салдата адарваўся аплік.

— Дзе аплік, таварыш салдат? — Бедалага-салдат стаіць навыцяжку, маўчыць, прыціскае падбародак, хавае ім каўнерык «хэбэшкі», ад якога адарваўся аплічок.— Дзе, пытаюся? — Не адступаецца падпалкоўнік.— Трое сутак дабаўкі!

— Таварыш падпал...

— Маўчаць! За пярэчанне — яшчэ пяць сутак! Усяго — восем! Ясна табе?

— Так точна!

— Сяржант! — гэта мне.— Займіся з імі страявой!

Займаюся. Падпалкоўнік, паглядзеўшы колькі хвілін, як я ганяю «губароў» па плацу, крычыць:

— Сяржант! Што ты з імі цырымонішся? Ці сам хочаш да іх? Увечары пасаджу! А ну, прымусь хадзіць, як след!

Што зробіш! Крычу:

— Вышэй нагу! Вышэй! Трыццаць сантыметраў ад зямлі! Вышэй! — І не стрымліваюся, паўтараю чутае ад лейтэнанта: — Ці поўзаць захацелася?!

Падпалкоўнік ухвальна ківае галавой, пасля загадвае:

— Сяржант, бяры аднаго і каб праз пятнаццаць хвілін калідоры ў камендатуры блішчэлі. Праверу! Заданне зразумеў?

— Так точна!

Тыцнуў пальцам у бліжэйшага «губара»:

— Са мной! Бяры вядро, анучу, набірай вады...

Прывёў хлопца ў камендатуру, загадаў:

— Давай, не размагнічвайся!

Мой падапечны мочыць у вядры анучу, накідвае яе на швабру, вэцгае па падлозе. Робіць усё хутчэй, спрытней, чым звычайна, чым прызвычаіліся мы рабіць тое самае ў казарме, толькі мне чамусьці здаецца, што ён марудзіць. Падганяю:

— Хутчэй! Чаго спіш на хаду?!

Хлопец адгыркваецца:

— Не ўкалваю хіба?

— Што?! Прыклада пачаставаць захацеў?!

«Губар» зноў штосьці бурчыць, хоць і ціха, сабе пад нос.

— Не зразумеў?! — крычу я ўжо са злосцю. І дэманстратыўна здымаю з пляча аўтамат. Бачу: анучу хутчэй запоўзала па падлозе, хлопец заварушыўся.— Вось так! Бачна, што зразумеў! — З адчуваннем выкананай справы закідваю аўтамат за плячо...

Потым — зноў плац.

— Хутчэй!..

— Вышэй!..

— Бягом!..

— Наперад!..

— К бою!..

— Давай!..

— Сесці!.. Устаць!..

— Смірна!.. Адставіць!..

«КАЗА»

Ён стаяў на прыступках ганку і аглядаў вуліцу. Стаяў расслаблена, прыхаліўшыся плечуком да вушака, глыбока засунуўшы рукі ў кішэні. Зрэшты, ён не проста стаяў. Наслухаўшыся аповядаў, ён таксама выйшаў на ганак «папасвіць коз».

— Гэй, чарнявая, колькі там націкала?

Калі «чарнявая» адказвала і пры гэтым прыспешвала хаду, гэта была не «каза». «Каза» павінна прыпыніцца і ветліва пасміхнуцца.

— Гэй, бялявая-кучаравая, колькі націкала на тваім залатым?

Пасля некалькіх няўдалых спроб «каза» ўрэшце выяўляе сябе.

— Палова дзевятай. А што сам гадзінніка не маеш?

— Ды каб не бачыць, як марудна час да дэмбеля сунецца. Так марудна, што хоць воўкам вый. Тым больш, што нават пагаварыць няма з кім. Ніводнай знаёмай ва ўсім горадзе!

— Што ж гэтак?

— Ды так... Не знаходзіў такой, як ты, скажам,— шырока і ласкава ўсміхнуўся ён.— І вось, здаецца, знайшоў... Напаткаў... Не надта спяшаешся?

Пачынаўся другі этап праверкі на «казістасць».

— Куды мне спяшацца... Усё роўна адной у хаце сядзець.

Усё ішло, сапраўды, так, як і расказвалі хлопцы. Як па неаднаразова адыгранаму сцэнарыю. Яшчэ колькі слоўкамплімептаў, яшчэ хвіліна-другая вось такой пустапарожняй балбатні, і ён запрасіў яе на КПП — маўляў, там, у памяшканні, цяплей, чым тут, на вуліцы, на гэтым студзёным ранневясновым скразнячку.

«А яна, здаецца, нават і нішчык,— падумаў, прапускаючы яе папарадзе сябе, адчыняючы перад ёю дзверы ў пакойчык для адпачынку сутачнага наряду.— Ва ўсякім разе, пазабаўляцца можна».

Яны прыселі на канапку. Балбатаць, зубаскаліць вось так з ёю яму не хацелася ані троху. Карцела праверыць, ці праўду казалі хлопцы пра ўсё астатняе. Хутка яго рука апынулася ў яе на плячы. Варухнулася яна, быццам жадаючы скінуць з пляча ягоную руку, толькі на імгненне, тут жа сцішылася. Тады ён зазірнуў ёй у вочы і наблізіўся да яе твара сваім тварам. Вусны яе здрыганулiся, ажылі ў сарамлівай усмешцы, адкрыўшы радок верхніх — роўненькіх і беленькіх — зубоў. Ён нахіліўся над ёю яшчэ бліжэй і дакрануўся сваімі вуснамі да яе вуснаў...

— Божачкі, я зусім трачу розум,— аддыхаўшыся трошкі, яна спрабавала працягваць гульню. Але ён ужо не зважаў на гэта.

— Табе, здаецца, душна. Давай сюды куртачку.

— Ага, душна,— адказала яна і скінула куртачку, павесіла яе на цвічок на сцяне.

Ён перахапіў «казу», пасадзіў на канапку, зноў упіўся ў яе вусны, завальваючы дзяўчыну на спіну. «Каза», дай веры, не супраціўлялася. Яе рукі спляліся ў яго на патыліцы, яе пальцы ласкава і патрабавальна церабілі, перабіралі ягоныя валасы. А сама яна дыхала яму ў шыю:

— Салдацік мой, мілы мой... Харошы ты мой... Я цябе адразу прыкмеціла...

Рукі яго пачалі слізгаць, лапаць па ёй, расшпільваючы гузічкі блузкі, пабеглі ніжэй, да маланкі на джынсавай спаднічцы...

— Ах ты, свавольнік... Ну што ты... Родны ты мой...

«Родны... Бач ты, родны...» Ён не сказаў гэтых слоў. Ён прамовіў іх моўчкі. І штосьці як здарылася з ім. Яго быццам токам пранізала. «Родны... Бач ты яе, родны...» Раптоўна ўбачыў перад сабою вочы той, з кім развітваўся ў апошні вечар на Нямізе. Раптоўна зноў, як і тады, пачуў яе словы: «Родны мой»...

Ён страсянуў галавой, быццам скідваючы з сябе набеглае ачмурэнне, грэбліва ўсміхнуўся. «Родны мой... Ні менш, ні больш — родны!.. Гэтая падла паспела мяне ўжо ў радню залічыць!..» Імгненна ацверазелымі вачамі зірнуў ён на яе, ужо амаль раздзетую ім. Яна не бачыла ягонай усмешкі, ляжала перад ім з заплюшчанымі вачамі ў ціхім, нецярплівым чаканні.

— Ну што ж ты?..— шапнула, па-ранейшаму не расплюшчваючы вачэй.

Ён замест адказу шпурнуў ёй у твар блузку, закрычаў:

— Чаго разлеглася, карова?! Брысь адсюль!

Яна падхапілася, цапом-лапом апраналася — зашпільвалася, зашморгвалася. Ён не стрываў, падштурхнуў яе да дзвярэй:

— Жывей! Брысь адсюль, спідола!

Ля дзвярэй «каза» раптам падняла «рогі»:

— Чаго штурхаешся, ты?! Таксама мне...

На шум прыбеглі хлопцы-днявальныя, ягоныя сяброукі. Убачыўшы ўскудлачаную «казу», весела зарагаталі. Яна ўгледзела ў гэтым добры знак і асмялела:

— Штурхаецца яшчэ! Прыйшлі во сапраўдныя хлопцы, а не...

Ён падышоў да яе, павярнуў тварам да дзвярэй і моцна-такі даў ёй выспятка каленам пад зад. Яна, пэўна, балюча ўдарылася аб дзверы, бо залямантавала:

— Бандыт!.. Ідыёт!.. Імпатэнт!..

Ён ірвануўся зрабіць тое яшчэ раз, але яго стрымалі сяброукі, прыкрыкнуўшы на яе:

— Знікні з вачэй! Есць і няма!

А ён, вызваляючыся з іхніх рук, раптам зарагатаў. Хлопцы, гледзячы на яго, таксама зарагаталі.

А пасля ён зноў выйшаў на ганак. Пачынала цямнець. Вясновы сцюдзёны ветрык прыемна халадзіў твар, грудзі, і гэта супакойвала. Выцягнуўшы з кішэні пакамячаны пачак «Прымы», ён прагна закурыў.

Ён глядзеў туды, дзе быў вакзал, дзе зырка свяцілі пражэктары на ажурных металічных апорах, дзе перагуквaліся гудкамі цеплавозы і гулка бразгалі-грукалі сталёвымі счэпамі вагоны. Адтуль, з вакзала, штодня выпраўляўся напроці начы цягнік і ў яго родны Мінск...

Салдацкі нататнік

СЁЕ-ТОЕ ПРА «ГЭТА»...

Мы доўга ламаем пікі, спрачаючыся, ці патрэбная нам «сексуальная рэвалюцыя». І тым часам, калі адны прыводзяць свой аргумент «за», зыходзячы з вопыту «квітнеючага» Захаду, іншыя выстаўляюць контраргументы «супраць», абапіраючыся на той самы Захад, але ўжо «загніваючы». А між тым шпаркія кааператары і іншыя дзялкі лёгкае нажывы хутка наладзілі продаж розных секс-календароў, эратычных плакатаў і буклетаў, фатаграфій. Ужо прайшла ў Мінску (дый ці толькі тут) першая эратычная фотавыстава, пра якую вельмі ўхвальна выказаліся многія газеты. Адны наракаюць на марудлівасць ураду ў вырашэнні пытання стварэння і ўзаконьвання публічных дамоў, іншыя раз'юшваюцца з нагоды разгорнутай у краіне кампаніі прапаганды сексу і, у сувязі з гэтым, павышэння небяспекі заражэння на СНІД.

Мы ўжо, памятаю, спрабавалі змагацца з п'янствам, з самагонаварэннем, уводзячы розныя ўказы і абмежаванні, а ўся кампанія вылілася ўсяго толькі ў павышэнне цэн на спіртныя напоі. Да таго ж, была створана ўрадлівая глеба для ўзрастання колькасці наркаманаў і з'яўлення такой пачварнай з'явы, як таксікаманія. Я ўжо не кажу пра тое, якія выгоды атрымалі ад гэтай самай «барацьбы» ўладальнікі падпольных «хмельных агрэгатаў».

Сёння тое ж самае мае месца і ў дачыненні да прастытуцыі, аднае з устойлівых сацыяльных з'яў, якія існавалі не толькі недзе там, за мяжою, але і ў нас у краіне. І калі многія думалі і думаюць, што з перамогаю Кастрычніцкай рэвалюцыі мы канчаткова ліквідавалі гэтую з'яву, то яны глыбока памыляюцца. Так, мы гучна дэкларавалі, што прастытуцыі ў нас няма. Але ж гэта было афіцыйна. А на самай справе, і публікацыі апошніх гадоў пацвярджаюць гэта, прастытуцыя па-ранейшаму існавала, праўда, перамяніўшы трохі аблічча і прытаіўшыся ў падполлі.

Хіба нельга назваць прастытуцыяй працу «дзяўчынак» з НКУС, якіх падкладвалі ў ложкі замежных паслоў, прадаючы пад сцягам «дзяржаўнай бяспекі»? А існаванне самых розных рангаў падпольных публічных дамоў? А чым, калі не прытонамі, можна назваць нядаўнія абкомаўскія «лазенькі», дзе ў адкрытую займаліся любоўю партыйныя апаратчыкі самых высокіх рангаў? Не лепшыя справы былі і ў камсамоле. Праўда, плацілі тады не грашыма, а ўсё больш прасоўваннем па службе ды павялічваннем зарплаты — карацей, задавальненне за дзяржаўны кошт. Разам з тым улады, усё роўна як сярэдневяковыя інквізітары, закрывалі вочы на існаванне «інтэрдзяўчынак», якія шукалі ў гатэлях «Інтурыста» кліентаў. З перабудоваю пра ўсё гэта, ведама ж, загаварылі. А дзяўчатам, якія прадаюць сваё цела за грошы, нават выдумалі рамантычную назву «путана» і аднеслі да груп павышанай рызыкі. Але чамусьці замоўчвалі адно: пакуль будзе існаваць цяжкая, дрэнна аплачваемая жаночая праца, пакуль будуць існаваць нізкія расцэнкі працы, у нас не паменее ахвотніц жыць салодкім, раскошным, не дужа клапатлівым жыццём. Так што гэтая праблема не толькі маральная, як мяркуюць некаторыя.

І яшчэ: да тае пары, пакуль будзе існаваць попыт, будзе і прапанова. Можна забараніць прастытуцыю законам, можна нават праследаваць за яе, але забараніць жанчыну, якая жадае добра жыць, няхай нават прадаючы дзеля гэтага ўласнае цела, нельга. Можа, сапраўды, узаконіць гэтую з'яву, падвёўшы пад яе юрыдычную аснову? Дзяржава зможа атрымліваць не толькі даход (прычым і ў валюце таксама, як яна атрымлівае яго з продажу алкагольных напояў), але і паставіць гэтую справу пад кантроль, што ў сваю чаргу зменшыць небяспеку заражэння на венерычныя захворванні ды СНІД (у друку ўжо паведамлялася пра вынайдзены сродак, з дапамогаю якога можна вызначыць наяўнасць віруса ў крыві хворага на працягу дзесяці хвілін), а таксама зменшыць колькасць згвалтаванняў, асабліва сярод моладзі.

Аднак «сексуальны бум» уключае ў сябе не толькі рашэнне гэтае праблемы, дакладней, не столькі яе рашэнне. Пра тое, які нізкі ўзровень полавага выхавання не толькі моладзі, але і старэйшага пакалення, казаць не прыходзіцца. А між тым, на прылаўках магазінаў няма ніводнае кнігі аб полавым выхаванні і правільным вядзенні полавага жыцця, ды і ў школах, здаецца, не збіраюцца ўводзіць адпаведнай дысцыпліны, нават на факультатыўных пачатках. А трэба было б. Замест гэтага нашая сістэма аховы здароўя спрабуе процістаяць СНІДу адсутнасцю прэзерватываў у аптэках ці мізэрнымі партыямі імпартнай прадукцыі па вельмі «сціплых» цэнах (а куды дзецца: сваіх альбо няма, альбо ўсе спрэс бракаваныя). А потым дарослыя дружна засмучаюцца нявыхаванасцю моладзі, у жаху вытрэшчваюць вочы, чытаючы пра чарговы выпадак цяжарнасці школьніцы. Пра якое выхаванне можа ісці гаворка (маецца на ўвазе выхаванне полавае), калі нават дарослы пажылы чалавек, пачуўшы пра «дзікія пляжы» на Захадзе, толькі і змог прамовіць адну-адзінюткую фразу: «Голыя мужчыны.., голыя жанчыны...— хворыя людзі!» А па-мойму, хворыя не яны, а мы, і хворыя даўно, калі выгляд голага жаночага цела выклікае ў нас толькі адно біялагічнае пачуццё, а лекцыі на падобныя тэмы — кплівыя ўсмешкі.

А тым часам спрытныя кааператары працягваюць збываць сваю прадукцыю, у газетах па-ранейшаму праводзяцца конкурсы «Міс фотаэротыка», усюды наладжваюць розныя фотавыставы, якія дэманструюць юных прыгажунь у касцюмах Евы... Прывяду выказванне вядомага полькага сексолага Казіміра Імялінскага з ягонай кнігі «Псіхагігіена полавага жыцця»: «Шматлікія папулярныя часопісы, іншыя ілюстраваныя выданні змяшчаюць мноства фатаграфій, часцей за ўсё кінаактрыс, знятых паўголымі і ў «двухсэнсоўных» позах. І хоць прынята гаварыць і пісаць, што мэта гэтых ілюстрацый — даць магчымасць чытачу спазнаць прыгажосць чалавечага цела, яны, без усялякага сумнення, з'яўляюцца для многіх сексуальным узбуджальнікам. Не прыходзіцца таксама сумнявацца і ў тым, што менавіта такія фатаграфіі спрыяюць павелічэнню попыту на ўсе гэтыя матэрыялы... Шкоднасць гэтага патоку эратычнага «мастацтва» відавочная. Эратызм, якім патыхае кожны другі ілюстраваны часопіс на Захадзе, што выстаўляецца ў кіёсках і вітрынах магазінаў, кадры фільмаў і г. д., міжволі скіроўваюць фантазію чытача і гледача ў сферу сексу. Пры гэтым вядома, што калі назіранне голага цела ў будзённым жыцці, напрыклад, на спартыўных спаборніцтвах, на пляжы і г. д., прытупляе сексуальную накіраванасць фантазіі, то аголенае цела на фатаграфіях яго ўзбуджае».

Відавочна, працягваючы несці такім чынам полавае выхаванне ў масы, мы толькі марнуем час. Вядома, неразумна было б прапаведваць пурытанскі лад жыцця, як мы спрабавалі рабіць раней. Але і гаворачы пра адваротнае, важна захоўваць пачуццё меры, не перанасычаць людзей падобнымі карцінкамі. Таму вырашаць праблему сексу ў нашай краіне трэба не па кавалачках, а цалкам і накіравана, перш за ўсё прыслухоўваючыся да думкі спецыялістаў і вывучаючы вопыт іншых дзяржаў, не адрэчваючы ўсё агулам, а стараючыся не паўтараць чужых памылак.

Алег ЗАЙЦАЎ,
студэнт БДУ

Аціла БАДЗЬЁНІ

КАХАННЕ

АД АБУДЖЭННЯ ДА ГАРМОНІІ

(фрагменты з кнігі) *



И. Савченко '90

1. БАЦЬКІ І ПОЛАВАЕ ВЫХАВАННЕ

У грамадскай свядомасці распаўсюджана фальшывае і містыфікаванае ўяўленне аб каханні як аб нейкім стане з божай ласкі. Згодна з такім уяўленнем існуе каханне аднаго кшталту — каханне, з якім чалавек альбо сустрэнецца, альбо не, каханне, здольнае ўсё вырашыць і ўсё апраўдаць. Пажадана ўжо ў працэсе выхавання моладзі разбурыць гэты фальшывы, рамантычны вобраз кахання і паказаць яго шматаблічнасць, прычым кожны вобраз засноўваецца на індывідуальных патрэбах, а яго ўзровень вызначаецца ступенню развіцця асобы. Пра сапраўднае каханне, натуральна, можна гаварыць толькі пасля полавага выспявання.

Менавіта гэтая шматаблічнасць і станоўчае ўздзеянне на асобу растлумачваюць выключна дабратворную ролю кахання ў тым узросце, калі асобе трэба зрабіць вялікі крок уперад, каб дасягнуць гэтай ступені агульнае сталасці. Пры нармальным развіцці асоба ўжо ў падлеткавым узросце становіцца здольнай да ўспрыняцця любоўных перажыванняў. Падлеткавы ўзрост азначае не толькі асобую ўспрымальнасць нервовай сістэмы, але і большую душэўную чуллівасць, бо любоўныя перажыванні ў пэўным сэнсе азначаюць для маладога чалавека прыкмету дарослаці.

Асабліва складана развіваюцца дзяўчынкі. Каханне да іх часта прыходзіць кружнымі шляхамі. Сімона дэ Бовуар так апісвае стан дзяўчынкі ў гэтую пару: «Яна ўжо вось-вось гатовая аддацца ў абдымкі і раптам ледзянее, страсць яе згасае. Яе неспакушанае цела адчувае то слодыч ад дотыку мужчынскай рукі, то непрыемнае казытанне; пацалунак спачатку ўскружыць ёй галаву, а потым рассмешыць; злавіўшы сябе на падатлівасці, яна раптам становіцца неўтаймаванай і непрыступнай; яна церпіць, калі яе цалуюць у вусны, але адразу ж дэманстратыўна выцірае іх; то яна адданая і пяшчотная, а праз момант — насмешлівая і варожая; усё абяцае і на ўсе абяцанні наўмысна забываецца».

Гэтая выдатная характарыстыка, вядома, датычыць дзяўчынак-падлеткаў. І ўжо не пашанцуе мужчыну, калі ягонай партнёркаю, а то і жонкаю стане жанчына, якая да 25—30 гадоў не вызваліцца ад гэтых дзівацтваў. Такая інфантыльная жанчына, унаследаваўшы падлеткавыя звычкі, атруціць, вядома, жыццё мужу ці партнёру.

У фарміраванні сексуальнай культуры рашаючая роля належыць самому полаваму акту. Але не дасягнутаму любой цаною. І якраз у сувязі з гуманізаваным полавым інстынктам варта сказаць і засвоіць, што перажыванні ад самых першых актаў могуць мець выключнае значэнне з пункту гледжання гармоніі далейшага полавага жыцця.

Калі першы акт быў гвалтоўны, паспешлівы, калі другі і трэці таксама сталі адно спробамі з рознымі мужчынамі, скажам, у машыне, парку, употайкі, у няёмкім становішчы, гэта надоўга можа атруціць полавае жыццё жанчыны.

Пра гэта бацькі рэдка гавораць са сваімі дзецьмі, між тым мэтазгодна, каб дарослыя адкрыта, нічога не ўтойваючы, растлумачылі ім, што першы полавы акт павінен здзейсніцца не выпадкова, не прымусова ці пад уздзеяннем алкаголю, а як вынік свядомай падрыхтоўкі і любоўных адносін. У гэтай размове нельга ні забараняць, ні запалохваць, яна павінна быць хутчэй за ўсё сяброўская, разлічаная на разуменне.

Шлях да нараджэння кахання вельмі часта перакрываецца тым, што многія дарослыя, якія не адчуваюць гэтага пачуцця, менш за ўсё гатовыя займацца сексуальнымі пытаннямі, асцерагаюцца даваць практычныя, добрыя парады. Яны не адважваюцца дапамагчы маладым у іхнім абуджаным імкненні да полавых сувязей і настойваюць на тым, каб не кранаць гэтую «тэму», не скаламучваць ваду, не выпускаць джына з бутэлькі. Яны, вядома, уступаюць у супярэчлівасць з характэрнымі для нашай эпохі рэальнасцямі, нават у тым выпадку, калі ўсведамленне гэтых рэальнасцей запазніваецца ці яны выглядаюць па-рознаму на паперы і ў рэальным жыцці.

Многія маладыя людзі, часта ўжо ў 15—16-гадовым узросце, лічаць, што бацькоўская строгасць абмяжоўвае іхнюю «свабоду». Калі ў адносінах паміж бацькамі і дзецьмі няма шчырасці, а галоўным прынцыпам выхавання з'яўляецца забарона, то многія маладыя людзі пачынаюць ранняе полавае жыццё «проста так». Яны хочуць даказаць, што нічым не адрозніваюцца ад астатніх, і баяцца насмешак равеснікаў больш, чым бацькоў альбо вынікаў безадказных сексуальных прыгод.

Усё часцей дарослыя цяпер ужо разумеюць, што пры нараджэнні пачуцця кахання ў іхніх дзяцей-падлеткаў паводзіць сябе трэба інакш, чым у ранейшыя часы, у пару іхняга дзяцінства.

Пасля гутаркі з 840 вучнямі і вучаніцамі амерыканскі сацыёлаг Уінстан В. Эрман параіў бацькам дапамагчы сваім дзецям наладжваць спатканні, бо гэта добра паў-

* Кніга выйдзе ў выдавецтве «Прагрэс». Фрагменты з яе чытайце ў некалькіх нумарах «Крыніцы».

плывае на развіццё іхняй асобы. «Паміж частатою сустрэч і ладам сексуальных паводзін ёсць відавочная ўзаемасувязь... можна даказаць, што маладыя людзі радзей уступаюць у полавую сувязь без кахання, калі яны часта сустракаюцца. Частыя сустрэчы юнакоў і дзяўчат прыносяць асаблівую радасць дзяўчатам — ласкі, пацалункі і нават пецінг. Большасць з іх, аднак, хочуць уступаць у полавую сувязь толькі з каханымі»,— піша Эрман.

Спрачацца аб тым, выпускаць ці не выпускаць джына з бутэлькі, бескарысна. Шлюб ужо даўно перастаў быць вехаю, ад якой пачынаецца полавае жыццё. Усё, што мы можам зрабіць,— гэта весці асветніцкую работу і быць у добрым кантакце з дзецьмі.

«Джын», зрэшты, ужо даўнымдаўно не ў бутэльцы.

Наладжванне полавай сувязі, хоць на першы погляд гэта і здаецца простым, уяўляе сабою нялёгкую і, можна сказаць, часта досыць складаную, а для асобных людзей відавочна цяжкую задачу. Ні ў якім разе нельга рабіць высновы, а тым больш абагульненні на той падставе, што, маўляў, «якая тут праблема, калі двое маладых людзей ужо на першай хвіліне адно з адным на ты, на дзесятай апантана трасуцца ў якой-небудзь дыскатэцы, на дваццатай пачынаюць заігрываць, на трыццатай цалуюцца, а на сараковой...»

Вядома, у пэўных групах падлеткаў (па ацэнках, 25—30 % тых, што жывуць полавым жыццём) здараецца, што праз шэсць гадзін пасля знаёмства (сярэдняя працягласць вечарынкі) справа даходзіць да полавага акту. Зазвычай, канечне, гэта незайздросныя сувязі, якія не даюць ніводнаму з партнёраў сапраўднага задавальнення менавіта з-за іхняй выпадковасці і легкадумнасці.

Разам з тым, такая ж ці нават большая колькасць (30—35 %) маладых людзей не могуць пачаць, «замахнуцца» і гадамі не могуць рашыцца, пакуль хто-небудзь з больш вопытных сяброў ці сябровак не арганізуе «справу».

— У такіх выпадках я не магу нічога прыдумаць,— кажа васемнаццацігадовы юнак, які звярнуўся да спецыяліста па параду.— Праўда, я ўжо пару разоў апёкся на дзяўчынках,— дадаў ён.— А я ж не лічу сябе сарамлівым. Заўсёды думаю пра якую-небудзь лухту. Дома, асабліва мама, галаву мне затлумілі перасцярогамі, маўляў, глядзі, павесяць табе на шыю дзіцёнка. І калі потым пачынаю гуляць з дзяўчынаю, заўсёды гэта лезе ў галаву і прападае ўсялякая ахвота. Вось мяне і празвалі Лашаком. А цяпер я не ведаю, як і пачынаць. Уявіце сабе, калі пацаны знаёмяць мяне з дзяўчынаю, дык кажуць: «Знаёмся, гэта Лашак».

— Калі б мама даведалася, што я ўжо не дзяўчына, яна б выгнала мяне з дому,— часта можна пачуць ад дзяўчат, хоць для многіх з іх гэтыя пагрозы не азначаюць сігналу «СТОП», а прымушаюць весці двайную гульню. Бо ж яны, не атрымліваючы ад дарослых адпаведнай парады і дапамогі, баяцца вынікаў (асабліва непажаданай цяжарнасці).

У калектывах (у сям'і, школе, на працы) чалавек у працэсе свайго развіцця падвержаны розным уздзеянням. Гэтыя ўздзеянні ўплываюць і на фарміраванне асобы. У асяроддзі, якое моцна абмяжоўвае, асоба становіцца альбо агрэсіўнай і спрабуе вызваліцца ад абмежавальнікаў, альбо скараецца (капітулюе) і, нават супрацоўнічаючы з абмежавальнікамі (часцей за ўсё з бацькамі), сама стварае тым самым абмежавальныя фактары і перашкоды, супраць якіх неўзабаве пачынае змагацца.

53-гадовая Н. Т. прыйшла ў Будапешцкі цэнтр кансультацый па полавых пытаннях са сваёй 28-гадовай дачкою. Яна сказала (яна, маці, а не дзяўчына!), што яе дачка мужчынаненавісніца і гэта моцна непакоіць яе, бо яна хацела б выдаць яе замуж, але дачка і чуць пра гэта не хоча. Пагражае, што, калі яе будуць змушаць да гэтага, яна пакончыць з сабою.

Пасля многіх працяглых гутарак высветлілася, што аднойчы, калі дзяўчынцы было ўжо 13 гадоў, нехта з аднакласнікаў падарыў ёй выразаную з газеты фатаграфію голага мужчыны, і маці, якая пастаянна правярала яе рэчы, знайшла гэтую фатаграфію. У выніку — пакаранне: аплявухі, нудныя натацыі. Праўда, як згадала маці, урэшце яна ўсётакі сказала дачцэ: «Прыйдзе час, пра ўсё даведаешся». Але час так і не прыйшоў.

Дзяўчына прызналася, што кожнага разу, калі яна ўбачыць голага хлопчыка ці мужчыну на пляжы, яна адчувае агіду і страх. А думка пра тое, што аднойчы нехта «захоча падсунуць яго ёй», прыводзіла яе ў жах, спазма сціскала горла і яна гатовая была ўпасці без прытомнасці. Праз гэта вось ужо чатыры гады яна не ходзіць на пляж, не глядзіць фільмы, у якіх ёсць інтымныя, сексуальныя сцэны. Трэба заўважыць, што да гомасексуалізму яна ніколі не выяўляла цікавасці.

Дзяўчыне назначылі псіхіятрычнае лячэнне, у выніку праз паўтара года ўдалося адно зняць сімптомы сарамлівасці і страху. Мужчыны яе не цікавяць, секс не хвалюе. Выпадак з дзяўчынаю быў вырашаны, і яна супакоілася.

У большасці выпадкаў, аднак, вынікі бываюць больш складаныя. Няўдалае полавае жыццё выклікае значна болей праблем, асабістых і нават сямейных канфліктаў, прыводзячы часам да трагедый, чым больш ліберальныя погляды і характар паводзін. Таму мяне непакояць хутчэй за ўсё тыя, хто застаўся па гэты бок мяжы. Тыя, хто не можа (не смее!) прыняць секс у якасці натуральнай з'явы, якая спадарожнічае ўраўнаважанаму ладу жыцця. Тыя, хто раўніва перажывае за сваю маладосць і так мала ўражанняў можа запісаць у свой актыў.

Абедзве крайнасці могуць быць шкодныя — як ранні, так і позні пачатак практычных полавых сувязей. Як паказвае практыка, большасць маладых людзей ва ўзросце дваццаці гадоў не шкадуюць аб тым, што пачалі полавае жыццё. Гарманічная полавая сувязь, адчуванне аргазму станоўча ўплываюць на юнака і дзяўчыну, спрыяюць іх развіццю, дапамагаюць ім знайсці сваё месца ў грамадстве, працы і нават

у вучобе.

Дзе ж мяжа? Да якой мяжы можа ісці ў наладжванні полавых сувязей 16—17-гадовы юнак? І да якой — дарослы? Да якой — мужчына, і да якой — жанчына? У якіх рамках можна лічыць дзяўчыну ўстрыманай і ў якіх, скажам, разбэшчанай? Па якіх прыкметах мужчына лічыцца «лашаком», а па якіх — лавеласам? Дзе пралягае тая дакладная мяжа, якая аддзяляе смелага ад сарамлівага, устрыманага ад неўтаймаванага?

У агульных рысах гэтая мяжа, відаць, распазнавальная. Для гэтага не трэба быць сексолагам. Але мяжа гэтая — індывідуальная, і нельга рабіць ні высноў у ацэнцы, ні ўніфікаваць правілы паводзін. У сталым узросце наўрад ці можна прыступаць да фарміравання разняволенай, гарманічнай асобы, ураўнаважанай і ў полавым жыцці, калі гэтага не зрабілі раней. Хоць пяшчотны і чулы партнёр можа шмат у гэтым дапамагчы. (Сарамліваму мужчыну, які змагаецца з полавым занядужаннем,— актыўная, ініцыятыўная, умелая жанчына; нясмелай, стрыманай дзяўчыне — ласкавы, цярплівы, ветлівы і ўважлівы мужчына.)

Галоўнае, аднак, заключаецца ў выхаванні маладых людзей, ва ўважлівых адносінах да іхняга жыцця і разваг, у шчырых адказах на іхнія пытанні і ў своеасаблівай бацькоўскай смеласці. Канкрэтна гаворка ідзе пра тое, што сталага ў полавых адносінах маладога чалавека, які ўжо нясе адказнасць у іншых справах (вучобе, працы),— юнака ці дзяўчыну — трэба разумець і верыць у яго і тады, калі гаворка ідзе пра полавае жыццё.

Чалавек не нараджаецца нясмелым, няспрытным, сарамлівым — такім ён робіцца пад уздзеяннем асяроддзя, выхавання і (нярэдка) першай полавай сувязі. Асабліва, калі пад дабрачыннымі прэтэкстамі яму навязалі памылковыя, скажоныя ідэалы. Хлопчык, якога пастаянна заахвочваюць да таго, каб ён быў баявы, браў ад жыцця ўсё, што можна ўзяць, які дома пастаянна чуе размовы пра тое, што сапраўдны мужчына пакарае дзяўчыну, авалодвае ёю, словам, здольны да гвалту, такі юнак, канечне, наўрад ці можа даць полавае задавальненне партнёрцы. Мужчына з грубымі манерамі (тут, вядома, маецца на ўвазе не полавае згвалтаванне, а толькі благі стыль паводзін) можа надоўга адбіць у дзяўчыны ахвоту да полавага жыцця. Калі дзяўчына, якую юнак абдымаў нахабна і з прыкметнай пагардаю, усё ж шукае новай сувязі, то вельмі часта пад уражаннем непрыемных успамінаў яна становіцца палахлівай, сарамлівай і, ва ўсякім разе, асцярожлівай. Праблемы задаволенасці могуць доўга праследаваць яе.

Гэтаксама ж спакушаная ў любові жанчына можа атруціць будучыню юнаку, поўнаму найлепшых надзей, згасіўшы ягоныя амбіцыі, страсць і смеласць якой-небудзь паблажлівай, незадаволенай ці кплівай заўвагаю, неабгрунтавана вялікімі патрабаваннямі.

Бацькоў заспявае неспадзеўкі ранні пералом у паводзінах падлеткаў, паскарэнне так званага эмацыянальнага самавызначэння. Маладых людзей васьмідзесятых гадоў адрозніваюць ад папярэдняга пакалення значна больш выражанае імкненне да самастойнасці і павышаная цікавасць да сексуальных пытанняў.

Абуджаны полавы інстынкт, зрэшты, ставіць у цяжкае і трывожнае становішча некаторых маладых людзей, пераважна юнакоў. 14—15-гадовыя хлопчыкі ўжо адчуваюць моцнае полавае жаданне, бо яны ўжо сталі на тую прыступку біялагічнай спеласці, з якой яны будуць падымацца вышэй. Аднак большасць падлеткаў яшчэ не гатовыя стаць сексуальным партнёрам. Нават у тым выпадку, калі ў іх сістэматычная эрэкцыя полавага члена і таму натуральнай з'яўляецца цяга да мастурбацыі. Першы асабісты кантакт з жанчынаю для іх ахутаны яшчэ смугою таямніцы.

Амерыканскі пісьменнік Тэадор Драйзер так пісаў пра гэта:

«Я ведаў, што адбымкі і пацалункі нешта азначаюць і што жаночае цела ўзбуджала мяне... Я пакутаваў ад сумнення, ці вытрымаю я, калі раптам апынуся сам-насам з жанчынаю. Ці хопіць у мяне сіл заставацца разумным?»

Як паказвае жыццё, хлопчыкі ў гэтым узросце яшчэ пазбягаюць збліжэння з дзяўчынкамі і яшчэ радзей дзяўчынкі-падлеткі шукаюць партнёра сярод сваіх равеснікаў. Ну а калі ўсё-такі?

— Гаварыць пра гэта з дачкою мне вельмі цяжка,— падзялілася са мною адна мая знаёмая, высокаадукаваная інтэлігентная жанчына,— бо я не хачу, каб у яе ўсё сапсавалася з самага пачатку.

— Чаму сапсавалася?

— Бо яна была без памяці закаханая ў аднакласніка. А ім толькі што па шаснаццаць споўнілася. І паколькі мы ўсё гэта абмеркавалі з дачкою, я ведаю, што яны рыхтуюцца да «гэтага». Але я параіла б ёй легчы лепш першы раз з больш вопытным, старэйшым хлопцам, бо ў сваім хлопчыку яна расчаруецца. Ён жа яшчэ дзіцёнак. І бяда не ў тым, што яна расчаруецца ў хлопчыку, а ў тым, што яна не зразумее секс. А гэта можа мець больш сур'ёзныя вынікі.

Узроставы зрух кахання больш сур'ёзную праблему ўяўляе, несумненна, для дзяўчат.

У некалькіх задунайскіх шахцёрскіх пасёлках пасля лекцый мне давялося сустракацца і гутарыць з васьмікласніцамі. На аснове ананімных анкет я атрымаў інфармацыю аб іх сексуальных ведах і пачатковым любоўным жыцці. Амаль у кожным класе, які складаецца з 20—25 вучняў, было па 3—4 дзяўчыны, якія ўжо не адзін раз уступалі ў полавы акт. У сярэднім яны складалі 15,3 % аднакласніц. У хлопчыкаў гэтая доля складала 5,1 %.

Бацькі ў пэўных сітуацыях адчуваюць не толькі разгубленасць, але і адчай.

Гэта асабліва датычыць тых, у каго непаўналетняя дачка зацяжарала. Іх усё большая колькасць уяўляе сабою, дарэчы, праблему ва ўсім свеце.

Школьны ўрач горада Сегеда Вілма Сіладзі прыводзіць дадзеныя аб тым, што ў сярэднім за пяць гадоў колькасць штучных абортаў скарацілася на 20 %, але гэтая лічба не паменшылася сярод непаўналетніх дзяўчынак: 4,8 % агульнай колькасці, інакш кажучы, 397 непаўналетніх дзяўчынак, у тым ліку тры дзяўчынкі, якія не дасягнулі яшчэ і 14 гадоў, і 62 маладзейшыя за 16 гадоў. (332 дзяўчыны былі ва ўзросце 17—18 гадоў.) 51,6 % цяжарных, падвергнутых аборту, складалі вучаніцы. З гэтага даследавання вынікае таксама, што, калі ў 1974 годзе 23 % усіх абортаў прыходзілася на вучаніц сярэдніх школ, то ў 1978 годзе гэтая доля складала 36 %.

Як паведамляў італьянскі ілюстраваны штотыднёвік «Панарама», у многіх школах Злучаных Штатаў Амерыкі колькасць цяжарных вучаніц узрасла да такой ступені, што прыйшлося ўвесці новы прадмет — асновы полавых паводзін. Ёсць школы, у якіх не толькі дазваляецца вучыцца цяжарным школьніцам, але і арганізаваныя яслі для іхніх дзяцей, з тым каб яны спакойна маглі працягваць вучобу.

Аб разгубленых бацьках сацыёлаг дзяржаўнага універсітэта ў Сан-Дыега Обры Вендлінг кажа так: «Бацькі да такой ступені ламаюць галаву над тым, што зрабіць, што ў рэшце рэшт нічога не робяць, і маладыя людзі звяртаюцца па параду да сваіх равеснікаў».

Не будзем загадзя ўсцешвацца: у школах у нас пакуль што няма ясляў, але, як мы ўжо пераканаліся, ёсць 14-гадовыя цяжарныя дзяўчынкі, ёсць пакінутыя дзеці, ёсць і шмат разгубленых бацькоў. І што ж робіць занепакоеная маці? Заломвае рукі. І, як паказвае жыццё, не больш.

З венгерскай.

Класіка вострасловя

ШАРЛЬ МАРЫС ТАЛЕЙРАН 1754—1836

Уявіце сабе жыццё французскага арыстакрата на прыканцы XVIII і на пачатку мінулага стагоддзяў. Выглядае яно досыць хрэстаматыйна: жанчыны, карты, рауты, інтрыгі, вытанчаныя стравы, добрае старое віно і свежыя паказкі, потым — рэвалюцыя і эміграцыя, нарэшце, Імперыя, кааліцыя і Рэстаўрацыя. Праз усё гэта найлепшым чынам прайшоў Шарль Марыс Талейран, князь Беневенцкі, знакаміты дыпламат першае Французскае рэспублікі, напалеонаўскае эпохі і апошніх Бурбонаў.

Ці можа кульга падабацца жанчынам? Можа, калі «найперш — не быць бедным», сцвяржаў князь Беневенцкі. Ягоная велічная кульгавасць адольвала любыя маральныя перашкоды, асабліва ў грашовых справах. Атрыманае ў дзяцінстве калецтва пазбавіла Шарля Марыса будучай прыдворнае або вайсковае кар'еры, пакінуўшы яму толькі шлях святара. Шлях, для якога ён не быў народжаны. У такіх выпадках здольныя юнакі цалкам аддаюцца чытанню, але, на шчасце, кнігі не зрабілі яго сваім рабом, аднак прасвятлілі ягоны розум. Шарль Марыс выявіў цікавасць да ўсяго, што належала да свецкае і велікасвецкае сферы. І вось ён — дэпутат Генеральных Штатаў. А дастойнасць біскупа Атэнскага ён па-сапраўднаму выкарыстоўваў толькі раз: дзеля ўрачыстае імшы ва ўгодкі ўзяцця Бастыліі.

Знайшоўшы месца пад сонцам рэвалюцыі, Талейран у час заўважыў узыход новага свяціла — Напалеона, зрэшты, як потым своечасова адчуў і яго заход. «Толькі дурні адданыя заўсёды адным грамадскім ідэалам, палітык-рэаліст кіруецца абставінамі». З дапамогаю выключнае інтуіцыі самому яму гэта ўдавалася проста бліскуча.

Такім чынам, спачатку былы біскуп зрабіў усё, каб парушыць еўрапейскі спакой, потым ветліва папрасіў у Еўропы прабачэння за поспехі Францыі і вярнуў усё да ранейшага стану рэчаў. Безумоўна, гэта быў геній дыпламатыі. Праўда, засталося без адказу пытанне пра ягоную мараль. Аднак Талейран сам захацеў, каб стагоддзямі людзі працягвалі спрачацца: хто ж ён і чаго прагнуў?

Нельга меркаваць аб справах гэтага свету толькі на падставе сённяшняга дня. Сучаснае — амаль заўсёды неістотнае, калі не лічыць, што яно спараджае будучыню.

Усяго, да чаго імкнецца самалюбства, часта можна дасягнуць самымі супрацьлеглымі сродкамі. Проста трэба ўмець іх спалучаць.

Устойлівасць складаных натур тлумачыцца іхняю гнуткасцю.

У краіне, дзе існуе звычай даваць адзнакі, варта было б адзначаць найперш тых людзей, якіх трэба выдаліць з дзяржаўнай арэны.

Несправядлівы пераслед мае сваю асалоду.

Гісторыя паказала, што пры слабым урадзе настойлівасць не застаецца безвыніковаю.

Добрая бібліятэка дапамагае ў любым гуморы.

Мы верым толькі ў тых, хто верыць у сябе.

Вялікія здольнасці падабаюцца, але не выклікаюць даверу.

Ёсць зброя страшнейшая за паклёп: гэтая зброя — праўда.

Шлюб — такая цудоўная рэч, што мы мусім разважаць пра гэта ўсё сваё жыццё.

Не варта трапляць у ролю пахаванага пад паперамі; трэба знайсці людзей, якія іх раскапаюць.

Належыць кіраваць справамі адным рухам, знакам; умець паставіць коску, якая вызначае сэнс.

Мова дадзена чалавеку на тое, каб хаваць свае думкі.

Гэта больш, чым злачынства, гэта — памылка.

Тыя, што жэстыкулююць, слухаюць найперш саміх сябе, таму яны часта паўтараюцца.

Лішак розуму раўназначны яго недахопу.

Гэта былі тыя патрыёты, што заўсёды гатовыя вітаць змены ў дзяржаўным ладзе свае краіны, незалежна ад таго, якія гэта змены.

Валадар найбольш суровы тады, калі не мае рацыі або калі чуе страх, які ўсе бачаць.

Ёсць нехта разумнейшы за самога Вальтэра: гэта — астатняе чалавецтва.

Нястомны язык вядзе за мяжу асцярожнасці.

Народ і натоўп — гэта розныя рэчы.

Усе няшчасці і бязладдзе ў бяспрэчна неабходнай нам рэвалюцыі з'яўляюцца таму, што адны імкнуцца перашкодзіць ёй, а другія — паскорыць яе.

Неразумная жанчына кампраметуе толькі сябе, а разумная — і сябе, і мужа.

Калі жанчына лёгка згаджаецца, яна звычайна пазбягае плётак, якія нараджае какецтва.

Трэба ўмець успрыняць непазбежнае, каб ператварыць яго ў карыснае.

Людовік XVI меў смеласць жанчыны, што сабралася нараджаць.

Калі асноўныя патрэбы чалавека ледзьве задаволеныя, раскоша здаецца непрыстойнаю.

Хто адмаўляецца ад дзейнасці ў час грамадскіх землятрусаў, той спрыяе разбуральнікам.

Усё, што перабольшваецца, робіцца нязначным.

Калі сяброўства грунтуецца на адных забавах, яго не хопіць на ўсё жыццё.

Прамысловасць разбэшчвае нацыянальную мараль, трэба аддаваць перавагу сельскай гаспадарцы.

Палітыцы, як і іншым справам, ніколі няварта аддавацца ўсёй

душою. Празмерная любоў замінае.

У сваім шчасці чалавек залежыць ад шчасця іншых людзей.

Шмат юнакоў нецярпліва чакаюць таго ўзросту, які дасць ім незалежнасць,— не дзеля таго, каб паспрабаваць сябе ў карысных справах, а выключна дзеля вызвалення ад надакучлівых выхавыльнікаў і рэалізацыі сваіх схільнасцей.

Сцеражыцеся першага руху душы: ён, зазвычай,— самы высакародны.

Пераход выхаванца ад нянек да першых настаўнікаў часта азначае замену жаночай слабасці мужчынскай паблажлівасцю.

У размове трэба перабольшваць знаёмае і пазбягаць невядомага.

Абачлівасць — мастацтва паказваць іншым толькі частку свайго жыцця, сваіх думак, пачуццяў і ўражанняў. Гэта галоўная чалавечая вартасць.

Той, хто баіцца іншых і не ўпэўнены ў самім сабе, асуджаны на бясконцыя памылкі.

Адна няўдача нараджае другую, а часам — цэлае мноства няўдач.

Славалюбівыя летуценні таксама вымагаюць часу.

Пасрэдныя асобы часта граюць істотную ролю ў гістарычных падзеях адно з тае прычыны, што ў час аказваюцца на месцы.

Сельская гаспадарка зусім не мае заваёўніцкіх памкненняў: яна стварае. Заваёўнік — гандаль: ён імкнецца да пашырэння.

Людзі рэдка захоўваюць энергію да канца свае дзейнасці. Царадворцы рана старэюць, і амаль усе людзі, старэючы, лёгка робяцца царадворцамі.

Трэба сцерагчыся рускіх: яны будуць імкнуцца заваяваць свет.

У важных справах папрокі за марудлівасць задавальняюць усіх: яны паказваюць перавагу тых, хто папракае, і абачлівасць тых, каго папракаюць.

Мая эпоха адрознівалася тым, што ўсе хацелі вылучыцца дзякуючы талентам, якія не мелі дачынення да іхняе асноўнае прафесіі.

Я дарую людзям, якія не пагаджаюцца з маёй думкаю; я не дарую ім, калі яны маюць сваю.

А цяпер абвесцім вайну словам!

З аўтарам і ягонымі думкамі вас пазнаёміў

Л. КАЗЛОЎ.

Пётр ЛЕБЕДЗЕЎ

БАЦЬКІ І ДЗЕЦІ

Я не належу ні да нефармальных аб'яднанняў, ні да народнага фронту. Ветэран вайны і працы, член КПСС з 1947 года. Доўгі час працаваў на камсамольскай і партыйнай рабоце, быў сакратаром парткома Мінскай вышэйшай партыйнай школы, інструктарам ЦК КПБ, 13 гадоў працаваў першым сакратаром Бярозаўскага райкома партыі Брэсцкай вобласці, 12 гадоў — загадчыкам аддзела навукі, культуры і аховы здароўя Камітэта народнага кантролю Беларускай ССР. Выбіраўся дэлегатам многіх з'ездаў КПБ, быў членам Рэвізійнай камісіі Камуністычнай партыі Беларусі.

Спрабую цяпер разабрацца і зразумець, што гэта за метад такі галоснасці і плюралізму ў рэспубліцы, пры якім адзін бок можа гаварыць і пісаць усё, што ўздумаецца, не лічыцца з праўдаю і аб'ектыўнасцю, не саромеецца ў выразах, не выбірае слоў, дапускае грубасці, бестактоўнасць і абразы, а другі бок не атрымлівае магчымасці нават выкласці сваю пазіцыю?

Апошнім часам любыя недахопы, памылкі, правалы і іншыя негатыўныя з'явы стараюцца растлумачыць «кознямі» нефармалаў, звальваюць на іх віну за ўсе выпадкі правалаў у гаспадарчым, палітычным, эканамічным і сацыяльным жыцці. Гэта прыносіць велізарную шкоду справе перабудовы, не дае магчымасці аб'ектыўна, цвяроза прааналізаваць і выявіць сапраўдныя прычыны правалаў і памылак. Прычыны гэтыя не так ужо і цяжка выявіць. Гэта — перш за ўсё — грубейшыя парушэнні ленінскіх прынцыпаў вылучэння, падбору і расстаноўкі кадраў, што прывяло да таго, што на многія пасты ў партыі, дзяржаве і эканоміцы пралезлі шэрыя, некампетэнтныя, недальнабачныя эгаісты і самалюбцы, а нярэдка і карыслівыя людзі, якія з-за вузказгаістычных інтарэсаў адсоўваюць грамадскія інтарэсы, разбураюць маральнасць, ганьбяць нашыя ідэалы, разбуральна дзейнічаюць на партыю і народ. Вакол беспакаранна пануюць самавольства і беззаконне, карупцыя, самадурства, цяганіна, праследаванне сумленных людзей і хлусня.

У недалёкім мінулым у некаторых кіраўнікоў рэспублікі разыграліся амбіцыі. Страціўшы пачуццё меры і сціпласці, яны вырашылі для сябе, некалькіх сем'яў самых высокапастаўленых «бацькоў» рэспублікі, стварыць «райскі куток», абсталяваць асобную паліклініку і стацыянар пры лечсанупраўленні, дзе і без гэтага ім створаны найлепшыя ўмовы. З будынка ў добраўпарадкаваным зялёным скверы па вуліцы Чырвонаармейскай у Мінску, дзе месціўся Дом юных тэхнікаў, выселілі дзяцей. На рэканструкцыю гэтага будынка растранжырылі некалькі мільёнаў рублёў, прызначаных на ахову здароўя насельніцтва рэспублікі. Гэта выклікала незадаволенасць, абурэнне і гнеўныя пярэчанні народа, бо людзі штодня сутыкаюцца з нязручнасцямі і занядбанасцю нашых «цудоўных» гарадскіх і сельскіх паліклінік і бальніц, за кошт якіх ствараліся панскія выгоды для жменькі «бацькоў» рэспублікі.

Але на незадаволенасць і абурэнне людзей ніхто не звяртаў увагі. Збудавалі «райскі куток» датэрмінова з выдатнай якасцю выкананых работ. Але «бацькам» не ўдалося скарыстацца «райскім кутком»: настаў час, час перабудовы і ачышчэння. Пад ціскам грамадскай думкі было прынята рашэнне аб перадачы будынка пад медыцынскую ўстанову па аздараўленні дзяцей Чарнобыльскай зоны.

Страсці ўлегліся. Людзі супакоіліся і нават скарыліся з растранжыранымі сродкамі. Супакойваў і артыкул «Вокруг зоны», апублікаваны ў газеце «Правда». У ім гаварылася:

«Доўга і старанна пацелі будаўнікі над рэканструкцыяй трохпавярховага будынка, які ўтульна месціўся ў зеляніне аднаго з мінскіх сквераў. Да высялення гаспадарамі ў ім былі юныя тэхнікі беларускай сталіцы.

На мармур, саўны, плавальны басейн, карлсбадскія ванны, люксы, імпартнае абсталяванне і мэблю расходвалі больш як 2 300 000 рублёў. Некаму, відаць, не давалі спакою амбіцыі выключнасці. Інакш як растлумачыць рашэнне аб стварэнні філіялу паліклінікі і стацыянару Чацвёртага галоўнага ўпраўлення Міністэрства аховы здароўя для вузкага кола сем'яў верхняга эшалону беларускіх кіраўнікоў. Калі ж усё было гатова і заставалася, як кажуць, разрэзаць стужку, здарылася нечаканае. Першы сакратар ЦК Беларусі Я. Я. Сакалоў на пасяджэнні бюро ўнёс прапанову: перадаць памяшканне з усёй маёмасцю для ажыццяўлення медыцынскай дапамогі дзецям з вёсак зоны забруджання».

На гэтым можна было б і паставіць кропку. Але самому факту гэтых панскіх памкненняў не была дадзена прынцыповая партыйная ацэнка, ніхто з вінаватых не прыцягнуты да адказнасці за гэтую задуму са стварэннем «райскага кутка», ніхто не пакараны за змарнаваныя мільёны. Віноўнікі засталіся ў сваіх раскошных крэслах вышэйшага эшалону, а сёй-той высунуўся яшчэ вышэй. Цяпер яны на поўны голас выступаюць за перабудову

і галоснасць, за сумленнасць і сціпласць, за сацыяльную справядлівасць...

Трохі перапалохаўшыся, «бацькі рэспублікі» зноў асмялелі. А чаму б і не? Нават гэтае нястрыманае злоўжыванне было пададзена людзям як высакародны парыў. Усе супакоіліся. Цяпер «бацькам» захацелася яшчэ і выглядаць перад народам чысцюткімі, паказаць, што яны ні пра што больш і не думаюць, як пра патрэбы народа. Таму яны замятаюць сляды, ствараюць ілюзію, што нічога такога ў рэспубліцы і не было, што ніякага «райскага кутка» ніхто і не будаваў. 27 жніўня 1988 года адначасна амаль ва ўсіх газетах (рэспубліканскіх, абласных і іншых) пад загалоўкам «Яшчэ раз аб прывілеях і «лёгкім» хлебе» апублікавана актуальнае інтэрв'ю кіруючага справамі ЦК КП Беларусі У. Л. Паўлюкевіча карэспандэнту БЕЛТА, дзе ён, між іншым, закранае і пытанне будаўніцтва таго ж «райскага кутка».

Паўлюкевіч, не маргнуўшы вокам, заяўляе: «Наколькі мне вядома, два гады назад у вызваленым будынку Дома юнага тэхніка меркавалася адкрыць дыягнастычны і рэабілітацыйны цэнтр для ажыццяўлення паглыбленай кардыялагічнай дапамогі — у першую чаргу тым, хто перанёс інфаркт ці іншае цяжкае захворванне. Адразу пасля чарнобыльскай аварыі цэнтр быў перапрафіляваны на радыелагічнае абсталяванне і аддадзены дзецям забруджаных раёнаў».

Вось так. Не больш і не менш. Яшчэ не паспелі па-сапраўднаму сціхнуць страсці людзей, за кошт якіх ствараўся «райскі куток» для «бацькоў» рэспублікі, не паспелі высахнуць фарбы на старонках газеты «Правда», як адказны работнік ЦК ужо сцвярджае, што ніякай «асобнай» лякарні «для вузкага кола сем'яў верхняга эшалону беларускіх кіраўнікоў» і не ствараласа, а проста абсталёўваўся бяскрыўдны дыягнастычны і рэабілітацыйны цэнтр. Выяўляецца, марныя былі незадаволенасць і абурэнне людзей. І ўжо зусім незразумела, навошта спатрэбілася «Правде» на ўвесь свет няславіць «вузкае кола... верхняга эшалону беларускіх кіраўнікоў», выкрываць іх карыслівыя памкненні, калі яны і ўдзень і ўначы клапоцяцца аб патрэбах цяжкахворых грамадзян рэспублікі? Незразумела і іншае: навошта трэба было змарнаваць 2,3 мільёны рублёў на дарагія люстры, каміны, карлсбадскія ванны, імпартную мэблю і іншую замежную непатрэбшчыну, без якой выдатна маглі б абысціся нашыя сціплыя беларускія працаўнікі, якія добра ведаюць цану сумленна зароблена рубля і цяжкасці аховы здароўя рэспублікі, нашых гарадскіх і сельскіх бальніц?..

Але і гэтага «бацькам» было мала. Інтэрв'ю Паўлюкевіча праз некалькі тыдняў адвялі месца і ў тыднёвіку «Аргументы и факты» № 37 за 1988 год. Нехай, маўляў, ведаюць пра нас не толькі ў рэспубліцы, але і ва ўсёй краіне.

Вось і зноў у рэспубліцы без «козней» нефармалаў пайшла пагалоска: «Зноў хлусня!», «Зноў за дурняў нас лічаць!», «Перабудаваліся, называецца!».

Як шмат узнёслага гаворыцца цяпер ва ўсіх дакументах партыі ў друку, па радыё і тэлебачанні! Пра сумленнасць і справядлівасць камуністаў і кіраўнікоў, пра чыстае святло праўды. А што ж кажа кіраўнік спраў ЦК? І кажа ён ад імя Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Беларусі! У каго ж нам тады вучыцца высакародным якасцям сумленнасці і праўдзівасці? Адкуль чакаць нам гэтай праўды чыстае святло?

Праўда. Толькі праўда і справядлівасць вядуць да перамогі перабудовы. І ніякай хлуснёю праўду не закрыць, якая б хітрая яна ні была. Памыліўся — прызнай сумленна і выпраўляй, але не хлусі, не хітруй, не выкручвайся. Народ наш добры. Ён усё разумее і даруе сумленным. Але нельга ж па-ранейшаму абалваньваць людзей...

Чытач, азнаёміўшыся з гісторыяй стварэння «райскага кутка» для рэспубліканскай «эліты», можа задаць мне законнае пытанне: «А дзе ж ты тады быў, таварыш Лебедзеў? Ты ж у той час узначальваў аддзел навукі, культуры і аховы здароўя ў Камітэце народнага кантролю Беларускай ССР. Чаму тады не праявіў прынцыповасці, не выступіў супраць гэтых злоўжыванняў, а цяпер толькі канстатуеш здзейснены факт? Ты ж па абавязку службы курыраваў і ахову здароўя, і народную асвету з Домам юнага тэхніка?»

Не, шаноўны чытач, я не маўчаў. Я змагаўся не толькі ў меру сіл, але і праз сілу. І ўсё безвынікова...

Калі кіраўнікі Міністэрства аховы здароўя БССР паведамілі мне пра гэтае нябачанае дагэтуль рабаўніцтва сістэмы аховы здароўя і пра высяленне Дома юнага тэхніка, я адразу ж кінуўся на Чырвонаармейскую вуліцу, дзе на вачах заплаканай дзятвы — будучых Цыялкоўскіх і Каралёвых — дарослыя дзядзькі выкідвалі ў кузаў грузавіка мадэлі іхніх ракет і самалётаў. Я неадкладна далажыў пра гэта старшыні Камітэта народнага кантролю БССР Міхаілу Іванавічу Лагіру, папрасіў тэрмінова паставіць пытанне ў ЦК КПБ і Савеце Міністраў рэспублікі. Але ён спакойна адказаў, што гэта не нашая справа, што мы не кантралюем ні Саўмін, ні ЦК, і параіў мне не лезці туды, куды не паложана. Два тыдні прабіваўся я на прыём да былога другога сакратара ЦК КПБ Г. Г. Барташэвіча, які курыраваў ахову здароўя. Ён катэгарычна адмовіўся прыняць мяне і настояў, каб я па тэлефоне расказаў, што за пытанне мяне так непакоіць. І калі я расказаў яму, ён абарваў мяне і параіў не соваць свой нос туды, куды не паложана, калі не хачу застацца без носа. Я не стрымаўся і выклаў яму, што «людзі абураюцца і адкрыта гавораць, што вы дзеля выгады жменькі кіраўнікоў абрабавалі народную медыцыну рэспублікі і дзяцей горада-героя Мінска». Ён адказаў мне: «Тады ты застанешся не толькі без носа, але і без партбілета»,— і кінуў трубку.

Размова з Барташэвічам не прынесла вынікаў. Я тэлефанаваў у аддзел навукі, культуры і аховы здароўя Камітэта народнага кантролю СССР, пісаў у газеты, прасіў дапамогі. Але ніхто на мой голас не адгукаўся...

Глеба пад маімі нагамі захісталася. Трохі раней мною былі выкрыты злоўжыванні службовым становішчам у карыслівых мэтах дырэктара Іўеўскай сярэдняй школы Гродзенскай вобласці Пракопіка і ягонай жонкі — загадчыцы аддзела прапаганды і агітацыі райкома партыі, іншых адказных работнікаў. Пра іх злоўжыванні працоўныя раёна больш як сем гадоў пісалі ў розныя інстанцыі. Але шматлікія правяральшчыкі іхнія злоўжыванні ўтойвалі, а скаргі спісвалі ў архіў: «Факты пры праверцы не пацвердзіліся». Праверка гэтым разам была даручана мне. У Іўі мяне адразу ж папярэдзілі, каб не чапаў Пракопікаў: у іх, маўляў, сувязі цягнуцца не толькі да вобласці, але і да самага Мінска, таму ўсе правяральшчыкі і абыходзяць іх...

Не паслухаўшыся парад і папярэджанняў, я ўзяўся за праверку. Факты цалкам пацвердзіліся. Злоўжыванні былі такія відавочныя, што не патрабавалася ніякіх намаганняў, каб іх выкрыць. А калі абаронцы і высокія апекуны гэтых асоб сталі «ціснуць» на мяне, каб я ўтоіў факты, я перадаў матэрыял «Сельской газете», якая яго надрукавала.

Парушальнікам і іхнім апекунам прыйшлося праглынуць горкую пілюлю. Справы адказных работнікаў разглядаліся ў партыйных інстанцыях і на пасяджэнні Гродзенскага абласнога Камітэта народнага кантролю. На вінаватых былі накладзены спагнанні.

Я добра разумеў, што нада мною збіраюцца хмары. Патрэбна была толькі падстава. І такая падстава знайшлася. Праз паўгода пасля маёй праверкі і апублікавання артыкула адзін з вінаватых, Пракопік, будучы ў цешчы, у яе ж двары з невядомых прычын пакончыў з сабою. Не чакаючы расследавання пракуратуры, нават яшчэ да ўзбуджэння крымінальнай справы аб факце самазабойства, вінаватым аб'явілі... мяне і вырашылі тэрмінова расправіцца з непаслухмяным, «некішэнным» работнікам народнага кантролю.

І нічога разумнейшага не прыдумалі кіраўнікі Камітэта народнага кантролю тт. Лагір М. І. і Кулагін М. К., як запатрабаваць ад мяне напісаць заяву аб звальненні па ўласным жаданні. Калі я адмовіўся, арганізавалі мне перакамісію УПЭК. Там мне і аб'явілі, што назначана другая група інваліднасці без права работы. За тры з паловаю месяцы да 60-гадовага ўзросту я быў вызвалены ад сваёй пасады і адпраўлены на пенсію па хваробе, з выплатай двухтыднёвай выхадной дапамогі.

Іўеўская раённая пракуратура не знайшла не толькі якой-небудзь маёй віны, але і ніякіх пабочных матываў, якімі мог кіравацца Пракопік, пакончыўшы з сабою. Была ўзнятая на ногі Гродзенская абласная пракуратура. Але і яна нічога іншага не знайшла, пацвердзіла высновы райпракуратуры. Пракурор вобласці дзяржаўны саветнік юстыцыі 3-га класа т. Цярэшчанка Л. П., праверыўшы матэрыялы следства, у сваёй пастанове аб спыненні крымінальнай справы запісаў:

«Улічыўшы і ацаніўшы ўсе акалічнасці справы, высновы пасмяротнай судова-псіхіятрычнай экспертызы, следства абгрунтавана прызнала прычынаю самазабойства Пракопіка Ю. І. хваравіты стан. Прыкметы складу злачынства адсутнічаюць.

У сувязі з тым, што пры праверцы КНК ананімнага ліста, а таксама ў ходзе следства факты злоўжывання Пракопіка пераважна пацвердзіліся, у дзеяннях аўтараў ананімных лістоў адсутнічае склад злачынства, прадугледжанага арт. 128 КК БССР.

Крымінальная справа спынена абгрунтавана».

Але і пасля гэтага ніхто не папрасіў у мяне прабачэння... Праўда, трэба ска-

заць, што «сильные мира сего» не толькі караюць. Могуць і аблашчыць.

Ці не ўся Брэсцкая вобласць ведае пра тэлефонную размову былога першага сакратара Баранавіцкага райкома партыі Лук'янчыка з былым старшынёю калгаса «Перамога» Героем Сацыялістычнай Працы А. А. Мацкоўскім. Сакратар патэлефанаваў старшыні і паведаміў, што прыехала начальства з вобласці і рэспублікі і жадае пазнаёміцца з калгасам.

— Калі ласка, прыязджайце. У нас уезд свабодны.

— Добра,— узрадаваўся сакратар,— толькі майце на ўвазе, нас будзе шэсць чалавек. Юшку добрую нам там на беразе возера арганізуйце.

Не вытрымаў Мацкоўскі, выбухнуў і на ўвесь голас даў сакратару па тэлефоне адлуп пры ўсіх членах праўлення і спецыялістах гаспадаркі: ішло пасяджэнне праўлення.

— Юшкі, юшкі вам захацелася! Каб толькі юшкі! А так вам на кожную талерку юшкі трэба па вядру каньяку! А вы юшкай мне галаву тлуміце! А грошы дзе загадаеце браць? У калгаса я не краду, зарплаты і так ужо палову дамоў не прыношу...

Што ж, у старшыні зарплата адна, а ў сакратара райкома калгасаў шмат. І Лук'янчык «сакратарстваваў».

Пасля чарговай папойкі на прыродзе — без вадзіцеля, за рулём легкавушкі — вяртаўся ён дамоў. І трэба ж было такому здарыцца: у самым цэнтры Баранавічаў на вачах усяго люду ўрэзаўся райкомаўскай «Волгай» у задняе месца хлебавозкі...

Але выцерабіўся жывы і здаровы. А сабутэльнікі ціхенька паправялі яго на пасаду загадчыка лектарскай групы абкома партыі. Там і ўзначальваў лекцыйную прапаганду, пакуль адной-чы не прапаў без вестак... Паехаў у камандзіроўку... і след яго прастыў. Толькі тыдні праз два знайшлі Лук'янчыка ў лесе каля саматужнага бровара, дзе прыгрэлі яго самагоншчыкі. Ен і праводзіў «ідэалагічную работу» сярод іх. Добра, што «завод» быў бесперапыннага дзеяння, а то замёрз бы «ідэолаг» у будане. Пасля гэтага развіталіся з ім у абкоме партыі, але не пазбавілі кіруючай пасады, накіравалі ўзначальваць таварыства кнігалюбаў.

І што ж за заслугі такія былі ў Лук'янчыка, калі яго так беражліва захоўвалі ў наменклатуры? Быў ён майстрам арганізацыі забаў. За гэта зрабілі яго сакратаром райкома партыі па ідэалогіі, а потым і ў Маскву накіравалі на вучобу. Адтуль ён вярнуўся кандыдатам эканамічных навук.

— Вось гэта Лук'янчык! — дзівіліся сябры.— Не толькі юшку ўмее арганізаваць, але і ў навуку можа ўклад унесці!..

А неўзабаве падышлі і выбары ў Вярхоўны Савет БССР. Лук'янчыка вылучылі кандыдатам.

Гэтая гісторыя жыла і развівалася ў застойныя часы. А цяпер? І цяпер вялікіх змен у гэтым важнейшым пытанні партыйнай работы не відаць...

Вось у чым корань зла, вось з-за чаго пáдае аўтарытэт кіраўнікоў, а разам з ім і аўтарытэт партыі. Вось дзе трэба шукаць сапраўдныя, а не надуманыя прычыны хваробы нашага грамадства, і адпаведна выкарыстоўваць лекі і працэдуры, каб вылечыцца.

Усевалад ІГНАТОЎСКІ

КАРОТКІ НАРЫС ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

Такім спосабам, з былых раскіданых заходнеславянскіх зямель у злучнасці з Літвою злажылася гаспадарства. У гэтым гаспадарстве на кожным кроку мы бачым працу беларускага жыхарства. З гандлёвай Полаччыны прыйшоў сюды капітал і пачаў зноў збіраць для эксплуатацыі працу мазольных рук. Вясковая старажытная Літва будуе ў сябе гарады, і яны пачынаюць жыць жыццём старых гарадоў Полаччыны і Кіеўшчыны. Некаторыя з гарадоў акружаюцца мурамі, узмацняюцца замчышчамі. Войскі гаспадарства добра ўзброены і добра ведаюць ваяўнічае штукарства, каторае таксама прыйшло сюды з Полаччыны. Жыхары маюць добрую арганізацыю. Нам, напрыклад, вядома, што яны бароняць свае гарады па чарзе, праз колькі месяцаў кожная група. Яны не толькі служаць у войсках гаспадара, але складаюць іх значную частку. Ім, як найбольш культурнаму элементу, даручаецца каманда над вайсковымі часткамі і абарона ад ворагаў меж гаспадарства. Яны кіруюць ад імя гаспадара як асобнымі гарадамі, так і цэлымі тэрыторыямі. Ім даручаюцца такія справы, дзе асабліва патрэбна адукацыя і спрыт, напрыклад, зносіны Вялікага княства з суседнімі гаспадарствамі. Адным словам, мы бачым, што беларуская частка жыхарства, як найбольш культурны элемент, займае пачэснае месца ў палітычных і грамадзянскіх справах гаспадарства. Ідзе даволі згоднае сужыццё паміж двума народамі. У Літоўска-Беларускім гаспадарстве кіруе гаспадар-літвін, а пануе культура і асвета беларуса. Есць нават такая думка, што гаспадары дзяржавы былі не прыроднымі літвінамі, а патомкамі тых князёў Полацкай Русі, каторыя раней, у канцы папярэдняга перыяду, уцякалі ў Літву ад бязладдзя, якое настала ў Полаччыне. Не ўваходзячы ў разгляд гэтай думкі, мы ўсё ж такі павінны адзначыць, што самі гаспадары Княства лічылі сябе літвінамі. Гэтае літвінскае самапачуццё не было, аднак жа, шавіністычным. Усе яны ведаюць беларускую мову, некаторя з іх прымаюць усходнюю хрысціянскую веру [2] і бяруць шлюбы з рускімі князёўнамі. Беларуская мова пануе не толькі ў палацы вялікага князя, але і сярод грамадзянства. Дзяржаўныя пастановы выдаюцца раней у дзвюх мовах, а потым амаль што выключна ў беларускай мове [3]. Гаспадар, лічачы сябе літвінам па нацыі, прызнаваў, што ён, як дзяржавец, ёсць прадстаўнік тэй і другой нацыі. У афіцыйных граматах і ў зносінах з суседнімі народамі ён называе сябе царом літвінаў і русінаў... Іначай і быць не магло, бо дзве трэція часткі яго зямель былі беларускія.

Нягледзячы на тое, што ў літвінаў была вера паганская, а ў беларусаў усходнеславянская [4], абедзве нацыі жылі ў згодзе. У дзяржаве пануе шырокая верацярплівасць, да якой бы веры хто ні належыў, ён служыць аднаму богу. Гедымін, адказваючы на адну з прапазіцый рымскага папы, у сваёй грамаце так піша аб гэтым: «Я казаў, што дазволю хрысціянам маліцца па звычаі іх веры, русінам — па іх звычаі, паляком — па іх. А мы, літвіны, будзем маліцца па нашым звычаі, бо ўсе мы паважаем аднаго бога». Трэба ўсё ж такі адзначыць, што літвіны пачалі браць у беларусаў іх культуру, мову і нават веру. Так, напрыклад, вядома, што ў канцы XIV стагоддзя больш як 50 літвінскіх мясцовых князёў трымаліся ўсходнехрысціянскай веры, бо яна мела ў сабе больш культурных элементаў, як паганская вера; аб гэтым жа сведчыць і польскі вядомы гісторык Ярашэвіч, каторы гаворыць, што калі б так справы йшлі праз некаторы час, то літвіны прынялі б беларускую мову, звычаі, заканадаўства і праваслаўную веру, нават іх народнасць змянілася б на беларускую.

Такая еднасць і згода паміж літоўскім і беларускім элементамі залежала ад таго, што Літоўска-Беларускае гаспадарства было збудавана больш шляхам згоды, чымся шляхам уціску і вайны. Полацкае гаспадарства ў канцы свайго існавання не магло даць сваім падданым грамадзянскага спакою. Мы ведаем, што ў грамадзянстве йшла класавая барацьба паміж лепшымі і подлымі людзьмі, паміж капіталам і працавітаю беднатою. Апроч таго, не было забяспечання ад хатняй калатні паміж асобнымі валасцямі і гарадамі гаспадарства. Усё гэтае прыводзіла да таго, што не існавала ў Полаччыне ніякіх перашкод да новага канцэнтрацыйнага руху, каторы ішоў з боку Літвы і яе гаспадарства. Асобныя воласці і гарады самахоць прызнавалі новую ўладу і глядзелі на яе, як на пажаданую ўладу. Як на выключэнне можна паказаць толькі на Смаленск з яго тэрыторыяй, каторы быў прылучан да Літоўска-Беларускага гаспадарства ваяўніцкім шляхам. Але і тут не было дружнага адпору. Яшчэ раней у Смаленску была грамадзянская партыя, каторая спачувала і цягнула да

Працяг. Пачатак у №№ 1—6

Літвы. Прадстаўнікі гэтай партыі адчынілі гарадскую браму літоўска-рускаму войску, і яно амаль што без перашкод увайшло і заняло Смаленск [5].

Наогул можна сказаць, што насельнікі былой Полацкай дзяржавы без пратэсту прынялі ўладу новага гаспадара, каторы прыносіў з сабою абарону ад моцных суседзяў і даваў спакой і адпачынак ад міжусобнай хатняй барацьбы.

Нам вядома, што ў гісторыі полацкага перыяду Беларусі вялікую вагу ў дзяржаўным і грамадзянскім жыцці краю мела веча. Яно было тым цэнтрам, дзе групаваліся эканамічныя і палітычныя інтарэсы воласці і гораду. Новая дзяржаўная ўлада, якая арганізавалася ў Полацкай Русі, не парушыла гэтай старажытнай, агульнарускай ідэі народапраўства. Наадварот, збіральнікі заходняй часткі рускага племя, літоўскія вялікія князі, асобнымі граматамі забяспечвалі правы заканадаўчага веча. У аснове ўсіх грамат літоўска-беларускіх гаспадароў, якія даваліся асобным горадам і валасцём, мы заўсёды можам знайсці такія цікавыя словы: «Гаспадар старыны не нарушае і навіны не ўводзе». Кожная воласць былой Полаччыны, уваходзячы ў склад новага гаспадарства, не адходзіла ад сваіх старых традыцый і зберагала свой твар. Ніякай ломкі хатніх звычаяў яна не пераживала.

Не тое мы бачым на ўсходзе, дзе навокала Масквы таксама пачалося збіранне і канцэнтрацыя ўсходняй, Маскоўскай Русі. Масква, збіраючы Русь, паступова і няўхільна касуе на сваіх абшарах старарускую ідэю народапраўства. Тут увесь час будзе расці моцнае самаўладства маскоўскіх гаспадароў, каторае потым дасць цвёрды грунт для безупыннай сваволі, напрыклад, Івана IV Грознага. Усякая асобная воласць, змушаная ўвайсці ў склад Маскоўскага гаспадарства, павінна будзе згубіць свой асабісты твар, свае старажытныя звычаі і традыцыі. Маскоўскае самаўладства сваёй цяжкаю рукою будзе касаваць тэрытарыяльную індывідуальнасць абласцей і будзе будаваць цэнтралістычную дзяржаву з абсалютнаю ўладаю манарха.

Не касуючы правоў веча і старарускай ідэі народапраўства, новая дзяржаўная літоўска-беларуская ўлада будзе прагнуцца скасаваць уладу асобных маскоўскіх [6] князёў. Праўда, мясцовыя князі не зганяюцца са сваіх пасадаў, але яны павінны былі прызнаваць як бы васальную залежнасць ад вялікага князя і гаспадара Літвы і Беларусі. Толькі ў тых валасцёх, дзе пасады заставаліся з якіх-небудзь прычын пустымі, гаспадар садзіў, як князёў, намеснікаў, сваіх родзічаў і сваякоў, каторыя таксама рабіліся васаламі вялікага князя [7].

АДНОСІНЫ ГАСПАДАРСТВА ДА НЯМЕЦКІХ ОРДЭНАЎ

Важнейшаю з надворных спраў Літоўска-Беларускага гаспадарства ў гэтыя часы было змаганне з нямецкімі ордэнамі. З IX, а асабліва з X стагоддзя пачынаецца вялікі рух германскага племя на ўсход.

Гэты рух найперш прыціснуў заходніх, балтыйскіх славянаў, каторыя раней жылі аж да самага Рэйну. Стагоддзе за стагоддзем ішоў гэты націск немцаў, і славяне адышлі аж за Эльбу (Лабу). На поўначы Заходняй Еўропы, на берагох Балтыйскага мора, націск быў мацнейшы. Немцы ўсе свае сілы скіравалі ў гэтым кірунку. Усё гэта зразумела само сабой, калі мы будзем мець на ўвазе значэнне і ў тыя і ў нашыя часы морскага берагу. Над Балтыйскім морам немцы асабліва напіралі на насельнікаў-тыбульцаў і, ідучы берагам на ўсход, спаткаліся, як мы ведаем, з палякамі і літвінамі. Літвіны пачалі бараніцца ад гэтага ўціску і, каб абарона была мацнейшай, пачалі арганізоўвацца. Так збудавалася дзяржава. Новай дзяржаве прыйшлося стрымліваць нямецкі націск. Пачалася цяжкая барацьба, каторая цягнулася праз стагоддзі. Ужо Міндоўгу трэба было бараніцца; ён бараніўся як мог — дзе мечам, дзе хітрасцю. Тое самае рабіў і Гедымін. Часта, не маючы магчымасці ўзяць верх над немцамі сілаю мяча, ён звяртаўся і да другіх спосабаў. Так, напрыклад, адзін раз ён прасіў у рымскага папы заступніцтва ад мечаносцаў. Папа, скарыстаўшы гэтае здарэнне, прапанаваў Гедыміну прыняць вадохрышча па заходнім абрадзе. Гедымін з пробы Міндоўга ўжо даведаўся, што каталіцтва не можа абараніць Літву і Беларусь ад крыжацкага ўціску. Наадварот, літоўская ўлада за ранейшы час магла пераканацца, што каталіцтва якраз было тэю сцежкаю, каторая ішлі палітычныя жаданні немцаў. Гедымін рэзка адхіліў прапазіцыю папы. Як кажа паданне, ён адказаў пасланцом папы так: «Калі я меў намеры калі-небудзь хрысціцца, то няхай мяне сам чорт хрысціць. Пэўна, я казаў, як і напісана ў грамаце, што буду паважаць папу, як бацьку, але я гэта казаў дзеля таго, што папа старэйшы ад мяне. Усіх старых я паважаю, як бацькоў, таварышаў люблю, як братоў, а малодшых ад мяне люблю, як сыноў. На самай справе я гаварыў, што дазволю хрысціянам маліцца па звычаі іх веры, русінам — па іх звычаі, паляком — па іх. Самі ж мы будзем маліцца богу па нашым звычаі, бо ўсе мы вызнаем аднаго бога». Барацьба з крыжакамі пры Гедыміне йшла з пераменным шчасцем. Некалькі раз літвінам удавалася браць над імі верх, але, наогул кажучы, Літва і Беларусь былі слабейшыя. Крыжакі мелі ўжо агнястрэльную зброю, якой яшчэ не ведалі ў Літоўска-Беларускім гаспадарстве. У барацьбе з крыжакамі загіб і сам Гедымін. Пад 1341 годам у адным з рускіх летапісаў гаворыцца, што Гедымін загінуў пры абароне адной літоўскай крэпасці, паранены крыжацкаю куляю.

У часы Альгерда і Кейстута амаль што не ўвесь цяжар барацьбы з крыжакамі ляжаў на Кейстуце, каторы быў кіраўніком заходняй палавіны гаспадарства. Барацьба йшла без перарыву. Немцы, замест вялікіх паходаў, робяць паходы дробныя, але затое частыя. Такія паходы яны завуць рэйзамі [8]. Кожны дзень, кожную гадзіну павінны літвіны чакаць неспадзяванага ворага. Якія-небудзь 100 ці 200 крыжакоў, а часам і менш, добра ўзброеныя, на добрых конях урываюцца раптам у сумежныя з ордэнскімі літоўскія землі, паляць гарады і вёскі, хаты і гумны, б'юць жыхароў альбо бяруць у палон. Разам з людзьмі гоняць яны ў свае межы быдла і цягнуць máемасць. Часта за адзін год было некалькі такіх рэйзаў. За 30 год князявання Альгерда, згодна з нямецкімі летапісамі, лічыцца каля сотні такіх паходаў з боку немцаў і трыццаці з боку Літоўска-Беларускага гаспадарства. (...)

Каб спыніць ворага і не даць яму магчымасці ўвайсці на сваю тэрыторыю, і немцы, і Літва на межах муруюць моцныя замкі і руйнуюць пабудаваныя замкі адны другіх. Наймацнейшым з літоўскіх замкаў таго часу быў замак у Коўне [9]. (...)

Не заўсёды... добра і паспешна йшла барацьба. Калі распачыналіся хатнія спрэчкі, Літоўска-Беларускае гаспадарства не толькі не рабіла наступаў на крыжакоў, але само замешвала іх у свае дамовыя справы. Так рабілі, напрыклад, Кейстут і Ягайла, каторыя звярталіся да крыжакоў, шукаючы іх дапамогі ў барацьбе за вялікакняскі пасад. Крыжакі ахвотна адклікаліся на гэтыя прызывы і ўмешваліся ў жыццё Літвы, добра разумеючы, што гэтым яны аслабляюць моц шкадлівага для іх суседняга гаспадарства. Але спрэчкі праходзілі, Літва і Беларусь зноў браліся за зброю, каб змагацца са сваім упартым ворагам.

Змаганне з немцамі было, паміж іншым, аднэй з прычын дынастычнага злучэння Літоўска-Беларускага гаспадарства з Каралеўствам Польскім у 1386 годзе. І трэба згадзіцца, што гэтае злучэнне было надта шкадлівым для нямецкіх ордэнаў. У 1410 годзе літоўска-беларускі гаспадар Вітаўт разам з польскім каралём Ягайлам даў немцам рашучую бітву пад Танэнбергам і Грунвальдам у Прусіі. Ордэнскае войска складалася з 80 тысяч, войскі саюзнікаў — з 150 тысяч. Лічэбная перавага... была на старане Літоўска-Беларускага войска [10]. Затое крыжацкае войска было лепш узброена і арганізавана; яно мела нават артылерыю, якой не было ў літоўцаў, беларусаў і палякаў [11]. (...) Апроч Вітаўта, Ягайлы і магістра Тэўтонскага ордэну, тут быў добра вядомы чэшскі рыцар Жыжка, будучы нацыянальны чэшскі правадыр і дзеяч часу гусіцкіх войнаў. Бітва пачалася раніцою 15 ліпеня. Літоўска-беларускія войскі былі пастаўлены на правым фланзе. Доўга біліся, і ніяк не мог выявіцца рэзультат бою. Толькі пад вечар, дзякуючы моцнаму націску беларускіх смаленскіх палкоў [12], немцы пачалі бегчы і масамі кідаць поле бою. Страты з нямецкага боку былі не малыя: рыцараў было забіта каля 30 тысяч, са зброяю ў руках загінуў і сам магістр ордэну. Само сабою разумеецца, што радасць ад перамогі была вялікая. З гэтай бітвы пачынаецца відны пералом у бесперарыўным змаганні Літоўска-Беларускага гаспадарства з нямецкімі ордэнамі. Сілы немцаў пачынаюць усё слабець. У 1466 годзе нават канчаецца зусім незалежнае існаванне Тэўтонскага ордэну, каторы пачаў раскідацца. Вялікі магістр ордэну, пабачыўшы, што няма магчымасці далей існаваць, павінен быў прызнаць сябе васалам польскага караля і літоўска-беларускага гаспадара Казіміра IV.

ВУНІЯ ЛІТОЎСКА-БЕЛАРУСКАГА ГАСПАДАРСТВА З ПОЛЬШЧАЙ 1386 Г.

Па смерці Альгерда ў Літоўска-Беларускім гаспадарстве пачынаецца бязладдзе. У свае часы Альгерд быў жанаты

два разы: першы з Марыяй Віцебскай, другі раз — з Ульянай Цверскай. Ад тэй і другой жонкі засталіся сыны. Паміж дзвюма галінамі Альгердавага роду яшчэ пры жыцці Альгерда йшло суперніцтва. Пасад вялікага князя Літвы і Беларусі заняў Ягайла, старэйшы з сыноў Альгерда ад другой яго жонкі Ульяны Цверскай. Тым, што Ягайла, не будучы самым старэйшым, заняў пасад гаспадара, былі незадаволены яго старэйшыя браты, сыны першай жонкі Альгерда — Марыі Віцебскай [13]. Яны, не хочучы паддацца Ягайле, звярнуліся па дапамогу да Масквы, дзе ў гэты час быў вялікім князем вядомы нам Дзмітрый Данскі.

Што датычыць да Кейстута, малодшага Альгердавага брата, то ён, з аднаго боку, шануючы ідэю еднасці гаспадарства, і, з другога боку, лічачы патрэбным падтрымліваць ідэю законнасці волі памёршага вялікага князя Альгерда, каторы назначыў сваім наступнікам Ягайлу, не выходзіў з паслушэнства свайму пляменніку, каторага прызнаў фармальна вялікім князем. Каб падтрымаць яго парушаны аўтарытэт

і даць другім князём прыклад паслушэнства вялікаму князю, ён нават паложаны час ездзіў у Вільню [14] да Ягайлы на пасяджэнне вялікакняскай рады [15], як і раней ездзіў у раду да свайго старэйшага брата Альгерда.

Аднак жа гэтыя добрыя адносіны паміж Ягайлам і Кейстутам хутка перарваліся з віны Ягайлы. Ягайла вельмі баяўся аўтарытэту і папулярнасці свайго дзядзькі і, скарыстаўшы дробнае здарэнне [16], пачаў з ім барацьбу. Два разы звяртаўся да крыжакоў Ягайла, каб з іх дапамогаю перамагчы Кейстута і зрабіць яго бяспечным для сябе. Узяўся за зброю і Кейстут. Нягледзячы на дапамогу крыжакоў, Ягайла быў разбіты [17]. Каб забяспечыць сябе ад суперніцтва Кейстута, ён пайшоў на вераломную хітрасць. Адзін раз ён запрасіў Кейстута з сынам яго Вітаўтам у свой абоз [18] быццам для таго, каб абгаварыць з ім умовы для паляпшэння далейшых адносін. Кейстут з сынам не зразумелі сапраўднай падкладкі гэтага запрашэння і паехалі. Як толькі яны з'явіліся на месца спаткання, без войска і без зброі, неспадзявана іх схапілі, закавалі ў моцныя ланцугі, патаемна завезлі ў Крэва (Ашмянскі павет у Віленшчыне) і там пасадзілі ў замчышчы ў турму. Сюды Ягайла падаслаў людзей [19], каторыя задушылі вельмі папулярнага старога Кейстута, а верную жонку яго Біруту ўтапілі ў замкавым рове. Вітаўту неяк пашанцавала ўцячы з турмы. Паданне кажа, што ён уцёк з палону, апрануўшыся ў жаноцкую вопратку, каторую даставіла яму яго жонка Ганна [20].

Такім спосабам, мы бачым, што Ягайла меў многа ворагаў сярод сваіх родных і стрыечных братоў. Апроч таго, імя яго было вельмі непапулярна ў шырокіх масах. Зразумела, што яму неадкладна трэба было шукаць апоры для сваёй улады дзесь за межамі Літоўска-Беларускага гаспадарства.

У гэты самы час... у суседняй Польшчы ў 1382 годзе памёр... кароль Людовік, каторы адначасна быў і венгерскім каралём. Мужчын каралеўскага роду не засталося, спадчыну прынялі яго жонка Кацярына і дзве дачкі — Марыля і Ядвіга. Фамілія караля хацела пасадзіць на пасад старэйшую дачку Марылю, каторая ў гэты час была ўжо жонкаю Зыгмунта [21], маркграфа брандэнбургскага. Людовік яшчэ пры жыцці пажаніў іх і па згодзе з польскімі магнатамі аставіў у спадчыну Зыгмунту польскі каралеўскі пасад. Звязак польскага пасаду з моцным Брандэнбургам ужо даўно не падабаўся польскаму вышэйшаму панству, бо дзякуючы гэтаму звязку кароль мог аперціся ў асобных выпадках на Брандэнбург і трымаць сябе даволі незалежна ад паноў, каторыя хацелі ўзяць яго ў свае рукі. Зразумела, што і цяпер паны не згаджаліся абраць на пасад Зыгмунта, які быў небяспечны для іх з гэтага боку. Дзеля ўсяго гэтага ўжо два гады цягнулася бескаралеўе, каторае ўносіла бязладдзе ў жыццё Польскага гаспадарства. Трэба было выйсці з такога палажэння. І вось у 1384 годзе паміж фаміліяй памёршага караля і польскімі панамі была зроблена згода. Маці-каралева пасля доўгіх перагавораў згадзілася аддаць на польскі пасад малодшую дачку Ядвігу, 13 год. Было зразумела, што Ядвіга не магла сама кіраваць гаспадарствам, тым больш, што Польшчы, як і Літве, цяжка прыходзілася ад крыжакоў. Трэба было знайсці такога чалавека для Ядвігі, каторы быў бы не столькі прыемны для яе, колькі карысным для Польшчы. Ягайла, літоўска-беларускі гаспадар, якраз надаваўся для гэтай мэты: перш ад усяго, Літве пагражаў эканамічна і палітычна той самы вораг, што і Польшчы, апроч таго, хатнія спрэчкі ў Літве за ўладу рабілі Ягайлу больш згаворлівым з польскімі панамі [22]. Апроч гэтых думак эканамічнага і надворнапалітычнага кірунку, польскія паны трымаліся і сваіх класавых інтарэсаў. Яны былі перакананы ў тым, што Ягайла ў падзяку ім за сваё абранне пашырыць правы і прывілеі. Духавенства таксама спадзявалася, што шлюб Ядвігі з Ягайлам пашырыць і рэлігійна-палітычны ўплыў на Літву і павялічыць іх даходы новаю дзесяцінаю, якую яны атрымаюць з хрышчонай Літвы. І тыя і другія не абмыліліся.

Ягайла ў 1385 годзе атрымаў з Польшчы прапазіцыю наконт шлюбу з Ядвігаю і злучэння з Польшчаю. З якою ахвотаю ён адгукнуўся на гэтую прапазіцыю, відаць з тых абавязкаў, якія налажыў ён на сябе і сваё гаспадарства. На нарадзе польскіх паслоў у Крэве ён абавязаўся прыняць каталіцкую веру з сваімі братамі, сваякамі, народам літоўскім, знатным і простым, даваць грошы свайго гаспадарства на патрэбы Польшчы, дапамагчы Польшчы атрымаць паўднёвыя адабраныя тэрыторыі, заплаціць адступнага 200.000 флёрынаў былому жаніху Ядвігі прынцу Вільгельму Аўстрыйскаму і на вечны час прылучыць Літоўска-Беларускае гаспадарства да Кароны Польскай. Польшча за ўсё гэта абяцала Літве і Беларусі дапамогу ў барацьбе з крыжакамі.

На з'ездзе ў Ваўкавыску ў 1386 годзе былі ўхвалены такія ўмовы злучэння Польшчы з Літоўска-Беларускім гаспадарствам: кароль і вялікі князь у злучаных дзяржавах адзін; спачатку гэтая асоба ёсць Ягайла, потым — просты патомак яго і Ядвігі; надворныя зносіны ў справах, датычных абедзвюх дзяржаў, а таксама і абарона тэрыторыі робяцца супольна. Хатняе кіраванне ў кожным гаспадарстве асобнае: і ў Літоўска-Беларускай дзяржаве і ў Польшчы — асобныя войскі, асобны скарб і асобныя ўлады. Апроч таго, як ужо было сказана вышэй, Ягайла меў абавязак прыняць каталіцтва і шырыць яго паміж літвінаў. Беларускаму насяленню была застаўлена свабода належаць да ўсходнехрысціянскай веры.

Так адбылася першая вунія Літоўска-Беларускай дзяржавы з Польшчай. Гэтая вунія залежала не толькі ад надворных прычын, але і ад прычын хатніх. Злучэннем з Польшчай літоўска-беларускі ўрад жадаў не толькі здабыць дапамогу ў барацьбе з суседзямі, але і ўзмацніць палажэнне вялікакняскай улады ў маладым гаспадарстве.

Вунія 1386 году разглядалася да нашага часу толькі як вунія дынастычна-персанальная. Лічылася, што два гаспадарствы злучыліся адно з другім толькі праз асобу агульнага для абедзвюх дзяржаў манарха і яго наступнікаў-патомкаў; лічылася, што вунія не мяняла юрыдычнага грунту другіх бакоў дзяржаўнага і грамадзянскага жыцця. Такі погляд нельга прызнаць правільным. Трэба адзначыць, што юрыдычна, паводле тэксту дагавору, вунія 1386 году была больш, чым дынастычна-персанальнаю. Яна была як бы інкарпарацыяй Літоўска-Беларускай дзяржавы ў Каралеўства Польскае. Юрыдычна літоўска-беларускія землі на вечныя часы прылучаліся да Кароны Польскай. Паводле тэксту дагавору, з 1386 году як бы зусім прыпынялася незалежнае існаванне Вялікага княства, і яно рабілася разам з Польшчаю адным палітычным, дзяржаўным арганізмам. Недарма пасля вуніі ўсе літоўска-беларускія князі павінны былі прыняць прысягу на вернасць Кароне Польскай, і літоўска-беларускія баярыкаталікі атрымалі такія самыя правы, якія былі ў польскіх паноў.

Так стаяла справа з юрыдычнага боку. Але фактычна далёка не заўсёды бывае тое, што пішацца ў юрыдычных актах. Так было і тут. Вунія была зроблена больш на паперы, чым у жыцці. Праўда, ужо адчыняецца шлях для палітычнага і рэлігійнага каталіцкага ўплыву, але фундаментальнай змены жыцця ўраз не будзе. Літва і Беларусь доўга яшчэ, аж да самай другой паловы XVI стагоддзя, будуць жыць

сваім асабістым жыццём, баронячыся ад пачаўшагася ўплыву. Кірунак жыцця пасля вуніі 1386 году застаецца той самы, які быў і да гэтага году. Перыяд Літоўска-Беларускай дзяржавы ў гісторыі Беларусі не перарываецца.

Калі мы паглядзім на далейшае дзяржаўна-палітычнае жыццё Літвы і Беларусі, то пабачым, што самастойнасць Літоўска-Беларускага гаспадарства пасля 1386 году фактычна не была згублена. Па прыклад далёка ісці не трэба, даволі пазнаёміцца па якім-колечы падручніку з кіраваннем Вітаўта, каторы быў асобным вялікім князем Літвы і Беларусі (1392—1430), нягледзячы на ўмовы вуніі. Кіраваў ён зусім незалежна ад Ягайлы, караля польскага. І толькі інтрыгі з боку Польшчы не далі яму магчымасці каранавацца ці зрабіцца літоўска-беларускім каралём. Нямецкі імператар паслаў карону Вітаўту, але гэтая карона да яго не дайшла. Летапіс так апісвае гэтую падзею: «І ляхове, ня жычыўшы кароны Літве, карону ад іх (паслоў імператара) тую адабраўшы і рассекшы яе на полы, прыложылі ко коруне біскупа кракаўскага, каторая і цяпер пры замку ў касцёле св. Станіслава ёсць».

І ў далейшыя часы мы бачым, што Літва і Беларусь маюць часта сваіх асобных вялікіх князёў, што ідзе супроць вуніі 1386 году. Ніжэйпаданая сінхраністычная табліца дасць патрэбныя для нас прыклады.

Літва і Беларусь	Польшча
Вітаўт 1392—1430 Свідрыгайла [23] 1430—1432	Ягайла — Уладзіслаў II 1386—1434
Жыгімонт Кейстутавіч [24] 1432—1440	Уладзіслаў III 1434—1444
Казімір I 1440—1492	Казімір IV 1447—1492
Аляксандр 1492—1506	Ян Альбрэхт 1492—1501 Аляксандр 1501—1506
Жыгімонт II Стары 1506—1548	Зыгмунт I Стары 1506—1548
Жыгімонт III Аўгуст 1548—1572	Зыгмунт II Аўгуст 1548—1572

Як можна пабачыць з гэтай табліцы, толькі паступова і з цягам часу Літоўска-Беларускае Вялікае княства губіць сваіх асобных гаспадароў. Гэта паказвае, што вунія 1386 году толькі адчыніла шырэй дарогу для польскага палітычнага, культурнага і сацыяльнага ўплыву. Потым трэба адзначыць, што тыя асобы, каторыя былі літоўска-беларускімі гаспадарамі і разам з тым польскімі каралямі ў першыя часы пасля ўтварэння вуніі, лічылі сябе больш літоўска-беларускімі гаспадарамі, чым польскімі каралямі. Інтарэсы і жыццё Літвы і Беларусі іх больш цікавілі, чым справы і жыццё Польшчы. Гэты факт робіцца тым больш зразумелым, калі прыняць пад увагу палажэнне караля ў Польшчы, дзе паны і ўзмацняючаяся шляхта ўжо пачалі забіраць і потым забралі караля ў свае рукі. Літоўска-беларускі настрой польскіх каралёў ў першыя часы пасля вуніі можна бачыць, напрыклад, у такім юрыдычным дакуменце, як Земскія прывілеі Казіміра I (у Польшчы — Казіміра IV), аб каторых будзе слова далей. Толькі пад канец перыяду, калі пад польскім уплывам і ўплывам другіх прычын умовы жыцця змяніліся, агульныя дзяржаўцы Літвы, Беларусі і Польшчы пачалі ставіць інтарэсы Польшчы вышэй інтарэсаў Літвы і Беларусі, а сябе лічыць больш каралямі польскімі, чым гаспадарамі літоўска-беларускімі. Такім гаспадаром быў, напрыклад, Жыгімонт III (у Польшчы Зыгмунт II) Аўгуст, апошні прадстаўнік выміраўшага Ягайлавага дому.

Што жыццё Літоўска-Беларускага гаспадарства пасля 1386 году ў асновах сваіх не перамянілася, відаць яшчэ з таго, што акты вуніі паміж дзяржавамі ўсё пішуцца і пішуцца ў далейшыя гады. Навошта гэта было б рабіць, калі б усё было зроблена раней. Паўтарэнне актаў голасна гаворыць аб тым, што яны не маюць моцы ў жыцці. Калі б акт 1386 году быў рэальным, моцным, то само сабою зразумела, што не прыйшлося б пытанне аб вуніі падымаць на далейшых з'ездах больш чым дзесяць раз. З гістарычных дакументаў мы ведаем, што гэтае пытанне падымалася зноў і зноў у наступныя гады: 1401, 1413, 1447, 1451, 1453, 1501, 1503, 1564, 1566 і 1567. Як мы бачым з гэтага пералічэння гадоў, пытанне аб вуніі асабліва падкрэсліваецца і вымагаецца жыццём у 60-я гады XVI стагоддзя. Паспелі якіясь прычыны, каторыя патрабавалі поўнай, рэальнай вуніі. Галоўнейшай з гэтых прычын быў той польскі сацыяльны і палітычны ўплыў, якому былі адчынены дзверы на Літву і Беларусь актам 1386 году. Апроч таго, на вунію з Польшчай гоніць Літву і Беларусь шчэ адна важная прычына, гэта — імперыялістычны націск з усходу, з боку Маскоўскага гаспадарства. Гэты націск робіцца асабліва моцным якраз у 60-я гады XVI стагоддзя, калі ў Маскве развіваецца тэрор апрычніны. Ратуючыся ад тэрору Івана IV Грознага, літоўска-беларускае панства[26] ўрэшце падпісала апошні раз вунію з Польшчай. Гэтая вунія скончыла незалежнае самабытнае існаванне Літоўска-Беларускага гаспадарства, каторае ўвайшло ў склад Рэчы Паспалітай.

Працяг будзе

---

[1] Памылка друку. Трэба чытаць «заходніх зямель усходніх славян».

[2] З сыноў Гедыміна праваслаўе прынялі Яўнут (Іван), Альгерд (Аляксей), Нарымунт (Глеб), Карыят (Мікалай), Любарт (Дзмітрый). Хрысціянкамі сталі ўсе дочкі, аддадзеныя за польскіх і рускіх князёў. Паганцамі засталіся толькі Манвід і Кейстут.

[3] Акты Вялікага княства пісаліся ў дзвюх мовах: старабеларускай і лацінскай (пасланні каралям, імператарам і г. д.).

[4] Памылка друку. Трэба чытаць «усходнехрысціянская».

[5] У 1404 годзе.

[6] Памылка друку. Замест «маскоўскіх» трэба чытаць «мясцовых».

[7] Сеўшы князямі ў беларускіх гарадах, літоўскія князі будуць бараніць мясцовых традыцый і звычаяў. Такімі былі, напрыклад, князь мсціслаўскі Лугвен-Сямён і яго нашчадкі, праўнук Гедыміна, сын кіеўскага князя і сам князь Аляксандр (Алелька) Уладзіміравіч, які заснаваў слуцка-капыльскую дынастыю Алелькавічаў.

[8] Ад нямецкага die Reise — паездка, падарожжа, вылазка.

[9] Цяпер Каўнас.

[10] Розныя гісторыкі называюць розныя лічбы.

[11] Тут аўтар недакладны. Артылерыя была. Вітаўт, калі браў Смаленск, прывёз туды гарматы.

[12] Іншы раз можна сустрэць ледзь не сцверджанне, што смаленцы прыйшлі на Грунвальдскае поле добраахвотна. Гэта не так. Паколькі Смаленская зямля была пад рукою Вітаўта, смаленскія баяры-шляхта мусілі прыйсці пад Грунвальд.

[13] Апазіцыю Ягайлу ўзначаліў Андрэй Альгердавіч Полацкі (пра яго чытайце: «Крыніца», 1988, № 10).

[14] Кейстут жыў у другой сталіцы — Троках.

[15] Пра вялікакняскую раду (яна называлася яшчэ паны рада) чытайце ў наступным нумары.

[16] Ягайла аддаў сваю сястру за свайго слугу Вайдылу і паставіў яго кашталянтам (камендантам) замка ў Лідзе, што выклікала незадавальненне ў Кейстута.

[17] У 1381 годзе.

[18] Абоз — вайсковы лагер.

[19] Братоў Жыбяндзяеў — прафесійных катаў, забойцаў.

[20] Княгіня Ганна прыйшла да Вітаўта са служанкаю. У вопратцы служанкі Вітаўт разам з Ганнаю выйшаў з замка.

[21] Зыгмунт — гэта польскае напісанне імя Сігізмунд.

[22] Не выключана, што на гэты шлюб Ягайлу падбівала і яго маці Ульяна Цверская. Успомнім, што Цвер была праціўніцай Масквы, што Іван Каліта атрымаў ярлык на вялікае княжэнне пасля таго, як падавіў антытатарскае паўстанне ў Цверы. Успомнім, што ў 1380 г. Ягайла вёў сваё войска на дапамогу хану Мамаю, але спыніўся за адзін дзённы пераход ад Кулікова поля. Многія лічаць, што ён пабаяўся дапамагчы Мамаю толькі таму, што на Куліковым полі былі яго браты — Андрэй Полацкі і Дзмітрый Альгердавіч.

[23] Свідрыгайла (Баляслаў)— брат Ягайлы.

[24] У. Ігнатоўскі піша «Зыгмунт», але на Беларусі імя Сігізмунд вымаўлялі і пісалі Жыгімонт. Гэтае напісанне прынята ўсімі сучаснымі беларускімі гісторыкамі.

[25] Слова «панства» мела два значэнні: 1) паны, сукупнасць паноў; 2) дзяржава.

Падрыхтоўка тэксту і каментарыі Анатоля СІДАРЭВІЧА.

ПАГАВОРЫМ... ПРА ДАРОЖНУЮ СУМКУ

Вось і лета доўгачаканае прыйшло. Але я прапаную вам сёння не абмяркоўваць накірункі летняй моды-90. Пагаворым лепш... пра ёмістасць нашых дарожных сумак і валіз. Напэўна, і вы знаёмыя з такой сітуацыяй: збіраецеся да ад'езду ў лагер, на мора, на лецішча, у вёску, а валіза ледзь-ледзь (калі паскачаш на ёй) закрываецца. А так хацелася б узяць яшчэ вунь тое «у палосачку» і вось гэтае «міні», і...

Гартаючы самыя розныя часопісы, я зразумела: валіза можа быць паўпустая, а строі кожны дзень — новыя. Калі толькі гардэроб будзе рацыянальны, інакш кажучы, будуць у ім адно патрэбныя рэчы.

Паспрабую гэтым разам укласці сумку па-новаму, улічваючы рэкамендацыі мадэльераў: меней строяў, болей дапаўненняў і аздабленняў.

Пачну, бадай, са штаноў. Яны ў адпачынку незаменныя. І зручныя, і прыгожыя — асабліва, калі ногі доўгія. У модзе зноў-такі і класічныя прамыя, і бермуды, і спадніцы-штаны. Пры любой камплекцыі штаны добра глядзяцца, хіба што поўным варта падумаць пра падоўжаны прасторны жакет. Што датычыць мяне, я выбіраю белыя бермуды (са складкамі ля пояса, бакавымі кішэнямі, прошваю ўнізе) і шорты, незаменныя ў вандроўках...

Напэўна, варта ўзяць з сабою майкутоп на танюткіх шлейках, аздобленую карункамі. Белая блуза кашулевага крою, батыставая, аздобленая прошваю з вытанчанай мярэжкаю, будзе добра глядзецца летнім вечарам. І яшчэ, не забыцца б. Нядаўна па рэкамендацыі вільнюскага часопіса мод «Банга» ў маім гардэробе з'явілася кашуля, прадстаўніца так званай «хуткай адзежы». Яркая, доўгая, з закругленнымі разрэзамі на баках, яна будзе вельмі зручная на пляжы. Ды і ў іншы час дня такая кашуля будзе пасаваць да белых штаноў, падперазаных шырокім рамянём.

Не абысціся ў летнім міні-гардэробе, ведама ж, без доўгага пінжака свабоднай формы — ён будзе пасаваць да тых самых бермудаў, шортаў, спадніцы. Ну і прыгожая сукеначка з аголенымі плячыма, без шлеек, таксама прыдасца летнім днём.

І, нарэшце, спадніца. Дзякуючы ёй можна мяняць стыль строяў, характар, па-іншаму расстаўляць колеравыя акцэнты. У маім гардэробе ёсць яркая квяцістая шмат'ярусная спадніца. Думаю, і ў вашым гардэробе знойдзецца што-небудзь падобнае. Ну, а калі не, «Бурда модэн» прапануе пашыць яе за адзін дзень. З запахам, са штучнага крэпдэшыну, з зашпількай на два гузікі, з дробнымі зборкамі, якія «разбягаюцца» ад пояса...

Падсумуем. Сукня-сарафан, спадніца, штаны, шорты, блузкі, жакет. І не забудзьцеся, памятаючы пра зменлівасць нават летняга надвор'я, захапіць з сабою якую-небудзь цёплую рэч. Не забудзьцеся і на купальнікі, капялюшыкі, хустачкі...

Здаецца, пераважна ўсё. Прызнацца, атрымалася не так ужо і мала, але ўсё ж меней, чым летась. Можа, у вас атрымаецца лепей?.. Засталося пакласці ў дарожную сумку тое, што дапаможа кожны дзень выглядаць арыгінальна. Гэта — дапаўненні. Зрэшты, з іх, напэўна, трэба было пачынаць — мне здаецца, улетку яны адыгрываюць у строях галоўную ролю. Увогуле я ў любую пару люблю аздабленні. Але калі ўзімку і ўвосень прыходзіцца быць стрыманай у іх выбары, дык улетку можна дазволіць сабе эксперыментаваць кожнага дня — і ў колеры, і ў камплексе. Пацеркі, кліпсы, завушніцы, бранзалеты, ланцужкі, абручы, брошкі з самых розных матэрыялаў, з самымі рознымі ўстаўкамі дапоўняць любыя строі. Дарэчы, можна і самім паспрабаваць прыдумаць тыпова летняе аздабленне — напрыклад, пояс з... яркіх корпусаў фламастэраў. На тоўсты шнур, ад якога спускаюцца вяровачкі з вузельчыкамі, падвешваюцца на рознай даўжыні вось гэтыя карпусы. Праўда, такое дапаўненне могуць дазволіць толькі тыя, хто заўсёды ў добрай спартыўнай форме. Гэта датычыць, дарэчы, усіх экстравагантных строяў...

У маскоўскім часопісе мод я прачытала: «Вырашаць, як быць моднай, становіцца ўсё цяжэй: залішне шмат прапаноў. Пастарайцеся навучыцца адмаўляцца ад крайнасцей. Больш увагі стылю, дапаўненням, манеры насіць рэчы. І не забывайцеся, што мода адрознівае сітуацыі: для яе па-ранейшаму важна — што, дзе, калі... Запомнім гэтым парады, задумаемся над імі, асабліва над апошняю: для кожнага сезона, месяца, часу дня ёсць свой колер, сілуэт, свае дапаўненні, свой матэрыял. Дарэчы, пра тканіны, з якіх лепей за ўсё шыць летнія строі. Гэта бавоўна і лён, натуральны шоўк, вельмі гігіенічны, у ім не будзе горача, ён лёгка збіраецца ў зборкі-складкі. Гэта крэпдэшын, сацін, плашчоўка. Словам, выкарыстаць можна ўсё, што пад рукою...

Дагэтуль мы гаварылі толькі пра тое, як рацыянальна падабраць для вакацый ці адпачынку летнія строі. Вядома, гэта вельмі важна. Але не менш важна, як выкарыстаць лета, каб палепшыць здароўе, папрыгажэць. Больш рухайцеся, хадзіце басанож па траве, па гарачым пяску, гальцы на пляжы, хадзіце па калена ў вадзе (адмысловая гімнастыка для ног), гуляйце ў валейбол, у бадмінтон — усё гэта зусім няцяжка і дужа карысна. Плаваць, напэўна, нікога ўгаворваць не трэба — што можа быць больш прыемнага! А купанне, выяўляецца, гэта яшчэ і гладкая скура, стройная гнуткая фігура... І, вядома ж, варта ўлетку адпачыць ад салодкага, тлустага, мучнога, мяса — іх добра заменяць зеляніна, свежая садавіна і гародніна, ягады...

Ах, як хочацца ўлетку загарэць! І каб хутчэй, і каб падаўжэй... І так не хочацца слухаць парады дактароў і касметолагаў. І ўсё ж я прапаную прыслухацца хоць бы да некаторых з іх. Па-першае, дамовімся захоўваць пачуццё меры, пачнём загараць паступова, у руху, у шыракаполым капелюшы. Па-другое, не будзем бегчы з пляжа адразу ж пад душ — касметычнае малачко, вяршкі будуць карыснейшыя, яны дапамогуць пазбегчы перасыхання скуры. Па-трэцяе, перад выхадам на пляж няварта карыстацца парфумаю, дэзадарантамі. І нарэшце, трэба зусім адмовіцца ад дэкаратыўнай касметыкі. Сонца растопіць яе, выгляд будзе непрыемны, скура стане нездаровая. Так што лепш даць скуры ўлетку «падыхаць», адпачыць. А можа, вы знойдзеце сілы і зусім адмовіцца ад касметыкі. І не толькі на пляжы...

Забягаючы трошкі наперад, перакажу тым, хто захоча захаваць загар, такі рэцэпт. 1—2 разы на тыдзень трэба прымаць ванну з аўсяным вотруб'ем (яго можна замяніць «Геркулесам», размолатым на кавамолцы): адну шклянку такога вотруб'я пакладзіце ў торбачку з марлі і апусціце ў ваду, аднае торбачкі хапае на 2—3 разы. Такая ванна здымае раздражненне скуры, сухасць і лушчэнне.

Напярэдадні лета я зноў пабывала ў знаёмай вам па рубрыцы «Мода» майстрыні цырульнае справы Маі Верцягел з мінскага салона «Александрына». Мая таксама вырашыла даць нам некалькі летніх парад. Выяўляецца, сонца, вецер, салёная марская вада зусім не на карысць валасам. Таму купацца трэба з пакрытай галавою, нельга забывацца, выходзячы на сонца, надзець галаўны ўбор. Ні ў якім разе, як бы ні хацелася захаваць прычоску, нельга карыстацца лакам для валасоў: у спякоту ён выдзяляе рэчывы, якія блага ўплываюць на валасы. Трэба адмовіцца ад хімічнай завіўкі, афарбоўкі валасоў. Калі вы вельмі любіце купанне і носіце стрыжку, зрабіце яе карацейшай, і, наадварот, калі ў вас доўгія валасы, захавайце іх. Гэта дапаможа зберагчы здаровыя валасы ад уздзеяння салёнай вады і сонца. Так, няварта сушыць мокрыя валасы на сонцы, сцягваць у пучок гумкаю. Няхай гэта марудней, але сушыць валасы трэба распушчанымі пад хусткаю ці шалікам.

Мая прасіла не забывацца на зялёную касметыку. Маладыя лісты крапівы, бярозы, парэчак, кветкі рамонкаў, ліпы, шалфей — гэта сапраўдная скарбонка вітамінаў для валасоў! Дарэчы, гэтыя ж травы, кветкі можна нарыхтаваць і на зіму (паглядзіце, як прыдасца!), збіраючы ў чыстых, аддаленых ад дарог мясцінах, правільна высушваючы.

І яшчэ адна рэкамендацыя Маі Верцягел: «абгортваць» валасы на пляжы. Дома гэта не заўсёды зручна, а на пляжы цяжка разабрацца, мокрыя ў цябе валасы ці тлустыя. А карысць ад такіх працэдур несумненная. А састаў «абгортванняў» розны: напрыклад, сумесь алею (аліўкавага, сланечнікавага, любога) і спірту ці сухой гарчыцы з размочаным чорным хлебам. Зверху такой «маскі» — шапачка, цэлафанавы пакет, ручнік. Праз хвілін дваццаць трэба памыць галаву звычайнай вадою. Не забудзьцеся, што ўсё гэта можна рабіць толькі пры чыстых валасах...

Вось, бадай, і ўсё, пра што хацелася б сёння пагаварыць. Такім чынам, у дарожнай сумцы ў вас — не толькі летнія строі, але і мноства карысных парад. Спрабуйце, выяўляйце сябе, фантазіруйце. І памятайце: лета — наш саюзнік.

КАСЯ

У РЫТМАХ СПОРТУ І... МОДЫ

**Мякка прыстаюць да цела,
не скоўваюць рухаў,
падкрэсліваюць грацыёзнасць
і стройнасць фігуры
новыя камплекты для спорту і адпачынку
ВІЦЕБСКАГА ПАНЧОШНА-ТРЫКАТАЖНАГА
КАМБІНАТУ ІМЯ КІМ.**

У ТАКІМ КАМПЛЕКЦЕ ЗАЎЖДЫ ПЕРАМАГАЕ ДОБРЫ НАСТРОЙ.

**Па заказу Беларускага Цэнтра моды.
Рэкламная фірма БЕЛАР.**

КАЛІ НА ВАС ТАКІ ПРЫГОЖЫ ПЛАШЧ —

**вы элегантныя і стройныя!
Адмысловыя модныя плашчы
і цудоўны настрой
дорыць жанчынам
БАБРУЙСКАЯ ШВЕЙНАЯ ФАБРЫКА
ІМЯ ДЗЯРЖЫНСКАГА.**

**Па заказу Беларускага Цэнтра моды.
Рэкламная фірма БЕЛАР.**

25 к. «Крыніца», 1990, № 7, 1—44. Індэкс 74824

Фота Алены БЯЛЯЕВАЙ